ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

КАРОТКІ НАРЫС (У 5-ЦІ ЧАСТКАХ)

ЧАСТКА IV



ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ
УПРАЎЛЕННЕ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ МІНІСТЭРСТВА
АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Г І С Т О Р Ы Я Б Е Л А Р У С І

Кароткі нарыс

(у 5-ці частках)

Вучэбны дапаможнік для вайскоўцаў
Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Частка ІУ

Мінск 1993

Пад рэдакцыяй:

Члена-карэспандэнта Акадэміі навук

Беларусі М.П.Касцюка,

Доктара гістарычных навук

М.В.Біча.

У падрыхтоўцы вучэбнага дапаможніка
прымалі ўдзел:
палкоўнікі Нікулін Я.І., Скомокі М.І.,
Хамянкоў У.К., Шошын У.М.

ТЭМА 17.БЕЛАРУСЬ НАПЯРЭДАДНІ І У ЧАС КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Вучэбныя пытанні: Лютаўская рэвалюцыя не вырашыла сваіх задач. Неабходнасць новай рэвалюцыі. Пераход улады да Саветаў. Мерапрыемствы Савецкай улады. Нацыянальны рух. Усебеларускі з"езд.

На развіцце рэвалюцыі на Беларусі ўплывалі спецыфічныя ўмовы, створаныя першай імперыялістычнай вайной. Беларусь была падзелена лініяй фронту на Заходнюю і Усходнюю часткі. Гаспадарчыя, культурныя і іншыя сувязі паміж імі былі спынены. Значная колькасць насельніцтва з Заходняй Беларусі эвакуіравалася ў Расію. У раёнах Усходняй Беларусі, якая стала прыфрантавой зонай, не было ніякіх умоў для развіцця народнай гаспадаркі. Працавалі толькі тыя галіны прамысловасці, якія выконвалі заданні фронту. Прыйшлі ў упадак сялянскія гаспадаркі: не хапала інвентару, глебаапрацоўчых прылад, коней. Мабілізацыя на вайну мільёнаў працаздольных мужчын абумовіла нявхватку працоўнай сілы. У прыфрантавой паласе сельскае насельніцтва выконвала вялікі аб"ем работ для фронту. Усе адзначаныя фактары адмоўна ўплывалі на жыццёвы ўзровень насельніцтва.

Вайна таксама падзяліла на дзве часткі і насельніцтва Беларусі. Значная яго частка засталася на тэрыторыі, якая была акупавана германскай арміяй. Звыш аднаго мільёна сялян, рабочых, інтэлігенцыі былі эвакуіраваны ў цэнтральныя губерні Расіі. І з ліку мабілізаваных многія тысячы мужчын былі накіраваны на Паўднёвы фронт і тым самым аказаліся надоўга адарванымі ад родных мясцін.

Сярод насельніцтва, якое засталося ў усходніх раёнах Беларусі, рэвалюцыйную работу вялі бальшавікі, сацыялісты-рэвалюцыянеры, меншавікі з ліку салдатаў і афіцэраў Заходняга фронту. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі, якія існавалі на Беларусі да першай сусветнай вайны, распаліся. Многія з іх членаў засталіся на акупаванай тэрыторыі (браты Іван і Антон Луцкевічы, В.У.Ластоўскі і іншыя), былі мабілізаваны ў армію (К.М.Міцкевіч, І.Д.Луцэвіч, А.В.Баліцкі, А.Р.Чарвякоў), аказаліся бежанцамі ў розных губерніях Расіі (О.Л.Дыла), у сібірскай ссылцы знаходзіўся Я.Лёсік, на катарзе—А.Гарун. Жылі ў працавалі на Урале і Кубані (браты Д.М. і К.М.Басалыгі), Петраградзе

(Д.Ф.Жылуновіч і Б.І.Эпімах-Шыпіла), Маскве— (А.Бурбіс і Ф.Турук), Яраслаўлі—(У.М.Ігнатоўскі),Уладзівастоке—М.С.Мандрыкаў. У Расіі і на Украіне работалі многія другія інтэлігенты з Беларусі. Гэтая акалічнасць не магла не ўплываць на развіццё рэвалюцыйнага працэсу Беларусі. Народныя масы чакалі ад Лютаўскай рэвалюцыі заканчэння вайны, вызвалення заходняй часткі Беларусі ад гаспадарання нямецкіх акупантаў, адраджэння разбуранай эканомікі. Час ішоў, дэмакратычны мір, якога патрэбаваў народ, не наступіў імперыялістычная вайна, у якой былі зацікаўлены буржуазія і памешчыкі, працягвалася. Рэвалюцыя не рухалася наперад, паколькі два блокі, якія кіравалі Расіяй,— "блок эсэраў з меншавікамі і блок гэтага блока з кадэтамі"—не давяралі ні адзін аднаму, ні сваім лідарам ва ўрадзе, а ўсе беды спіхваць сталі на бальшавікоў, якіх лічылі вінаватымі ў отвярнуўшайся абстаноўцы"[1]. Згоднікі паказвалі поўную няздольнасць да канструкцыйнай работы.

Такое становішча не магло працягвацца доўга. Палітычныя крызісы, якія ўзнікалі адзін за другім, усе больш ліхаманілі Часовы ўрад. Выхад з такога стану буржуазная ўлада бачыла ў контррэвалюцыйнай змове супраць рэспублікі, супраць Саветаў, прыход на змену дэмакратыі "дыктатуры шаблі". Натхняцелям змовы была партыя кадэтаў— палітычны штаб буржуазнай контррэвалюцыі. Актыўную ролю іграў таксама генералітэт. На ініцыятыве генералаў пад выглядам грамадскіх арганізацый былі створаны добраахвотныя ваенныя фарміраванні: Ваенная ліга, Саюз афіцэраў арміі і флоту, Казачы саюз, Саюз георгіеўскіх кавалераў, Саюз інвалідаў і інш. Лінію на змову супраць рэвалюцыі падтрымлівалі такія рэакцыйныя ўстановы, як Сенат і Сінод, Дзяржаўны Савет і 4-я Дзяржаўная дума, а таксама Часовы ўрад.

Дзеянні рэакцыі выклікалі кансалідацыю сіл у лагеры рэвалюцыі. У саветах рабочых і салдацкіх дэпутатаў паступова ўмоцніваліся пазіцыі бальшавікоў. Пасля майскіх перавыбараў у Мінскім Савеце была створана бальшавіцкая фракцыя. Налічвалася бальшавіцкая фракцыя ў Гомельскім Савеце, якая складалася з 30 дэпутатаў. Арганізавалася фракцыя РСДРП(б) у Віцебскім Савеце. На прыкладах дэпутатаў-бальшавікоў Саветы прымянялі шэраг дзейсных пастаноў. У Мінску, напрыклад, у чэрвені Савет зацвердзіў пастанову супраць летняга наступлення на фронце. Гомельскі Савет пастанавіў сфар-

міраваць рабочыя дружыны і атрады Чырвонай гвардыі. Ва ўсіх гарадах Саветы пастанавілі ўстанавіць васьмігадзінны рабочы дзень.

Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам А.І.Дзянікін лічыў уплыў бальшавіцкай агітацыі адзінай прычынай непадпарадкавання салдат баявым загадам. Ён сведчыў аб актыўным росце ў салдат рэвалюцыйнай свядомасці.

За растрэлам ліпеньскай дэманстрацыі ў Петраградзе сілы контррэвалюцыі актыўна павялі наступленне супроць рэвалюцыі, яны імкнуліся разграміць Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, фабрычна-заводскія, салдацкія і сялянскія камітэты, бальшавіцкую партыю. Пад дзейнасцю Саветаў сялянскіх дэпутатаў быў устаноўлены кантроль паратовых органаў Часовага ўрада. Усялякія выступленні сялян супраць памешчыкаў душыліся ваеннай сілай.

У выніку рэпрэсіўных мер Часовага ўрада шэраг бальшавіцкіх арганізацый перайшлі на нелегальнае становішча, дзейнасць Мінскага і другіх Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Выканкама Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў стала менш актыўнай.

Тым не менш рэвалюцыйныя сілы не былі разгромлены, яны адступілі і пачалі перагрупіроўку для новага наступу. На выбарах ў гарадскія думы, якія адбыліся ў другой палове ліпеня ў гарадах Беларусі, моцнае паражэнне панесла галоўная буржуазная партыя кадэтаў. У Віцебску за яе галасавала каля 6%, у Мінску—3, Гомелі—поўпрацэнта выбаршчыкаў. Некалькі ўмацавалі свае пазіцыі бальшавікі. За іх спіс галасавалі: у Віцебску—звыш 16%, Гомелі—5, Мінску—5%. Выбары паказалі, што эсеры, меншавікі, бундаўцы мелі найбольшы ўплыў у масах.

Уздыму рэвалюцыйных сіл садзейнічала газета "Звезда"—орган Мінскага камітэта РСДРП(б), першы нумар якой быў выдадзен 27 ліпеня 1917 г.

Як бачна, устанавіць ваенную дыктатуру ў краіне, якая аказалася пасля Лютаўскай рэвалюцыі самай свабоднай ў свеце, было не проста. Жыццё падцвердзіла, што растрэл ліпеньскай дэманстрацыі не прывёў контррэвалюцыю да той меты, да якой яна імкнулася. Контррэвалюцыя была вымушана спыніцца на паўдарозе.

Аднак яна не адмовілася ад рэалізацыі сваіх планаў.

У канцы кастрычніка кантрэвалюцыйны мяцеж. У

сувязі з гэтым пры Саветах былі сфарміраваны ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, на прадпрыемствах — баявыя дружыны, чырвонагвардзейскія атрады. Рэвалюцыйныя сілы ізаляваліСтаўку Вярхоўнага Камандавання ад сталіцы, Заходняга і Паўднева-Заходняга франтоў; устанавілі кантроль над чыгуначнымі вузламі, стратэгічнымі дарогамі, узялі пад ахову ваенныя склады, арсеналы, збройныя майстэрні.

Былі прыняты меры па ўмацаванню абароны Аршанскага чыгуначнага вузла, які меў стратэгічнае значэнне на шляху з Магілева на Петраград. З гэтай мэтай Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў Оршы стварыў атрад Чырвонай гвардыі колькасцю больш за 100 чалавек [1]. У Оршу накіраваны артылерыйскі дывізіен з Гомеля.

Ініцыятарамі актыўнай барацьбы з карнілаўшчынай былі бальшавікі. Дзякуючы іх намаганням многія Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў дзейнічалі як органы ўлады на месцах. Яны абапіраліся на ўласныя ўзброеныя сілы, на дзейсную падтрымку рабочых, салдат, сялянскай беднаты. У выніку рашучых дзеянняў рэвалюцыйных сіл змова генерала Карнілава была ліквідавана.

У гэты найбольш востры этап барацьбы значна панізіўся ўплыў згодніцкіх партый. Калі працоўныя, якія давяралі эсерам і меншавікам, убачылі што пасля паражэння карнілаўцаў яны адмовіліся сфарміраваць урад без кадэтаў, імкнуліся выратаваць буржуазны Часовы ўрад з яго антынароднай палітыкай, то масы пачалі адыходзіць ад гэтых партый. У дробнабуржуазных партыях пачаўся працэс разлажэння. Адзін з лідэраў правых меншавікоў у Віцебскім Савеце сведчыў, што ў перыяд карнілаўшчыны "меншавікі і эсеры адхінуліся на паваротку ў бальшавікоў" [2].

Часовы ўрад не змог адпавядаць тое становішча, што існавала да карнілаўскага мяцяжа. Услед за Петраградам і Масквой быў бальшавізаваны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У Гомельскім і Рэчыцкім Саветах большасць складалі бальшавікі і левыя эсеры. У Віцебскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў 24 верасня была створана бальшавіцкая фракцыя. Узрос уплыў бальшавікоў у Саветах Нясвіжа, Полацка, Слуцка і другіх гарадоў.

---

[1] Оршанский вестник. 1917. 7 сент.; Известия Витебского Совета 1917. 13 сент.

[2] Красная быль. Витебск. 1923. С.30.

Сярод Саветаў Беларусі пашырыўся рух за скліканне другога Усерасійскага з"езда Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і отварэнне Савецкага Урада.

Пасля разгрому карнілаўскага мяцяжа актыўнасць рэвалюцыйных выступленняў мае значна ўзрасла, што праявілася ў нарастанні рабочага і антываеннага руху ў арміі, шырокіх мэтанакіраваных сялянскіх выступленняў. У многіх паветах органы сялянскага самакіравання вынесілі пастановы аб зняцці з пасад асоб мясцовых улад, сяляне рашуча змагаліся супроць выбараў валасных і павятовых земстваў, якія павінны былі, на думку Урада замяніць Саветы. Сярод сялянства ўзмацніўся антыкадэцкі настрой. У адказ кадэты замянілі тактыку падману і затрымання тактыкай разгрому сялянскага руху. У пачатку кастрычніка кадэцкая "Речь" пісала: "Дело не в том, чтобы проводить сейчас какие-нибудь "программы", а в том, чтобы провести народные массы и разгромить Советы".

Росту антыўрадавых настрояў, больш глыбокаму асэнсаванню неабходнасці адхілення ад улады буржуазнага Часовага Урада і перадачы дзяржаўнай улады Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў садзейнічалі два фактары: рэзкае пагаршэнне гаспадарчага стану ў краіне і істотнае зніжэнне матэрыяльна-бытавога становішча рабочых, салдат, працоўнага сялянства, нізшых слаёў інтэлігенцыі. Пасля разгрому карнілаўшчыны ў краіне склалася сітуацыя, пры якой Часовы Урад буржуазіі і памешчыкаў пазбавіўся падтрымкі народа. На отварэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай улады рабочых і сялян, парламентарна-дэмакратычнай рэспублікі сацыялістычная партыі не згадзіліся. Яны аказаліся не ў сілах парваць саюз рэспублікі з кадэтамі. А ўсеагульны крызіс больш паглыбляўся, і краіна аказалася на краю бездны.

Лютаўская рэвалюцыя не выканала задач , якія стаялі перад ею. Першая сусветная вайна працягвалася, народ міра не атрымаў. Сяляне зямлі такоама не дачакаліся. Права на самавызначэнне нацыянальным народам не было прадастаўлена. Нягледзячы на тое, што з моманту рэвалюцыі прайшло восем месяцаў, пытанне аб грамадска-палітычным і дзяржаўным ладзе яна не вырашыла.

Назірая, як імкліва пагружалася вялікая дзяржава ў бездну палітычнага і гаспадарчага хаосу, А.І.Гучкоў прызнаваў няздольнасць Часовага Урада справіцца з катастрафічнымі вынікамі лютаўскага перавароту. "Представители власти,--говорил он, обращаясь

к участникам Государственного Совещания,--пришли к нам со "смертной тревогой" и в "смертельном ужасе", с какими-то болезненными я бы сказал, истерическими криками отчаяния" [1].

Часовы ўрад так і не змог выпрацаваць рэальную праграму, каб выцягнуць краіну з цяжкага крызісу.

Пасля карнілаўскага мяцежа стала відавочным, што кадэцка-правасацыялістычная кааліцыя сябе вычарпала. Зрух улева прывеў у верасні да рэальнай магчымасці стварэння дэмакратычнай, аднароднай сацыялістычнай улады. Урад з прадстаўнікоў гэтых партый змагла б стварыць Дэмакратычнае нараду, якую склікаў у верасні УЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Выканкам Саветаў сялянскіх дэпутатаў. Аднак правыя меншавікі і эсеры вярнуліся да аднаўлення кааліцыі з кадэтамі. У гэтых абставінах бальшавікі 7 кастрычніка выйшлі з Перадпарламента і сталі на шлях аднапартыйнай барацьбы за ўладу.

Узброенае паўстанне ў Петраградзе пачалося 24 кастрычніка. У 10 гадзін раніцы 25 кастрычніка ў напісанай У.І.Леніным адозве "Да грамадзян Расіі" было аб"яўлена аб звяржэнні Часовага ўраду і пераходзе ўлады ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта — органа Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

26 кастрычніка Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў узяў уладу ў свае рукі. У загадзе № 1 Выканаўчага Камітэта гаварылася: "У Мінску ўлада перайшла ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў". З гарадской турмы было вызвалена больш за 1000 палітычных зняволеных і салдат[2], з якіх быў сфарміраваны Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета. Савет узброіў таксама 400 рабочых-чыгуначнікаў. На бок Савета перайшлі 37-й і 289-й запасныя пяхотныя палкі. Яны склалі ўзброеныя сілы новай рэвалюцыйнай улады ў Мінску.

Для ўмацавання сваёй улады Мінскі Савет увёў цэнзуру, адхіліў ад кіраўніцтва Гарадскую думу, накіраваў камісараў на вакзал, пошту, тэлеграф, у штаб Заходняга фронту, узяў пад ахову найбольш важныя ўстановы. 26 кастрычніка пачаў фарміравацца ВРК Заходняга фронту. Ядро яго склалі прэзідыум Мінскага Савета, бюро абласнога Выканаўчага камітэта Саветаў Заходняй вобласці, баль-

1 Вераснёвік. 1917. № 17.

2 Правда. 1917. 11 нояб.

шавіцкая фракцыя франтавога камітэту, прадстаўнікі Мінскага раённага чыгуначнага камітэта, вайсковых часцей, якія размяшчаліся ў горадзе [1].

Аднак да вечара 26 кастрычніка становішча ў горадзе ўскладнілася. Штаб фронту пачаў рыхтаваць франтавыя часці да адпраўкі ў Петраград на дапамогу Краснову і Керанскаму, збіраць сілы для барацьбы супраць Савета ў Мінску. Па загаду камандуючага Заходнім фронтам генерала Балуева 27 кастрычніка ў горад была ўведзена Каўказская дывізія. У гэты ж дзень сілы, якія выступалі ў падтрымку Часовага ўрада, стварылі свой аб"яднаны цэнтр-- Камітэт выратавання рэвалюцыі на чале з меншавіком Калатухіным. Камітэт зняў вавныя пасты Савета, адхіліў ад выканання абавязкаў прызначаных Саветам камісараў. Толькі на вакзале працягвала дзейнічаць ахова ўзброеных чыгуначных рабочых. На ўсіх іншых аб"ектах з"явіліся каравулы з Каўказскай дывізіі. Камітэт прад"явіў Савету ўльтыматум, запатрабаваў перадаць яму ўсю уладу.

Мінскі Савет не мог прыняць ультыматум, паколькі стваралася рэальная пагроза як для Савецкай улады ў Мінску, так і для рэвалюцыйнага Петраграда. У той жа час ён лічыў неразумным уступаць ва ўзброеную барацьбу пры няроўных суадносінах сіл. Выхад са становішча быў падказаны адсутнасцю адзінства ў лагеры контррэвалюцыі. Супроць правых меншавікоў Калатухіна, Жданава і правых эсераў Несцерава, Мікалаева, якія патрабавалі рашучых мер, аж да арышту бальшавікоў--дэпутатаў Савета, выступілі "мяккасардэчныя" меншавікі (Штэрн), бундаўцы (Вайнштэйн) і левыя бундаўцы (Марахавіцкі, Пераль), якія пад націскам рабочых мас шукалі шляхоў жыць у "міры".

Выкарыстаўшы ўнутраную барацьбу ў лагеры праціўніка, бальшавікі дасягнулі кампраміснага рашэння: Камітэт выратавання рэвалюцыі абавязваўся не пасылаць войскі ў Петраград і Маскву, а Савет згадзіўся перадаць камітэту ўладу ў раёне Заходняга фронту. Савет дэлегаваў у склад камітэта сваіх прадстаўнікоў І.Я. Алібегава і Я.І. Перно, якім было прапанавана заставацца ў ім да таго часу, пакуль апошні будзе выконваць заключанае пагадненне.

У мэтах ўмацавання пазіцый Савецкай улады, 27 кастрычніка Камітэт РСДРП(б) накіраваў ўпаўнаважаных ў армейскі камітэт 11-й

I Звезда. 1917. № 19/561.

арміі з заданнем тэрмінова перакінуць у Мінск рэвалюцыйныя часці і адначасова разгарнуў актыўную работу сярод рабочых Мінска, паказаў ім згодніцкую палітыку Цэнтральнага бюро прафсаюзаў, якое выступала за "нейтралітэт" прафсаюзаў у канфлікце паміж Мінскім Саветам і Камітэтам выратавання рэвалюцыі. Прымаліся меры па ўзмацненню гарадской міліцыі ў актыўную барацьбу на баку Мінскага Савета. У мэтах раз"яднання сіл сваіх прыхільнікаў Выканаўчы Камітэт 28 кастрычніка прыняў пастанову аб страце камісарам Заходняга фронту В.А.Ждановым сваіх паўнамоцтваў, паколькі ўрада, які яго прызначыў, больш не існавала [1].

На гэтую акцыю Камітэт адказваў больш кароткай барацьбой супраць Савета. 29 кастрычніка 1917 г. Савету быў аб"яўлены новы ультыматум, які патрабаваў надрукаваць у газеце "Известия Минского Совета" заяву аб тым, што пастановы Савета Народных Камісараў і Петраградскага ВРК не падлягаюць выкананню. Мінскі Савет адхіліў ультыматум. У горадзе складвалася новая сітуацыя. 30 кастрычніка гарадскі сход прыняў і камітэтаў прафсаюзаў вырашыў падтрымаць Савецкую ўладу і аказаць рашучае супрацьдзеянне ўзброеным спробам падаўлення Саветаў з чыйго б то ні было боку [2].

У гэты ж дзень II-й з"езд Гренадзерскага корпуса 2-й арміі рашуча падтрымаў Кастрычніцкую рэвалюцыю і прапанаваў Камітэту выратавання рэвалюцыі прызнаць Савецкую ўладу, а ў выпадку адказа— з"езд патрабаваў разагнаць яго [3]. 31 кастрычніка Савецкую ўладу падтрымалі дывізійны камітэт пры штабе Заходняга фронту і з"езд камітэтаў 10 арміі [4]. 1 лістапада такія ж рэзалюцыі былі прыняты 6-й і 42-й армейскімі, 5-й Гренадзерскай, 15-й Сібірскай дывізіямі, 1-м Сібірскім і 9-м армейскім карпусамі. Паміж 23—24 гадзінамі 1 лістапада ў Мінск з 2-й арміі прыбыў браніраваны поезд, які ўзяў пад ахову Мінскі Савет і горад [5].

---

1. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.2. С.47.
2. Бюллетень Минского Совета. 1917. № 3.
3. Звезда. 1917. № 23.
4. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.2. С.63—65.
5. Звезда. 1917. № 18, 20.

Прыбыццё бронепоезда, бронемашын і падраздзяленняў 60-га Сібірскага палка змяніла суадносіны сіл у горадзе. У сувязі з гэтым Мінскі Савет накіраваў у Камітэт выратавання рэвалюцыі дэлегацыю, якая заявіла аб выхадзе сваіх прадстаўнікоў з Камітэта выратавання рэвалюцыі [1].

Абапіраючыся на актыўную падтрымку рэвалюцыйных салдат і рабочых ваенна-рэвалюцыйны камітэт узяў усю ўладу ў свае рукі. Вечарам 2 лістапада ў гарадскім тэатры адбыўся сход Мінскага Савета з удзелам прадстаўнікоў з прадпрыемстваў, чыгуначнікаў, вайсковых частак—усяго каля 1000 чалавек. Сход адобрыў мераприемствы ВРК па ажыццяўленню II Усерасійскага з"езда Саветаў. Лідэры эсэраў, меншавікоў і бундаўцаў заявілі аб сваей нязгодзе з палітыкай ВРК і выхадзе іх фракцый са складу Савета. Але многія дэпутаты гэтых партый не падтрымалі сваіх лідэраў і засталіся ў Савеце, тым самым прызнаўшы рабоча-сялянскую Савецкую ўладу. Мінская арганізацыя меншавікоў лічыла дзеянні фракцыі памылковымі і 5 лістапада прыняла рашэнне аб яе вяртанні ў Савет.

Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, які не паспеў афармірavацца ў сувязі з абвастрэннем абставін, да 4 лістапада папоўніўся прадстаўнікамі ўсіх арганізацый і воінскіх частак. Выканаўчым органам ВРК быў Пленум, а выканаўча-распарадчымі—бюро і галіновыя аддзелы. У склад бюро ВРК увайшлі: К.І. Ландер(старшыня), А.Ф.Мясніковў, У.С.Селязнеў, М.У.Рагазінскі, М.І. Калмановіч, М.І.Крывашэін, В.М.Фрэйман [2]. Да фарміравання асноўных органаў Савецкай улады ВРК з"яўляўся адзіным поўнаўладным органам на ўсей незакупіраванай тэрыторыі Беларусі і Заходняга фронту.

Услед за Мінскам, 28 кастрычніка ВРК Віцебска ўзяў пад свой контроль пошту, тэлеграф, чыгуначны вузел, распусціў згодніцкі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і прызначыў выбары яго новага складу [3]. У той жа дзень Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў Оршы стварыў ВРК на чале з бальшавіком Дзмітрыевым, рас-

[1] В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. С.62—63.
[2] Летопись Великой Октябрьской социалистической революции. С.26.
[3] Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.2. С.32.

пусціў Камітэт выратавання рэвалюцыі. 26 кастрычніка ў Гарадку Віцебскай губерні нарада кіраўнікоў павятовага Савета і прадстаўнікоў часцей гарнізону прадставілі выканкаму широкія паўнамоцтвы ў барацьбе з контррэвалюцыяй. Яна абавязала выканкам падтрымліваць той парадак, які фактычна ўстанавіўся ў выніку рашэння II Усерасійскага з"езда Саветаў. 8 лістапада павятовы Савет прызнаў Савецкую ўладу і ўтварыў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт для барацьбы з контррэвалюцыяй.

30 кастрычніка ў Гомелі аб"яднанае пасяджэнне гарадскога Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Выканкама павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў адобрыла дэкреты II Усерасійскага з"езда Саветаў і абвясціла ў горадзе і павеце Савецкую ўладу.

У Магілёве, сілы, якія групаваліся вакол Стаўкі, спрабавалі ператварыць горад у апорны пункт барацьбы супраць Савецкага ўрада. Пры падтрымцы праваэсэра-меншавіцкага па складу Усеармейскага камітэта, Магілёўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Выканкама губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў. Лідэры правых эсэраў і меншавікоў мелі намер сфарміраваць "новы ўрад" на чале з Чарновым. Але прыпыніць ці павярнуць ход падзей ў іншае рэчышча ім не ўдалося. З набліжэннем рэвалюцыйных войск да горада, калі лос Стаўкі быў вырашаны, у 23 гадзіны 18 лістапада Магілёўскі Савет быў вымушаны прызнаць Савецкую ўладу і ўтварыць Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, да якога перайшла ўся ўлада ў горадзе [1]. ВРК заявіў, што ён усімі сродкамі будзе абараняць інтарэсы свабоды і рэвалюцыі. Прадстаўнікі Часовага ўраду в.а. галоўкаверха Духоніна, старшыня Усеармейскага камітэта Станкевіч, памочнік начальніка штаба галоўкаверха па палітычных справах Вырубаў былі ўзяты пад дамашні арышт, Усеармейскі камітэт распушчаны [2].

Савецкую ўладу падтрымліваў Заходні фронт. На з"ездах 2-й і 10-й армій, якія адбыліся з 1 па 10 лістапада большасць дэлегатаў складалі бальшавікі і іх прыхільнікі з ліку беспартыйных. Гэтыя з"езды падтрымлівалі дэкреты II Усерасійскага з"езда Саветаў

---

1 Летопись Великой Октябрьской социалистической революции. С.34.

2 Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.2. С.24—215.

і створаны ім Савецкі ўрад. Армейскія камітэты, якія стаялі на іншых пазіцыях былі распушчаны і абраны новыя, а таксама створаны Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты. Дзейнасць франтавога камітэта кваліфікавалася як накіраваная супраць улады Саветаў, як здрада рэвалюцыі [1].

Сярод дэлегатаў другога з"езда Ш-й арміі бальшавікі складалі толькі 46%. З"езд выказаўся за стварэнне "аб"яднанай сацыялістычнай улады на глебе пагаднення паміж абодвума лагерамі дэмакратыі", неадкладнае пакаўнанне ЦВК прадстаўнікамі сацыялістычных партый, Саветаў сялянскіх дэпутатаў і прадстаўнікамі фронту, якія не змаглі прыбыць на з"езд. З"езд падтрымаў скліканне Ш-га Усерасійскага з"езда Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў [2].

У мэтах арганізацыі органаў Савецкай улады ВРК прыняў рашэнне аб правядзенні з"ездаў Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту. 19 лістапада адбыўся з"езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З 560 дэлегатаў 460 былі бальшавікамі. З"езд прызнаў Савецкую ўладу, дэкрэты аб зямлі, міры і контролі над вытворчасцю [3],--асудзіў сабатаж служачых і чыноўнікаў старых дзяржустаноў, запатрабаваў безагаворачнага іх падпарадкавання Савецкай уладзе. У інтарэсах умацавання Савецкай улады на месцах з"езд выразіў правесці перавыбары і ачысціць мясцовыя Саветы ад варожых элементаў. З"езд абраў Выканаўчы камітэт абласнога Савета ў складзе 35 чалавек.

У той жа дзень у Мінску адкрыўся Ш з"езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў. Ад кожнай воласці на з"ездзе было 4 дэлегаты, ад кожнага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і ВРК Заходняга фронту было па аднаму дэлегату. Усяго на з"ездзе прысутнічала 335 дэлегатаў, большасць з іх былі прадстаўнікамі беднаты і сераднякоў. Склад з"езда сведчыў аб вялікім зруху ўлева. Старшыня выканкама, абраны і з"ездам праві эсер Несцераў, кандыдатура якога была вылучана на пост старшыні з"езда, пры выбарах атрымаў 8 галасоў. Старшынёй з"езда быў абраны бальшавік М.У.Крывалэін.

---

1 Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.1. С.75—82, 145—156.

2 Письма трудящихся Белоруссии В.И.Ленину. Мн., 1959. С.16.

3 Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957. Т.2. С.238—239.

З"езд сялянскіх дэпутатаў прызнаў Савецкую ўладу і абавязаўся праводзіць у жыццё яе дэкрэты. У мэтах найбольш паслядоўнага ажыццяўлення дэкрэта аб зямлі з"езд вырашыў неадкладна выбраць усе валасныя камітэты, валасныя земскія ўправы, міліцыю, якія не адпавядалі настрою мас. Зямельным камітэтам было рэкамендавана выдзяліць камісіі і ўзяць на ўлік усю зямлю, іншыя ўгоддзі, інвентар і размеркаваць іх сярод бяднейшых сялян.

З"езд абраў 35 чалавек у склад Выканкама сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і прыняў рашэнне аб аб"яднанні Выканаўчага Камітэта Савета сялянскіх дэпутатаў з Выканаўчым Камітэтам Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

20 лістапада адкрыўся II з"езд армій Заходняга фронту. У ліку 714 дэлегатаў было: бальшавікоў 473, левых эсераў---74, меншавікоў---24, беспартыйных---103. Астатнія 38 дэлегатаў прадстаўлялі розныя дробныя партыі і арганізацыі [1].

З"езд выказаў давер Савету народных Камісараў і абяцаў поўную падтрымку ў барацьбе з ворагамі Савецкай улады. "Заходні фронт,---гаварылася ў рэзалюцыі,---будзе адной з апор народнай улады" [2]. За гэту рэзалюцыю прагаласавала 500 дэлегатаў з"езда.

З"езд распрацаваў сістэму арганізацый Савецкай улады на Заходнім фронце і ў вобласці. Прадугледжвалася аб"яднанне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Саветаў сялянскіх дэпутатаў, Саветаў батрацкіх дэпутатаў з прадстаўнікамі арміі, прафесійных саюзаў, чыгуначнага саюза, паштова-тэлеграфных служачых і ўтварэнне Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У склад абласнога і франтавога Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў увахо дзілі па 35 дэпутатаў ад з"езда рабочых і салдацкіх дэпутатаў і ад з"езда сялянскіх дэпутатаў, 100 дэпутатаў ад франтавога з"езда, 11 ад прафсаюзаў, 4 ад чыгуначнага саюза, 2 ад паштова-тэлеграфнага саюза. Названы Савет з"яўляўся вышэйшым органам заканадаўчай улады ў вобласці і на фронце.

---

1 Звезда. 1917. № 39.

2 Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. С.260.

З нагоды завяршэння работы трох з"ездаў у Мінску 25 лістапада адбылася шматтысячная маніфестацыя рабочых, салдат і сялян у падтрымку Савецкай улады. Праходзіла яна без традыцыйнікоў буржуазіі, памешчыкаў, чыноўнікаў, без той стракатасці ў лозунгах, якая мела месца вясной. На гэты раз калоны ішлі пад бальшавіцкімі лозунгамі. Маніфестацыя завяршылася грандыёзным мітынгам.

У снежні 1917 г. завяршылася работа па арганізацыі Савецкай улады ў Віцебскай і Магілёўскай губернях... Віцебскі губернскі з"езд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў (11—17 снежня) праходзіў пад бальшавіцкім уплывам. З 500 дэлегатаў з"езда каля 70% былі бальшавікі [1]. Прызнаўшы ўладу, устаноўленую II Усерасійскім з"ездам Саветаў і ўтворыўшы ім урад, — Савет Народных Камісараў, з"езд адназдушна заявіў аб сваім імкненні ўсімі сіламі праводзіць у жыццё дэкреты новай улады і энергічна змагацца з усімі спробамі супрацьдзеяння гэтай уладзе. Пазіцыя з"езда ў адносінах да Устаноўчага сходу, прадугледжвала яго падтрымку толькі ў тым выпадку, калі апошні "будзе выконваць волю народа і дзейнічаць у згодзе з ЦВК Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў".

У галіне эканомікі з"езд прапанаваў нацыяналізацыю ваенных дзяржаўных банкаў, банкаў, канфіскацыю прыбыткаў акцыянерных кампаній, увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці, узяцце справы забеспячэння харчаваннем насельніцтва ў свае рукі. З"езд лічыў неабходным утварэнне спецыяльнага органа па кіраванню гаспадаркай у мэтах правядзення ў жыццё рабочага кантролю над прамысловасцю губерні, аб'яўленне дэкрэта аб адмене прыватнай уласнасці на зямлю, гарадскія нерухомыя маемасці, адкрыццё і пуск усіх прадпрыемстваў па вытворчасці патрэбных насельніцтву тавараў, якія былі закрыты і не дзейнічалі.

Мясцовым Саветам сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў, з"езд даручыў кіраванне аб'яўленнем дэкрэта аб зямлі. Адначасова было прынята рашэнне аб роспуску губернскага і павятовага земельных камітэтаў, якія на справе не адлюстроўвалі інтарэсаў працоўных мас.

---

[1] Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.2. С.541—542.

Валасныя земельныя камітэты прыпыналася перабраць і ўзмацніць з боку працоўных сялян кантроль за іх дзейнасцю. Павятовыя Саветы абавязваліся правесці канфіскацыю зазначаных у законе зямель і размежаваць іх паміж беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі.

З"езд прыняў "Палажэнне аб кіраванні губерніяй" і абраў выканаўчы орган — Губернскі Савет дэпутатаў у складзе 65 чалавек, у тым ліку: бальшавікоў—55, левых эсэраў — 5.

16—18 снежня 1917 г. адбыўся першы з"езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Магілеўскай губерні. Але паколькі на з"ездзе не былі прадстаўлены многія Саветы, было вырашана склікаць 5 студзеня 1918 г. агульнагубернскі другі з"езд Саветаў. Да яго склікання было абрана з ліку дэлегатаў бюро для арганізацыі Савецкай улады ў губерні. Неўзабаве гэта бюро папоўнілася прадстаўнікамі з"езда сялянскіх дэпутатаў і працавала як вышэйшы орган Савецкай улады ў Магілеўскай губерні.

У перыяд з 5 па 10 студзеня 1918 г. паасобна адбыліся Ш з"езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і IУ з"езд сялянскіх дэпутатаў Магілеўскай губерні. З 23 Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў на Ш з"ездзе былі прадстаўлены 15. Па пытаннях арганізацыі ўлады, гарадскога і земскага самакіравання, аб судзе, бягучым моманце былі прыняты рэзалюцыі ў духу рашэнняў П Усерасійскага з"езда Саветаў. У адносінах да Устаноўчага сходу з"езд заявіў, што ён будзе на баку Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў [1]. З"езд выказаўся за аб"яднанне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў з Саветамі сялянскіх дэпутатаў.

IУ губернскі з"езд сялянскіх дэпутатаў падтрымаў Савецкую ўладу, заклікаў на яе абарону ўсіх працоўных. Спробы змагацца супраць Савецкай улады, непадпарадкаванне яе пастановам з"езд аб"явіў контррэвалюцыйнымі, якія павінны спыняцца рашучымі мерамі. З"езд прыняў рашэнне аб стварэнні Чырвонай гвардыі.

З"езд выказаўся за правядзенне земельнай рэформы на наступных падставах: адмена права прыватнай уласнасці на зямлю, якая як і ўся яе нетры павінны быць усенародным здабыткам і даванне працоўным на працоўнай, спажывецкай і вытворчай норме на правах землекарыстання. Зямлей у першую чаргу надзяляюцца беззямельныя і малазямельныя. Зямлей павінен карыстацца толькі той, хто на

---

1 Известия Могилевского Совета. 1918. 10 янв.

апрацоўвае. Непасрэдна распараджэнне зямельнымі багацтвамі ажыццяўляюць губернскі і павятовы зямельныя камітэты.

У мэтах забеспячэння парадку, правільнага функцыянiравання Савецкай улады на месцах з"езд прызнаў неабходным неадкладна прыступіць да ўзбраення сялянства і разбраення буржуазіі. Узбраенне павінна было праводзіцца павятовымі Саветамі сялянскіх дэпутатаў толькі тых сялян, якія былі абраны валаснымі і сялянскімі сходамі і з"яўляліся людзьмі сумленнымі, гатовымі не шкадаваць свайго жыцця для абароны рэвалюцыі. Узброенныя фарміраванні з сялян павінны знаходзіцца ў распараджэнні павятовых Саветаў.

У адпаведнасці з рэзалюцыямі з"ездаў I4 студзеня адбылося аб"яднанне выканкамаў Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Саветаў сялянскіх дэпутатаў у адзіны Губернскі Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Такім чынам, на працягу 8 тыдняў на ўсей неакупаванай тэрыторыі Беларусі і Заходнім фронце была ўсталявана Савецкая ўлада. Саветы дабіліся заключэння перамір"я на ўсім працягу Заходняга фронту, разгарнулі актыўную работу па ажыццяўленню дэкрэта аб зямлі, паляпшэнню харчовых спраў, стварэнню трывалага парадку ў краіне. 27 лістапада I9I7 г. выканаўчыя камітэты, абраныя з"ездамі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, Заходняга фронту, аб"ядналіся і ўтварылі Выканаўчы Камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканзах). Яго старшыней быў абраны бальшавік М.У.Рагазінскі. Для кіравання вобласцю і фронтам быў створаны абласны Савет Народных Камісараў на чале з бальшавіком К.І.Ландарам.

З"езды Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Віцебскай і Магілеўскай губерняў, якія адбыліся ў снежні I9I7 г., не прынялі рашэнняў аб ўваходжанні гэтых губерняў у склад Заходняй вобласці і аб зліцці абраных імі выканаўчых камітэтаў з Аблвыканзахам. Абраныя імі выканаўчыя камітэты дзейнічалі самастойна. Магчыма мелася на ўвазе, што заключнай фазай фарміравання абласных органаў улады і дзяржаўнага кіравання з"явіцца Заходні абласны з"езд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У гістарычнай літаратуры і дакументах ёсць успаміны аб падрыхтоўцы да такога з"езду.

Але ў выніку таго, што ваенна-палітычныя абставіны ўскладніліся, фарміраванне органаў дзяржаўнай улады ў Заходняй вобласці не было завершана. Акупацыя 3/4 тэрыторыі вобласці паставіла на першы план задачу арганізацыі барацьбы народа за яе вызваленне. Мерапрыемствы ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва адкладваліся да больш спрыяльнага часу.

Рэвалюцыю, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай Кастрычніцкай, патрэбна разглядваць як непасрэдны працяг і заканчэнне першага, буржуазна-дэмакратычнага этапа сацыяльнага пераўтварэння. Улада, устаноўленая ў выніку гэтай рэвалюцыі, фактычна была рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатурай рабочых і сялян. Але паколькі кіруючая роля ў сістэме яе органаў належала партыі бальшавікоў, то на справе рэвалюцыйна-дэмакратычная дыктатура рабочых і сялян з цягам часу выступала як дыктатура партыі бальшавікоў.

Ва ўмовах Беларусі створаныя органы Савецкай улады па свайму складу былі ўладай рабочых, салдатаў і сялян. Прычым, пераважная большасць належала сялянам і салдатам, якія таксама на 90 працэнтаў былі сялянамі. Новая ўлада сканцэнтравала сваю ўвагу на ажыццяўленні рэвалюцыйных агульнадэмакратычных пераўтварэнняў, да якіх у першую чаргу адносіліся мерапрыемствы па выхаду з вайны, правядзенню ў жыццё дэкрэта аб зямлі, увядзенню 8-гадзіннага працоўнага дня для рабочых і служачых і інш.

Першыя шагі дзейнасці Савецкай улады паказалі, што нават для правядзення ў жыццё задач агульнадэмакратычнага характару ў Беларусі не хапала дастаткова кваліфікаваных кадраў, а для ажыццяўлення самых простых сацыялістычных мерапрыемстваў яшчэ не былі створаны ні матэрыяльныя, ні культурныя, ні палітычныя перадумовы. Памятуя заўвагу Ф.Энгельса аб тым, што "для рабочего класса не может быть большего исторического несчастья, как захват политической власти в такое время, когда он к этому еще не готов" [I]. Плеханаў адзначаў, што ў агульнай масе насельніцтва Расіі рабочы клас складаў малую долю. Для ўстанаўлівання сваёй улады яму патрэбны былі саюзнікі. Сялянства, якое мела патрэбу ў зямлі, зусім не імкнулася к замене капіталістычнага ладу сацыялістычным.

I Плеханов Г.В. Открытое письмо к петербургским рабочим. Вопросы истории. 1989. № 12. С.101.

Разлічваць на тое, што, як кажуць, рускі рабочы пачне, а нямецкі давядзе сацыялістычную рэвалюцыю да перамогі, Плеханаў лічыў вялікай памылкай. Бяспрэчна, немцы былі бліжэй да рэвалюцыі, чым рускія. Але ў немцаў яна яшчэ не паспела. Гэта азначае, што немец не можа закончыць тое, што пачаў рускі. Не маглі закончыць гэта ні француз, ні англічанін, ні амерыканец.

На развіцце рэвалюцыйных пераўтварэнняў у Беларусі значны ўплыў зрабілі спецыфічныя фактары: (першая сусветная вайна і замежная інтэрвенцыя), рашаючае значэнне ў фарміраванні Савецкай улады на Беларусі салдацкіх мас Заходняга фронта, тэрыторыя Беларусі лічылася калідорам для праходу Чырвонай арміі на Захад з мэтаў раздування сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Адзначаныя фактары яшчэ больш ускладнялі і без таго абвостраную палітычную і сацыяльна-эканамічную абстаноўку. У Беларусі адсутнічалі ўмовы для ажыццяўлення дэкрэта аб Зямлі, народ не атрымаў доўгачаканага міру, не маглі сфарміравацца абставіны для вырашэння задачы нацыянальнага самавызначэння Беларусі, для развіцця яе народнай гаспадаркі і культуры.

У трэцюю гадавіну Савецкай улады Ленін заклікаў да выканання другой задачы рэвалюцыі—"труднейшей, строительной, созидательной". У ей нічога няма, гаварыў ён, акрамя дробязей, дробных гаспадарчых спраў, якія можна перамагчы толькі працоўным энтузіязмам і воляй да працы. Але ні энтузіязму, ні волі да працы ў тых, каго заклікалі працаваць не было. Усе крыніцы энтузіязму былі вычарпаны. Патрабавалася новая палітыка, якая б улічвала зацікаўленасць працоўных сялян і рабочых.

Дачасна захапіў палітычную ўладу, рускі пралетарыят не можа ажыццявіць сацыяльнай рэвалюцыі, а толькі, гаварыў Плеханаў, вызаве грамадзянскую вайну. Улада павінна падтрымлівацца ўсімі жывымі сіламі краіны, якія не зацікаўлены ў аднаўленні старога ладу.

Пад уздзеяннем Кастрычніцкай рэвалюцыі старое насільнае аб"яднанне народаў Расіі развалілася. У краіне разгарнулася грамадзянскае нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва.

Прызнаўшы Савецкую ўладу ў Расіі, Вялікая Беларуская Рада ў той жа час не прызнала яе ў Беларусі. Дзяржаўнае ўтварэнне, якое склалася пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі— Заходнюю вобласць і Заходні Фронт яна аднергла. Выканаўчы Камітэт Заходняй вобласці

ці і фронту разглядаўся Радаў як франтавы орган. Падстаўай для такога выпаду паслужыла тое, што ў складзе Выкамзаха членаў— ваеннаслужачых ў паўтары разы было больш колькасці членаў, якія прадстаўлялі Саветы сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў шэрагу гарадоў Заходняй вобласці, што Прэзідыўм Выкамзаха быў складзены толькі з прадстаўнікоў фронту і ў кіраўніцтве Выкамзаха не было ніводнага беларуса. Таму Вялікая Беларуская Рада і іншыя нацыянальныя арганізацыі лічылі, што пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўлад. была арганізавана толькі на Заходнім фронце, а на тэрыторыі Беларусі ніякай улады не існавала.

У мэтах выхаду з гэтага становішча ВБР паставіла сваей задачай дабівацца самавызначэння Беларусі на буржуазнай аснове і стварэння асобнай ад Савецкай Расіі буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі. Для выражэння гэтай задачы ею разам з Беларускім абласным Камітэтам пры Выканкаме Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў быў скліканы Усебеларускі з"езд. 1872 дэлегата складаліся з дзвух амаль роўных частак. Адна з іх падтрымлівала ВБР, а другая—Беларускі абласны камітэт. Прыхільнікі ВБР дабіваліся абвяшчэння незалежнай ад Расіі Беларускай Народнай Рэспублікі. Дэлегаты, якія падтрымлівалі Беларускі абласны камітэт, выступалі за захаванне Беларусі ў складзе Расіі. Прапанаванныя імі праекты рэзалюцый з"езд адхіліў і адобрыў кампраміснае рашэнне аб утварэнні часовага вышэйшага органа ўлады — Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, які павінен быў замяніць арганізаванай пасля лютаўскай рэвалюцыі органы Савецкай улады Беларусі, падрыхтаваць і склікаць Устаноўчы сход.

З"езд не паспеў абраць Усебеларускі Савет сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, а толькі абраў выканаўчы орган— Савет з"езда ў складзе 43 дэлегатаў, абавязаўшы яго правесці ў жыццё ўсе рашэнні з"езда. Як бы з мэтай абароны Савецкай улады ў вобласці і на фронце, СНК Заходняй вобласці і фронту 18 снежня 1917 г. сваім рашэннем распусціў з"езд.

Нягледзячы на адабрэнне многімі сходамі і з"ездамі сялян дзеянняў СНК Заходняй вобласці і фронту, што прывяло да рас-

пуску з"езда, пытанне аб правамернасці зробленага ўсе яшчэ застаецца без адказу. Нам ўяўляецца, што аб"ектыўна ў Беларускага з"езда такога фіналу не павінна было быць. Абласны камітэт РСДРП(б) і Аблвыкамзах ухіліліся ад выканання пагаднення паміж Народным камісарыятам па справах нацыянальнасцей РСФСР і Беларускім абласным камітэтам аб скліканні з"езда сумесна з Саветамі ў Мінску. Вынікае здзіўленне, чаму Мяснікоў які атрымаў тлумачэнне ў Сталіна аб нацыянальнай палітыцы Савецкай улады, не прыняў мер да яе правядзення ў жыцце. Выбары дэлегатаў ад Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў не праводзіліся. Абласны камітэт РСДРП(б) адкрыта праявіў негатыўныя адносіны да з"езда.

Прычыны гэтага трэба шукаць глыбей. Па-першае, Вялікая Беларуская Рада і іншыя нацыянальныя арганізацыі не маглі згадзіцца з тым, у якую форму вылілася пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі. Аб"яднанне вобласці і фронта ў адзіную дзяржаўную адзінку, як гэта адбылося ў Беларусі (Заходняя вобласць і Заходні фронт), не мела прэцэдэнта. Гэта было адзінае ў Расіі ваенна-грамадзянскае дзяржаўнае ўтварэнне. З часу Кастрычніка тут дзейнічалі Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту, Выканкам Саветаў вобласці і фронту і Саўнарком вобласці і фронту. Усе гэтыя органы былі фармальна абласнымі, а на справе франтавымі.

Па-другое, пытанне аб самавызначэнні Беларусі ў значнай меры рабілася актуальным таму, што дэмілітарызацыя Заходняй вобласці не была завершана. Заходняя вобласць аб"ядноўвала тэрыторыю толькі Мінскай і часткі Віленскай губерняў. Неакупіраваныя паветы Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі ўключаны ў Заходнюю вобласць толькі у 1918 г., калі пасля пачатку германскай інтэрвенцыі фактычна аформіравалася новая вобласць з цэнтрам у Смаленску. У выніку аб'яднання аб самавызначэнні Беларусі кіраўніцтва вобласці бачыла толькі ініцыятыву ВЦВК ліквідаваць вобласць, што нібыта ў чым-небудзь сваёй адбітак на развіцці працэса ўтварэння нацыянальнай беларускай рэспублікі. Гэтым можна растлумачыць і той факт, што Урад БНР меў кантакт з Савецкай Расіяй, але з Заходняй вобласцю цёплых адносін не было.

Па-трэцяе, Саўнаркам, Аблвыкамзах і Саўнаркам вобласці

і фронту займаліся пераважна справамі Заходняга фронту, які пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі фактычна рэфарміроўваўся. Пагатаму яны ўдзялялі шмат увагі стварэнню ўзброенай сілы, здольнай абараніць рэвалюцыю, і таму не было магчымасці займацца правядзеннем рэвалюцыйных пераўтварэнняў у вобласці.

На-чацвертае, партыйнае і савецкае кіраўніцтва вобласці складалася з прафесійных ваенных рускай, украінскай, латышскай, армянскай, яўрэйскай і інш. нацыянальнасцей. Беларусаў сярод іх не было, а пытанні, якія трэбавалася рашаць, закраналі беларускую нацыю. Нацыянальныя арганізацыі ставілі пытанне аб самавызначэнні, што вынікала з рашэнняў II Усерасійскага з"езда Саветаў. Але кіраўнікі абласных партыйных і савецкіх органаў не прызнавалі беларускую нацыю і таму патрабаванне аб самавызначэнні Беларусі ўспрынялі як антысавецкае, контрэвалюцыйнае. Такія "тэарэтычныя" домыслы вялі не да ўзаемаразумення і супрацоўніцтва, а да канфрантацыі.

ТЭМА 18. ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА І ЗАМЕЖНАЯ ІНТЭРВЕНЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ.

Вучэбныя пытанні: Выступленне польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. Ваенная інтэрвенцыя Германіі. Польская інтэрвенцыя. Савецка-Польская вайна. Абвяшчэнне БНР. Утварэнне БССР.

Началам грамадзянскай вайны на Беларусі з"явіўся мяцеж Доўбар-Мусніцкага, які з жніўня 1917 г. з"ядноўваўся камандзірам 1-га Польскага корпуса легіянераў. Пасля роспуску Беларускага з"езда Доўбар-Мусніцкі 12 студзеня 1918 г. афіцыйна аб"явіў вайну Савецкай Расіі. Яго палітычнай мэтай была ліквідацыя Савецкай улады ў Беларусі і далучэнне Мінскай і Магілеўскай губерняў да Польшчы.

Вайна пачалася наступам корпуса на Жлобін-Бабруйск. Яна выклікала ўсеагульнае абурэнне працоўных Беларусі, не магла не ўзбудзіць іх патрыятычных пачуццяў. У абласцях і паветах мясцовыя Саветы фарміравалі партызанскія атрады. Партызанскія атрады, якія дзейнічалі ў раёне Журавіч, Жарны, Чачэрска, Рудзе-Кашалёўскай аб"ядналіся ў адно фарміраванне, быў створаны партызанскі штаб, наладжана сувязь са штабам рэвалюцыйных войск у Новазыбкаве.

Першую перамогу над войскамі мяцежнікаў завяавалі чырвонаармейскія атрады ў баю, які адбыўся каля чыгуначнай станцыі Ясень 24 студзеня 1918 г. У аператыўнай зводцы паведамлялася, што быў знішчаны "пяхотны атрад польскіх легіянераў у колькасці 600 чалавек, здабыты 2 гарматы, польская кавалерыя адступіла... Усе мясцовае насельніцтва на баку Савецкай улады, сустракаюць нашы войскі як вызваліцеляў, разбураюць пуці і аказваюць усялякую дапамогу рэвалюцыйным героям" [1].

Рашаючы ўдар па часцях польскага корпуса савецкія войскі і партызаны нанеслі пад Рагачовам і Жлобінам. Каля станцыі Жлобін упарты бой, ах да рукапашных сечак прадаўжаўся 6, а гарматны агонь — 30 гадзін. Атрымаўшы перамогу ў гэтым баі, чырвонаармейскія атрады вызвалілі Жлобін, а ў ноч на 31 студзеня 1918 г.—Рагачоў. У гэтых баях была поўнасцю разгромлена 1-я польская дывізія. Польскія салдаты кідалі зброю, здаваліся ў палон [2].

---

1 Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т.2.

2 Правда. 1918. [illegible]

Першы ачаг грамадзянскай вайны ў Беларусі быў патушаны. На ўсёй тэрыторыі, часова акупаванай мяцежнікамі, была адноўлена Савецкая ўлада.

16 лютага 1918 г. Германія паведаміла Савецкай Расіі аб скасаванні 18 лютага тэрміна перамір"я і аднаўленні стану вайны. 18 лютага пачаліся ваенныя дзеянні. 10-я армія рухалася ў напрамку Мінск-Смаленск-Масква, а 21-ы корпус — на Гомель. Германія разлічвала ліквідаваць Савецкую ўладу, аднавіць ўладу капіталістаў і памешчыкаў і далучыць да Германіі тэрыторыю Прыбалтыкі, Беларусі, Украіны. Гэта была сур"ёзная небяспека не толькі новаму ладу, але і існаванню самой краіны.

Рабочыя, сяляне Беларусі, якія ледзь не паспелі забыць цяжкае мінулае рашуча выступілі ў абарону Савецкай улады. На тэрыторыі Заходняй вобласці пачалося фарміраванне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Да 1 кастрычніка 1918 г. у Магілёўскай і Віцебскай губернях у Чырвоную Армію добраахвотна ўступілі 30 тыс. рабочых і сялян.

На цэнтральным напрамку супраць германскай арміі выступілі Віцебскі, Аршанскі, Магілёўскі рэвалюцыйныя атрады і 11-я рэвалюцыйная армія пад камандаваннем Р.І.Берзіна. Рэвалюцыйныя часці і атрады займалі пазіцыі каля Полацка, Барысава, Рабруйска, Жлобіна, Калінкавіч. У тыле нямецкіх войск дзейнічалі партызанскія атрады. Да пачатку сакавіка 1918 г. рэвалюцыйныя войскі спынілі наступленне нямецкай арміі па лініі Эрша-Магілёў-Гомель. Аднак на адным рэвалюцыйным і патрыятычным уздыме, без рэгулярнай арміі, маладая Савецкая краіна вясці поўнамаштабную вайну не магла.

Савецкі ўрад вымушана ідзе на заключэнне Брэсцкага мірнага дагавору з Германіяй. Пад германскай акупацыяй апынулася большая частка тэрыторыі Беларусі. Неакупаванымі засталіся толькі шэсць паветаў: Клімавіцкі, Мсціслаўскі, Чаўскі, Чэрыкаўскі, Віцебскі, Гарадоцкі і частка Горацкага, Магілёўскага, Аршанскага, Быхаўскага, Гомельскага, Рагачоўскага, Лепельскага і Сенненскага паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Гомельскі, Рэчыцкі, Мазырскі і Мінскі паветы на захаду нямецкіх акупантаў былі далучаны да гетманскай Украіны.

У афіцыйных зваротах і загадах акупацыйныя ўлады неаднаразова нагадвалі аб сваёй "вызваленчай місіі". Але на справе

адразу выяўляліся іх захопніцкія палітычныя і эканамічныя мэты.

У сакавіку 1918 г. яны правялі чыстку мінскай міліцыі. З яе радоў у першую чаргу выганяліся тыя, хто падазраваўся ў блізкасці з бальшавікамі. У шмат якіх гарадах міліцыю замянялі земскай вартай і ўраднікамі. У чэрвені 1918 г. разагнаную Мінскую гарадскую думу замянілі магістратам, складзеным у асноўным з прадстаўнікоў буржуазіі і памешчыкаў. У сельскай мясцовасці земскія ўправы замяняліся валаснымі старшынямі і паліцыяй [1]. Усюды-там на месцах ствараліся ўстановы па германскаму ўзору акруговыя саветы (крайсландтагі). У іх склад падбіраліся пераважна прадстаўнікі буржуазных партый, былыя манархісты, кулакі [2]. Яны ж занялі рашаючыя пазіцыі ў створанай акупантамі судовай сістэме. Германскі начальнік павета з'яўляўся вышэйшай судовай інстанцыяй у павеце, яму належала права зацвярджаць рашэнні валасных і павятовых судоў. У такіх органах самакіравання акупанты бачылі трывалую апору створанага імі рэжыма.

У маі 1918 г. ў Берліне адбылася сакрэтная нарада прадстаўнікоў міністэрстваў замежных спраў, фінансаў, імперскага банка і вярхоўнага галоўнакамандуючага сіл з удзелам кіраўнікоў "Дрэздэн банк", "Дойче банк", канцэрнаў Сіменса, Крупа і "Фенікс-шталь". У мэтах забеспячэння Германіяй свайго пануючага становішча на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, нарада прызнала неабходным у першую чаргу забяспечыць уплыў на буйныя транспартныя прадпрыемствах (чыгуначныя дарогі, асабліва буйныя веткі ва ўсходнім напрамку і рачныя шляхі).

Аднак здзяйсненне планаў імперыялістычнай Германіі было сарвана народным супраціўленнем, якое паступова нарастала. Ужо вясной на заводах і фабрыках хваля забастовак пракацілася ў многіх месцах, дзе-нідзе яны перарасталі ва ўзброеную барацьбу. Так, 15 ліпеня 1918 г. забастоўка гомельскіх чыгуначнікаў перарасла ва ўзброеную стычку з акупантамі. Іх падтрымлівалі рабочыя Магілева, Жлобіна, Рагачова і іншых гарадоў Беларусі.

---

[1] Дзянніца. 1918. 30 кастрычніка.

[2] Минский голос. 1918. 20 нояб.

На барацьбу з нямецкімі акупантамі выступіла працоўнае насельніцтва Беларусі. Вясной сялянскія паўстанні ўспыхнулі ў Навагрудскім павеце і сумежных з ім валасцях Баранавіцкага павета. Моцныя сялянскія хваляванні адбыліся ў Слуцкім, Быхаўскім, Рэчыцкім, Бабруйскім і іншых паветах. Неўзабаве выступленні сялян выліліся ва ўзброеную партызанскую барацьбу. У Мінскім, Магілеўскім, Гомельскім, Барысаўскім, Ігуменскім, Слуцкім і Быхаўскім паветах барацьбу з нямецкімі акупантамі вялі звыш 100 партызанскіх атрадаў.

У раене Полацка актыўна змагаліся партызанскія атрады, якія аб'ядноўвалі 13 тыс. чалавек. На Палессі ўжо да жніўня 1918 г. партызанскія атрады кантралявалі Пінскі, Луніншкі, Кобрынскі, Ганцавіцкі, Столінскі і іншыя паветы. Каардынаваў іх баявую дзейнасць Ваенны Савет паўстанцкіх камуністычных часцей Заходняй Беларусі.

Між тым, к гэтаму часу аўстра-германскі блок пацярпеў паражэнне ў першай сусветнай вайне. У Германіі пачалася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. У сувязі з гэтым, 13 лістапада 1918 г. быў ануляваны Брэсцкі дагавор. Чырвоная Армія перайшла ў наступленне супраць германскіх войск па ўсяму фронту. Ужо 21 лістапада нямецкія войскі адступілі за Бярэзіну. 22 лістапада Чырвоная Армія заняла Полацк, 28 лістапада--Бабруйск, а ў канцы лістапада вызваліла заходнюю частку Магілеўскай губерні і рухалася ў напрамку Мінска.

У гэтыя дні бурную палітычную актыўнасць развіў Паўночна-Заходні абласны камітэт партыі правых эсэраў. У пачатку лістапада ён правёў з'езд працаўнікоў земскіх і гарадскіх самакіраванняў, на якім быў створаны часовы "Савет органаў земскага і гарадскога самакіравання краю". 11 лістапада на нарадзе працаўнікоў меншавікоў, эсэраў, Бунда, ЦСДРП, "Палей-Цыён" і ОБСРП быў створан выканкам Савета, які 12 лістапада накіраваў Савету салдацкіх дэпутатаў 10-й германскай арміі ў Мінску мемарандум з патрабаваннем перадаць яму "грамадзянскую ўладу" у Беларусі. З вызваленнем Мінска, якое адбылося 10 снежня 1918 г. у горадзе была адноўлена Савецкая ўлада. Спроба правых эсэраў, меншавікоў, яўрэйскіх сацыялістычных партый, устанавіць сваю ўладу ў горадзе і Беларусі поспеху не мела.

У другой палове лістапада 1918 г. часці Чырвонай Арміі вызвалілі ад акупантаў Маладзечна, Ліду, Баранавічы.

Нямецкае камандаванне разам з контррэвалюцыйнай петлюраўскай дырэкторыяй, створанай на Украіне, спрабавала ўзімі сіламі утрымаць Гомель. У адказ на гэта чыгуначнікі аб"явілі забастоўку, іх падтрымалі рабочыя заводаў і фабрык горада і павета. Наступленне Чырвонай Арміі, дзеянні партызан і усеагульная забастоўка рабочых вымусілі нямецкіх акупантаў адступіць. 6 студзеня 1919 г. Чырвоная Армія заняла Гомель. У першай палове студзеня 1919 г. ею пры ўзаемадзеянні з партызанскімі атрадамі было вызвалена Палессе. Да сярэдзіны лютага 1919 г. савецкія войскі замацаваліся на лініі Паняжэж–Вільня–Вількамір–Кослі–Араны–Ліда–Слонім–рака Шчара–Агінскі канал–Сарны.

У канцы лютага 1919 г. двума групамі, каля 11 дывізій, войскі Польшчы пачалі наступленне ў напрамках Вільня–Ліда–Маладзечна, Баранавічы–Мінск, Кобрын–Мінск. У сярэдзіне сакавіка 1919 г. імі былі акупаваны Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Скідзель, Шчучын, Мінск і адпаведныя паветы.

Вясной 1919 г. выкарыстаўшы занятасць Чырвонай Арміі на Усходнім фронце, польскія войскі ўзнавілі наступленне. У ноч на 17 красавіка яны прарвалі фронт і захапілі Ліду, Баранавічы. 19 красавіка завязалі бой на падыходах да Вільні. Пасля трохдзённых баеў 153-й стралковы полк 17-й стралковай дывізіі і баявыя атрады рабочых, якія абаранялі горад, пакінулі Вільню. Пад націскам пераважаючых сіл праціўніка савецкія войскі вымушаны былі адступіць.

Баі за Вільню яшчэ раз паказалі неабходнасць неадкладнага ўмацавання Заходняга фронту. Урад Літоўска- Беларускай рэспублікі мабілізаваў у Чырвоную Армію каля 90 тыс. чалавек. Значная частка з іх мабілізаваных была накіравана на Заходні фронт. Савецкі ўрад звярнуўся з зваротам да ўрада Польшчы аб мірным вырашэнні спрэчных пытанняў. Аднак, атрымаўшы палітычную і ваенна-эканамічную дапамогу англа-французскага капітала, урад Польшчы адхіліў савецкія прапановы. Ён імкнуўся пашырыць сваю тэрыторыю і пачаць ўнутраныя справы за кошт суседняй краіны Саветаў.

Пасля заходу інтэрвентамі Нова-Свенцян, Баранавіч і іншых

гарадоў навісла сур"ёзная небяспека над Мінскам. Для яго абароны было прынята рашэнне папоўніць за лік мабілізаваных працоўных аслаблення воінскія часці і сфарміраваць новыя. Мінскі камітэт партыі мабілізаваў 2/3 складу гарадской арганізацыі. Падтрымкай партыйнай арганізацыі Мінскай губерні накіраваліся на Заходні фронт звыш тысячы камуністаў. Да 8 чэрвеня па рашэнню канферэнцыі праўленняў прафсаюзаў і фабзаўкамаў быў сфарміраваны спецыяльны рабочы полк імя Мінскага Савета прафсаюзаў. У Мінскай губерні было мабілізавана каля 35 тыс. рабочых і сялян.

Поспехі ў барацьбе з Калчаком абумовілі накіраванне мабілізаваных з Гомельскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў выключна на Заходні фронт. У жніўні-ліпені часці Літоўска-Беларускай (16-й) арміі атрымалі больш за 20 тыс. мабілізаваных рабочых і сялян. Заходняму фронту дадаткова былі выдзелены фонды харчавання, адзення, абутку, іншых прадметаў чырвонаармейскага ўжытку. Палепшыўся клопат аб параненых, сем"ях чырвонаармейцаў.

Праведзеныя мерапрыемствы ўмацавалі Заходні фронт, але не настолькі, каб было магчыма дабіцца павароту ў вайне. Варожыя войскі працягвалі наступаць. 8 жніўня 1919 г. праціўнік ўварваўся ў Мінск. Пасля вулічных стычак часці Чырвонай Арміі пакінулі горад. Рухаючыся далей на ўсход, акупанты захапілі Слуцк, Ігумен, Нова-Барысаў, Бабруйск. Фронт стабілізаваўся на лініі р. Бярэзіны.

На захопленай зямлі інтэрвенты ўсталявалі жорсткі акупацыйны рэжым, адданілі ўладу памешчыкаў і капіталістаў, пазбавілі працоўных палітычных правоў. Праводзіліся масавыя арышты, звальненні рабочых, цяжкія павіннасці неслі сяляне, пагоршылася матэрыяльнае становішча.

Беларускі народ не пакарыўся акупантам. У тыле ворага разгортвалася ўзброеная барацьба супраць інтэрвентаў. Партызанскія атрады М.Арбузава, В.Аляшкевіча, А.Блакко, І.Бачко, А.Крывашчокава, І.Маслыка, С.Плашчынскага, В.Пагірэйчыка, І. Ынкс, А.Салаўя і іншыя разбуралі камунікацыі ворага, рабілі налеты на яго гарнізоны, праводзілі разведку па заданню камандавання Чырвонай Арміі.

Перамогі Чырвонай Арміі на Усходнім і Паўднёвым франтах значна ўмацавалі пазіцыі Савецкай улады. Савецкая краіна заваява-

ла мірную перадышку, паявілася магчымасць больш увагі ўдзяляць гаспадарчаму будаўніцтву, барацьбе з разрухай, пачалося аднаўленне прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі.

Другая перадышка аказалася вельмі кароткачасовай. Імперыялісты не маглі прымірыцца з існаваннем дзяржавы рабочых і сялян і зрабілі яшчэ адну спробу знішчыць краіну Саветаў. На гэты раз ударнай антысавецкай сілай з"явілася армія буржуазна-памешчыцкай Польшчы і войскі Урангеля.

У пачатку сакавіка 1920 г. войскі буржуазна-памешчыцкай Польшчы пачалі ваенныя дзеянні ў раене Палесся, на стыку Заходняга і Паўднева-Заходняга франтоў. За два дні, 5 і 6 сакавіка, яны захапілі Рэчыцу, Мазыр і Калінкавічы. 25 красавіка наступленне пачалося на Украіне, на шырокім фронце ад Прыпяці да Днястра. Зламаўшы абарону Чырвонай Арміі, польскія войскі захапілі значную частку савецкай тэрыторыі.

28 красавіка 1920 г. ЦК РКП(б) зацвердзіў план узброенага адпору Польшчы. Ён прадугледжваў нанясенне галоўнага ўдару па праціўніку войскамі Заходняга фронта ў напрамку Мінск-Беласток-Варшава. Дапаможны ўдар павінен быў нанесці Паўднева-Заходні фронт у напрамку на Роўна-Брэст. З гэтага часу ўзрастае значэнне Заходняга фронта.

Каб дапамагчы абарончым дзеянням Паўднева-Заходняга фронту, Заходні фронт (камандуючы М.М.Тухачэўскі, член РВС І.С.Уншліхт) 14 мая перайшоў у наступленне. Асноўны ўдар наносіла 15-я армія на Вільню, дапаможны—16-я армія на Ігумен-Мінск. Аднак моцным контрударам праціўнік адцясніў савецкія войскі ў зыходнае становішча. З прычыны недахопу сіл і часу падрыхтоўкі майскае наступленне закончылася няўдачай. Разам з тым яно адцягнула значную частку сіл ворага, стварыла больш спрыяльныя ўмовы для адыхода армій Паўднева-Заходняга фронту, палегчыла канфігурацыю лініі абароны. Чырвонай Арміяй быў заняты і ўтрыманы раен на поўнач ад Лепеля, які забяспечваў устойлівае становішча Полацка і Віцебска.

У ходзе падрыхтоўкі да наступлення, на Заходні фронт прыбылі 8 стралковых дывізій, 4 стралковых і 1 кавалерыйская брыгада. Усяго ў чэрвені-ліпені Заходні фронт атрымаў каля 70 тыс. байцоў. У складзе Заходняга фронту былі зноў сфарміраваны 3-я і 4-я арміі, 3-ці конны корпус і асобная Мазырская група.

18 чэрвеня 1920 г. Мазырская група сумесна з часцямі 12-й арміі Паўднева-Заходняга фронту пачалі баявыя дзеянні супраць правага фланга польскіх войск. Група фарсіравала Дняп і вызвалiла Мазыр, Рэчыцу і іншыя населеныя пункты. 4 ліпеня ўдарная групоўка фронту ў складзе 3-й, 4-й і 15-й армій 3-га коннага корпуса перайшла ў наступленне. Галоўны ўдар наносіўся ў напрамку Полацк-Смаргонь-Ліда. На мінскім напрамку 7 ліпеня пачала наступаць 16-я армія. Наступальныя дзеянні войск фронта разгортваліся паспяхова. 9 чэрвеня быў вызвалены Ігумен, 10 ліпеня--Бабруйск, 11 ліпеня войскі 16-й арміі ўступілі ў Мінск. З гэтага моманту пачаўся новы этап баявых дзеянняў--праследаванне праціўніка. 14 ліпеня войскі занялі Вільню, 19 ліпеня--Гродна. Праціўнік пад націскам савецкіх войск адыходзіў на ўсім Заходнім фронце.

Ва ўмовах адступлення польскага войска Антанта 12 ліпеня прад"явіла Савецкаму ўраду ўльтыматум (т.з. "Нота Керзана"), у якім патрабавала спыніць наступленне Чырвонай Арміі, пагражаючы ўмяшацца. Улічваючы, што польскі ўрад не звяртаўся з прапановай мірных перагавораў, Савецкі ўрад 17 ліпеня адхіліў умяшанне Антанты і прыняў рашэнне прадоўжыць наступленне Чырвонай Арміі.

Да жніўня 1920 г. войскі Заходняга фронту вызвалілі ўсю Беларусь. Але з пераносам баявых дзеянняў на тэрыторыю Польшчы змяніліся, дакладней выразна праступілі палітычныя матывы і мэты вайны з боку Савецкага ўрада. З абароннай яна ператварылася ў сродак экспарта рэвалюцыі, уздыму міравой сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэта быў галоўны матыў указання Савецкага ўрада камандаванню Чырвонай Арміі, аб працягу наступлення на тэрыторыі Польшчы. Гэтым тлумачыцца, што 30 ліпеня ў Беластоку быў утвораны Часовы рэвалюцыйны камітэт Польшчы (Польрэўкам). Пачалі фарміравацца мясцовыя органы рэвалюцыйнай улады. Намаганнямі Польрэўкама і РВС Заходняга фронту ў раене Бабруйска і Рослаўля фарміравалася 1-я Польская Чырвоная Армія.

Аднак разлік на падтрымку польскага рэвалюцыйнага пралетарыяту, на ўздым рэвалюцыйнай хвалі ў Польшчы не апраўдаўся. Наадварот, адказам на наступ Чырвонай Арміі быў магутны нацыянальны патрыятычны ўздым польскага народа, у абарону незалежнасці сваёй радзімы, і тое,што пад Варшавай стаяла войска

рэвалюцыйнай дзяржавы, значэння ўжо не мела. Значэнне мела толькі адно: пад сцягамі сталіцы стаяла войска чужой дзяржавы. І таму арміі Тухачэўскага суструлі ўпартае супраціўленне працоўніка, які 16 жніўня перайшоў у контрнаступленне. Адрэзаныя ад асноўных войск фронту 4-я армія, дзве дывізіі 15-й арміі і 3 ці конны корпус вымушаны былі перайсці граніцу Усходняй Прусіі, дзе былі інтэрніраваны. Але асноўныя сілы фронту працягвалі абарончыя баі.

12 кастрычніка быў заключаны дагавор аб перамір"і і папярэдніх умовах міру, згодна якім ваенныя дзеянні спыняліся з 18 кастрычніка. 18 сакавіка 1921 г. у Рызе паміж Савецкай Расіяй і Польшчай быў заключаны мірны дагавор. Зноў цяжкі, зноў несправядлівы, асабліва для Беларусі. Дзве заходнія вобласці з насельніцтвам звыш за 3 млн. чалавек адышлі да Польшчы.

Вопыт міравой гісторыі сведчыць, што грамадзянскія войны часта з"яўляліся як бы непасрэдным працягам рэвалюцый. У Расіі грамадзянская вайна ў поўным сэнсе была запраграміравана аб"ектыўнымі і суб"ектыўнымі ўмовамі. Сама форма Кастрычніцкай рэвалюцыі, кароткі дыктатарскі характар устанаўлення яе ўлады і рэвалюцыйных пераўтварэнняў павялічвалі колькасць незадаволеных, падштурхоўваючы антыбальшавіцкія элементы да ўзброенай канфрантацыі. Правыя эсеры і меншавікі ўзяліся за зброю не столькі з-за карыслівых матываў (страта ўлады і г.д.), колькі па ідэйнаму разуменню; яны былі сведкамі парушэння свабоды і дэмакратыі-- тых вышэйшых каштоўнасцей, за якія гатовы былі аддаць жыцце.

Радыкальная нацыяналізацыя буйной, сярэдняй і нават мелкай прамысловасці, забарона гандлю, рынка, харчразвёрстка, найвастрэйшая цэнтралізацыя і рэгламентацыя ўсіх бакоў жыцця, ваенна-загадная сістэма, працоўная павіннасць, якія на месцах праводзіліся пры дапамозе грубага насілля і самавольства з боку многіх Саветаў, рэўкамаў: камбедаў балюча закраналі інтарэсы розных слаёў насельніцтва, вызывалі незадаволенасць і супраціўленне ў розных, у тым ліку і ўзброеных формах.

У развязванні грамадзянскай вайны відавочна таксама і роля міжнароднага імперыялізму. Без яго дапамогі белы рух не меў бы магчымасці весці такую працяглую і шырокамаштабную барацьбу.

На Беларусі ўвогуле грамадзянскай вайны ў шырокіх памерах не было. У 1918--1920 гады большая частка яе тэрыторыі была акупавана інтэрвентамі. Аднак гэта не азначае таго , што беларускі

народ не ўдзельнічаў у грамадзянскай вайне. Насельніцтва ўсходніх раёнаў Беларусі, якія не былі заняты замежнымі інтэрвентамі, у значнай частцы было мабілізавана на барацьбу з арміямі Калчака, Дзянікіна. На акупаванай нямецкімі ў 1918 і польскімі ў 1919—1920 гг. інтэрвентамі рабочыя і сяляне вялі актыўную барацьбу з інтэрвентамі ў партызанскіх атрадах і падпольных групах.

Сення гісторыя грамадзянскай вайны ўяўляе бітву ідэй і канцэпцый. Панаваўшы доўгі час погляд на яе з пазіцый пераможцаў ніяк не садзейнічаў узнаўленню гістарычна праўдзівай карціны. "Сталінская школа фальсіфікацый" прынесла ў савецкую гістарыяграфію не толькі цемру хлусні, міфаў і ўмаўчанняў, але і своеасаблівую ўрачыстасць пераможцаў. Голас другога боку, пераможаных, з канца 20-х гадоў быў заглушаны. У апошні час усё больш прабівае сабе шлях усведамленне таго, што толькі аб"ектыўны навуковы погляд на грамадзянскую вайну, які ўлічвае і дакументальныя крыніцы змагаўшыхся супрацьтады бакоў, дазваляе прыблізіцца да гістарычнай праўды. Але, на жаль, набірае сілу і другая тэндэнцыя— да змены адной прадузятасці на другую, фарміраванне новых міфаў і стэрэатыпаў, да занядбання гістарычнымі фактамі.

У сучаснай гістарычнай навуцы і публіцыстыцы фарміруецца канцэптуальнае ўяўленне аб грамадзянскай вайне як трагедыі нашага народа. Вострыя дыскусіі вызываюць такія пытанні, як крытыка і віноўнікі грамадзянскай вайны. На нашу думку, у развязванні грамадзянскай вайны віноўны абоз бакі. Пры гэтым кожны лічыў менавіта сябе абсалютна правым. Белыя прэтэндавалі на ролю прадстаўнікоў агульнанацыянальнай справы, заявалі і паміралі за вялікую Расію і яе інтарэсы, як яны іх разумелі. Бальшавікі не без падставы былі перакананы, што з"яўляюцца выразнікамі і заступнікамі інтарэсаў ўсіх працоўных, барацьбітамі супрацьпрыгнету і эксплуатацыі, за хуткае і канчатковае сацыяльнае вызваленне не толькі свайго народа, але і ўсяго свету.

Сіла белагвардзейскіх рэжымаў асноўвалася на дыктатуры ўлады іх правадыроў, спачатку пераважае ваеннай арганізацыі і падтрымцы замежных інтэрвентаў. Іх слабасцю была вузкасць сацыяльнай базы і неадольныя супярэчнасці ўнутры ўласнага лагеру. Белым так і не ўдалося аб"яднаць усіх прыхільнікаў Савецкай улады.

Бальшавікі таксама не кіраваліся прынцыпамі гуманізму. Іх удары былі нярэдка бесчалавечнымі. Стаўка на рэвалюцыйнае насілле як метад далучэння мільёнаў людзей да новага ладу давала адваротны вынік. Ленін прызнаваў, што бальшавікамі былі дапушчаны вялікія памылкі, якія паслужылі адной з асноўных прычын зацягвання грамадзянскай вайны. А галоўнай чэ ахвярай стаў расколаты на два варожыя лагеры народ.

Важнейшы ўрок грамадзянскай вайны заключаецца ў адказе ад нецярпімасці, ад сутыкнення розных слаёў грамадства, ад насілля і дэспатызму, як метада дзяржаўнага будаўніцтва, як спосаба "ашчаслівіць" народ. Усе гэта перажыткі зусім іншых эпох, несумяшчальныя з дэмакратызацыяй і сучаснай цывілізацыяй.

Бачачы, што ў Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва не пачыналася і асцерагаючыся каб германскія, польскія, украінскія і літоўскія буржуазна-памешчыцкія сілы не паквапіліся на "безгаспадарчую" тэрыторыю Беларусі, беларускія нацыянальныя арганізацыі актыўна павялі лінію на ўтварэнне беларускай дзяржавы.

Калі савецкія войскі пакінулі Мінск, а германскія яшчэ не ўступілі ў горад Выканкам Савета з"езда 25 лютага 1918 г. звярнуўся да народа з І-й Устаўной граматай, у якой аб"явіў сябе ўладай у Беларусі. Часовым выканаўча-распараджальным органам стаў створаны ім з прадстаўнікоў сацыялістычных партый Народны Сакратарыят на чале з Я.Варонка.

Выканкам Савета з"езда і віленская Беларуская Рада дамовіліся стварыць Беларускую Народную Рэспубліку, што і было ажыццёўлена 9 сакавіка 2-й Статутнай граматай. Выканкам Савета з"езда надаў сабе назву Рада І Беларускага з"езда. 19 сакавіка на першым пасяджэнні Рады БНР (так з гэтага часу стала называцца Рада І Беларускага з"езда) быў прыняты яе Статут, зацверджаны І-я і 2-я Статутныя граматы і вызначаны склад Рады. Акрамя 27 членаў выканкама з"езда, у яе склад запрошаны ад правінцыяльных рад 9, Мінскага земства 10, Гарадскога самакіравання 10, меншасцей 15 (7 яўрэяў, 4 палякі, 2 рускіх, 1 літовец і 1 украінец). З 71 члена Рады беларусаў было 36, прадстаўнікоў Мінска звыш 55. Такім чынам па складу Рада была органам не Беларусі, а Мінска.

3-й Статутнай граматай ад 25 сакавіка 1918 г. БНР абвяшчалася "незалежнай і вольнай дзяржавай" у складзе Магілеўскай, Мінскай, Віцебскай, беларускай часткі Гродзенскай, Віленскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і суседніх губерняў [1].

Стварэнне дзяржавы, чаго дабівалася Беларуская Сацыялістычная Грамада, з"явілася гістарычна заканамерным. У выніку буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі па свайму зместу магла быць утворана толькі дэмакратычная дзяржава. Менавіта такую дзяржаву і імкнуліся стварыць нацыянальныя партыі і арганізацыі. Між тым за справе гэта мэта не была здзейснена.

БНР была створана і існавала пад акупацыяй. Акупанты былі супроць падтрымкі нацыянальных органаў улады абвешчанай дзяржавы. Але Рада вымушана была калі не супрацоўнічаць з імі, то быць да іх лаяльнай. У працэсе стварэння БНР шырокія народныя масы ўдзелу не прымалі. Юрыдычнага афармлення ўтварэння БНР Рада не зрабіла. Яна не спадзявалася на падтрымку сялян, якія на выбарах ва Устаноўчы сход галасавалі за бальшавікоў і рускіх эсэраў, актыўна ўдзельнічалі ў фарміраванні савецкіх органаў улады. На I Усебеларускім з"ездзе сяляне актыўна выступілі супроць аддзялення Беларусі ад Савецкай Расіі. Таму Рада БНР, якая прыняла Акт ад 25 сакавіка 1918 г. аб незалежнасці Беларусі ад Расіі, пайшла як бы супроць іх волі. У стварэнні незалежнай беларускай дзяржавы не былі зацікаўлены германскія інтэрвенты, якія выношвалі планы захопа часткі тэрыторыі Беларусі. Утойваючы сваю сапраўдную мэту, яны не дазволілі скліканне на акупаванай імі тэрыторыі Устаноўчага сходу Беларусі, паколькі лічылі гэта парушэннем Брэсцкага міру.

Першым крокам дзейнасці Урада БНР было імкненне дабіцца свайго прызнання іншымі дзяржавамі. З гэтай мэтай была накіравана ў Кіеў да германскага пасла дэлегацыя з прапановай: 1. Прызнаць самастойнасць Беларусі. 2. Устанавіць з мясцовымі нямецкімі ўладамі адносіны, якія б дазвалялі БНР стварыць узброеныя сілы для ўмацавання сваёй улады на тэрыторыі Савецкай часткі Беларусі [2].

1 Турук Ф. Белорусское движение. Приложение № 21. С.115—116.
2 Там же. С.117—118.

Зварот урада БНР да Германіі быў адхілены. Улада Варонкі, паводле яго прызнання, была абмежавана толькі нацыянальным прадстаўніцтвам пры нямецкай акупацыйнай адміністрацыі і некаторымі іншымі другараднымі функцыямі. На пасланыя ў Берлін тры граматы БНР рэйхсканцлер паведаміў Народнаму Сакратарыяту, што Берлін разглядае Беларусь як частку Савецкай Расіі і што па Брэсцкім дагавору без урада Леніна прызнаць Беларускую дзяржаву Германія не можа [1].

У працівагу Радзе БНР, якую германскае камандаванне лічыла сацыялістычнай, у Мінску ўтварылася т.з. "Беларускае народнае прадстаўніцтва" [2] на чале з Р.Скірмунтам. БНП дамагалася атрымання з рук інтэрвентаў улады ў Беларусі і абяцала сваю дапамогу ў знішчэнні завоеў рэвалюцыі.

Рада і Народны Сакратарыят БНР звярнуліся да германскага імператара з тэлеграмай, у якой дзякавалі за вызваленне Беларусі, прасілі дапамагчы ў отваёванні яе дзяржаўнай незалежнасці ў саюзе з Германскай імперыяй [3].

Апублікаванне 3-й Статутнай граматы і пасылка тэлеграмы імператару Германіі выклікалі ў БНР востры палітычны крызіс. Раду пакінулі Гарадская група, прадстаўнікі Бунда, Аб"яднанай яўрэйскай сацыялістычнай партыі. Замест распаўшайся БСГ ўтварыліся Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў (БПС-Ф), Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р). Лідэрамі БСДП былі І.Ю. Лесік, С.А.Рак-Міхайлоўскі, А.Луцкевіч. Яе праграма прадугледжвала рэфармісцкае пераўтварэнне капіталістычнага ладу грамадства ў сацыялістычны. Задача нацыяналізацыі прамысловасці не ставілася. Зямлю меркавалася перадаць сялянам для арганізацыі на ей дробных працоўных гаспадарак. Памешчыкам меркавалася захаваць разумную норму карыстання зямлей. Выбоўвалася патрабаванне аб"яднання ўсей этнічнай тэрыторыі беларусаў у незалежнай БНР.

Кіруючае ядро БПС-Ф склалі: І.Я.Варонка, А.І.Цвікевіч, П.А.Крычэўскі, І.Н.Серада. Партыя патрабавала канфіскацыі

---

1 Варонка Я. Беларускі рух. Коўна. 1920. С.12.

2 Объединение консервативно настроенных помещиков, крупных чиновников, представителей духовенства Белоруссии.

3 Чырвоны шлях. № 1—2. С.12.

буйных землеўладанняў і стварэння на гэтай падставе "беларускага нацыянальнага зямельнага фонду", росту прамысловай вытворчасці і паступовай перадачы яе ў рукі народа.

Арганізатарамі БПС-Р былі: Ф.Грыб, П.Бадунова, Я.Трафімаў, І.Мамонька. БПС-Р прэтэндавала на авангардную ролю ў беларускім руху. Яна патрабавала ўстанаўлення "дыктатуры працоўных", сацыялізацыі зямлі, каапераравання сялянства, незалежнай Беларускай рэспублікі ў этнаграфічных межах. Пры станоўчых адносінах да акту 25 сакавіка 1918 г. аб абвяшчэнні незалежнасці яна настойвала на яго "крыдычным прызнанні" Усебеларускім Устаноўчым з"ездам.

Члены БПС-Р Грыб, Бадунова, Карач выйшлі са складу Народнага Сакратарыята, але разам з членамі Рады БНР М.Пашковічам, Н.Козічам, М.Шыла, І.Мамонька, Барташам, Няцевічам і інш. заставаліся ў Радзе, як непрымірымая апазіцыя. Пасля адстаўкі І.Серады і А. Смоліча члены Народнага Сакратарыяту, якія засталіся, склалі свае паўнамоцтвы.

Фарміраванне новага складу Народнага Сакратарыяту было даручана памешчыку Р.А.Скірмунту, які на пасяджанні Рады 9 ліпеня заявіў, што будзе працаваць "у цесным кантакце з акупантамі". Яго перагаворы з прадстаўнікамі партый працягваліся амаль 2 месяцы і не прывялі да станоўчага выніку. Палітычны крызіс паглыбляўся. Не знайшоў з яго выйсця і І.Серада, які пасля правалу місіі Скірмунта, спрабаваў сфарміраваць урад.

Пасля падпісання Савецкай Расіяй і Германіяй 27 жніўня Дадатковага дагавору, згодна якому германская армія вызваляла тэрыторыю Беларусі да р. Бярэзіны, надзеі БНР на ўмацаванне сваёй улады з дапамогай Германіі пачалі згасаць. Рада БНР у мэтах пошуку падтрымкі накіравала шэраг дэлегацый у Германію, Швейцарыю, ЗША на Міжсаюзніцкую нараду ў Ясах. Аднак яна не знайшла нідзе ўзаемаразумення. Антанта і ЗША не маглі прызнаць БНР, паколькі гэта сапсавала б умацаванню становішча Савецкай Расіі. БНР, якая ведала аб сімпатыях беларускага народа да Савецкай краіны, не магла ваюць барацьбу супраць краіны Саветаў. Яна баялася, што ажыццяўленне актыўнай антысавецкай палітыкі магло прывесці да падзення ўлады нацыянальнай буржуазіі. У сітуацыі, якая склалася, Англія, Францыя і ЗША палічылі за лепшае не прызнаваць БНР, пакінуць грамату адкрытай, мець вароты для ўваходу ў Савецкую Расію.

У мэтах умацавання свайго становішча Рада БНР 9 кастрычніка прыняла пастанову аб павялічэнні свайго складу да звыш 100 дэпутатаў за лік прадстаўнікоў праваслаўнага і каталіцкага духавенства, Народны Сакратарыят быў пераўтворан у Раду Народных Міністраў[1]. Новаўвядзенні не спрыялі росту палітычнага прэстыжу Рады БНР. Як і раней, яе падтрымлівалі толькі Саюз земляўладальнікаў і Мінскае аддзяленне Мікалаеўскага праваслаўнага брацтва[2]. Адносіны да Рады дробнабуржуазных партый прыкметна астылі, а народ яе зусім не заўважаў. Была зроблена спроба стварэння палітычнага цэнтру без Рады, на базе земстваў, сацыялістычных партый, прафесійных арганізацый і фарміравання на гэтай падставе органаў краявой улады[3]. Але кіраўнікі гэтых арганізацый не змаглі вырашыць пытанне аб уладзе. Прадстаўнікі левых арганізацый, якія расчараваліся крызісам БНР, схіліліся да сумеснай работы з Савецкай уладай. Раду БНР не падтрымлівалі таксама дробнабуржуазныя і буржуазныя слаі, якія працавалі ў земствах, гарадскіх думах, кааператывах, знаходзіліся ў згодніцкіх партыях[4]. Народ быў гатовы патрабаваць ад іх адказу за згодніцтва, або, як пісаў Я.Варонка. "паквітацца з імі"[5].

У абставінах адыходу арміі інтэрвентаў Рада Народных Міністраў БНР у 4-й Грамаце ад 29 лістапада 1918 г. заклікала беларускі народ да захавання парадку, які ўстанавіла Рада БНР. Новая Грамата не садзейнічала ўмацаванню становішча Рады. Уцякаючы ў Вільню, Рада і Урад БНР выдалі 5-ю Грамату, у якой заклікалі беларускі народ да выступлення супраць Савецкай улады.

Спроба беларускай буржуазіі здзейсніць нацыянальнае самавызначэнне на буржуазна-дэмакратычнай аснове поспехам не ўвянчалася, яе крок да саюза з буржуазна-памешчыцкімі і клерыкальнымі партыямі і арганізацыямі яшчэ больш ускладніў крызіс. Даверыцца сацыялістычным партыям нацыянальная буржуазія не магла. У сацдэмакратаў была магчымасць знайсці выхад з крызісу, але акружэнне Рады не магло адказаць ад палітычнага курса, які праводзіўся.

---

1 Варонка Я. Беларускі рух. С.14.

2 Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Т.I. С.339.

3 Там жа. С.341.

4 Варонка Я. Беларускі рух. С.14.

5 ЦДАКР БССР. Ф.4. воп.I, спр. 93, л.62,202, 266.

і найоці на пагадненне з Савецкай Расіяй. Шанц, які з"явіўся, быў упушчаны. Калі ў лістападзе 1918 г. пачалася эвакуацыя нямецкіх войск, рабочыя ў саюзе з працоўным сялянствам, згуртаваліся пад сцягам Савецкага ладу, бралі ўладу ў Беларусі ў свае рукі.

Амерыканскі спецыяліст на нацыянальнаму руху ў Расіі гісторык Рычард Пайпс пісаў, што "акт аддзялення Беларусі ў 1917 г. быў актам эфемерным, пазбаўленым у той час палітычнага значэння, У адрозненне ад нацыяналістаў на Украіне і ў некаторых іншых раёнах Расійскай імперыі, беларускія нацыяналісты не мелі падтрымкі ў народа" .

На працягу шэрагу гадоў лідэры беларускага нацыянальнага руху гэтых абставін не бачылі, а даклады — не хацелі бачыць. Спатрэбіліся гады, каб зразумець памылковасць свайго шляху і прыняць пастанову аб ліквідацыі ўрада, які яны пралетаўлялі. У выніку абсалютная большасць дзеячоў вярнуліся ў БССР і ўключыліся ў будаўніцтва новага жыцця.

Створаная ў неспрыяльных умовах без шырокага ўдзелу і падтрымкі народа, яна амаль не мела шанцаў на развіццё і ўмацаванне. Нават такія вопытныя палітыкі, як Варонка, Скірмунт, Серада і інш. не знайшлі сродкаў для яе выжывання. Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. знішчыла германскую імперыю і падзеі БНР на яе падтрымку. Урад Пілсудскага і Літоўская Тарыба ў хуткім часе згубілі ўсялякі інтарэс да БНР. Антанта і ЗША зусім забылі пра яе: Ніхто не даваў грошай на ўтрыманне міністраў. У становішчы наступіўшага міру ўсе заняліся сваімі справамі.

Перамога лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі стварыла ў заходняй частцы Савецкай Расіі новае палітычнае становішча. Урад РСФСР анулявау Брэсцкі мірны дагавор. У вызваленых ад германскай акупацыйнай арміі раёнах аднаўлялася Савецкая ўлада. У тэлеграме Главкаму І.І.Вацэцісу ад 29 лістапада 1918 г. У.І.Ленін пісаў: "З прасоўваннем нашых войск на Захад і на Украіну ствараюцца абласныя часовыя Савецкія ўрады, якія павінны ўмацоўваць Саветы на месцах. Гэта становішча мае той добры бок, што аднімае магчымасць у шавіністаў Украіны, Літвы, Латвіі, Эстлядзі разглядаць рух нашых часцей як акупацыю і стварае спрыяльную

атмасферу для далейшага прасоўвання нашых войск" [1].

У пастанове УЦВК аб анулявanні Брэсцкага міру было падкрэслена, што працоўныя масы Расіі, Ліфляндыі, Эстляндыі, Польшчы, Літвы, Украіны, Фінляндыі, Крыма, Каўказа атрымалі магчымасць самім вырашаць свой лёс" [2].

Як у тэлеграме У.І.Леніна Ватыцыну, так і ў пастанове УЦВК аб анулявanні Брэсцкага міру не ўзамацнялася Беларусь. Гэта невыпадкова. Перспектыва Беларусі ставілася у залежнасць ад рэвалюцыйных падзей у Польшчы і Літве. Са звароту краёвага камітэта КП(б) Заходняй Беларусі і Літвы і Цэнтральнага выканаўчага Камітэта польскіх камуністычных груп у Расіі [3] "Да працоўных мас Беларусі" можна меркаваць, што ЦК РКП(б) праводзіў лінію на максімальнае выкарыстанне рэвалюцыйнай энергіі беларускага народа ва ўсеагульнай барацьбе з польскімі і літоўскімі працоўнымі, не абмяжоўваў яе толькі ўпарадкаваннем "сваіх беларускіх спраў". Але пасля контррэвалюцыйнага перавароту ў Польшчы ўладу захапілі рэакцыйныя сілы. Гэта паказала, што рэальных умоў для рэвалюцыі ў Польшчы не было. Антанта і ЗША актыўна рыхтавалі у Савецкую Расію новую інтэрвенцыю, у якой роля асноўнай сілы адводзілася буржуазнай Польшчы.

У такіх абставінах ў мэтах абароны рэвалюцыі ў Расіі, ЦК РКП(б) і Савецкі Ўрад прызналі неабходным утварыць уздоўж заходняй граніцы ланцуг савецкіх рэспублік. Да канца 1918 г. ужо былі створаны Эстонская, Латвійская, Літоўская рэспублікі, годам раней— Украінская рэспубліка. Але ў гэтым ланцугу не хапала аднаго звяна— Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Аднак да гэтага моманту ў ЦК РКП(б) і Савецкім уладзе пункт гледжання аб шляхах вырашэння беларускага пытання яшчэ не выспеліўся. Да пытання аб самавызначэнні Беларусі прымяшвалася палітыка, якую праводзіў ЦК РКП(б) у мэтах экспарту рэвалюцыі ў заходнія краіны. У ЦК РКП(б) пакуль не было дастатковых падстаў лічыць, што ў Польшчы адсутнічаюць умовы для пралетарскай рэвалюцыі. Такі выпад быў зроблены толькі ў трэцяй дэкадзе снежня. Тады з маланкавай хуткасцю разгарнуўся працэс вырашэння беларускага пытання.

---

1 Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т.37. С.237.

2 Советско-германские отношения. Сб. документов. 1917—1918 гг. М., 1968. Т.I. С.679, 680.

3 ЦА ЕМЛ при ЦК КПСС. Ф.17, воп.4, спр. 38, л.13.

Ваенна-палітычнае становішча патрабавала ўтварэння БССР, каб зачыніць тым самым акно для пранікнення імперыялістычных сіл непасрэдна на тэрыторыю БССР. ЦК РКП(б) меркаваў, што ўтварэнне БССР менавіта ў гэты час будзе садзейнічаць умацаванню становішча Савецкай краіны, абароне рэвалюцыі і Савецкай улады.

Вядома, што ў канцы 1918 г. — пачатку 1919 г. галоўным у дзейнасці ЦК РКП(б) і Савецкага ўрада было не сацыялістычнае будаўніцтва, а мабілізацыя ўсіх сіл для выдзення рэвалюцыйнай вайны, у якой вырашаўся лес Кастрычніцкай рэвалюцыі. Па свайму характару гэта барацьба была не ўнутранай, а міжнароднай. Уся палітыка партыі бальшавікоў і Савецкага ўрада на чале з Леніным была накіравана на абарону любымі сродкамі Савецкай улады. Улічваючы гэта VI абласная канферэнцыя бальшавікоў лічыла неабходным "абвясціць самастойную сацыялістычную рэспубліку Беларусь..." [1] Маніфест аб абвяшчэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі быў абнародаваны ў ноч з 1 на 2 студзеня 1919 г. У лютым 1919 г. пачалося ўварванне польскіх інтэрвентаў на беларускія землі. Польшча прэтэндавала на Віленскую, Гродзенскую і Мінскую губерні. Тэрыторыя Беларусі зноў станавілася тэатрам ваенных дзеянняў, яна падпадала пад цяжкую і працяглую акупацыю.

2—3 лютага 1919 г. Усебеларускі з"езд Саветаў адобрыў утварэнне БССР, а таксама прыняў пастанову аб яе аб"яднанні з Літвой.

Да сярэдзіны ліпеня 1919 г. 3/4 тэрыторыі Літоўска-Беларускай ССР былі акупаваны інтэрвентамі. 16 ліпеня СНК ЛітБел спыніў сваю дзейнасць, кіраванне свабоднымі паветамі перадаў Мінскаму губрэўкаму.

У ходзе барацьбы за вызваленне савецкай тэрыторыі ад польскіх інтэрвентаў да вясны 1920 г. склаліся новыя абставіны. У мэтах хутчэйшага завяршэння вайны, пераходу працоўных да мірнага жыцця Урад РСФСР 12 ліпеня 1920 г. падпісаў з буржуазнай Літвой мірны дагавор. У 1919 г. былі разгромлены сілы Калчака, Дзянікіна, Юдзеніча, напярэдадні разгрома знаходзіліся войскі Урангеля. У Савецкай улады з"явілася магчымасць умацаваць Заходні фронт і вызваліць тэрыторыі Беларусі і Украіны.

У час летняга наступлення Чырвонай Арміі была вызвалена амаль уся тэрыторыя Беларусі, на якой да канца ліпеня 1920 г. была адноў-

---

[1] Образование СССР. Сб. документов. М.-Л. 1949. С.114.

лена Савецкая ўлада. Паколькі Літоўска-Беларускай ССР ужо не існавала, Цэнтральны Камітэт КП(б)Л і Б, ЦК Беларускай камуністычнай арганізацыі, ЦК Бунда, ЦБ прафсаюзаў г. Мінска і Мінскай губерні 31 ліпеня на ўрачыстым пасяджэнні прынялі Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі Беларусі.

Толькі ў канцы 1925 г. у колах БНР усталявалася думка аб прызнанні БССР беларускай нацыянальнай дзяржавай. Прычым па гэтаму пытанню ў іх тады не было адзінства. Большасць пайшла на самароспуск урада БНР і прызнанне БССР адзінай беларускай нацыянальнай дзяржавай, а меншасць засталася за мяжой і працягвала праводзіць ранейшую лінію.

Беларуская інтэлігенцыя, якая з"яўлялася ініцыятарам нацыянальнага руху, у сваёй пераважнай большасці тады яшчэ не разабралася ў сутнасці Кастрычніцкай рэвалюцыі і таму не магла правільна вызначаць сваю пазіцыю да тых падзей, якія ў той час адбываліся. Яна памылялася і бачыла адзінае выйсце з паслякастрычніцкай сітуацыі ў адрыве Беларусі ад Савецкай Расіі і стварэнні нацыянальнай буржуазна-дэмакратычнай дзяржавы. І толькі паражэнне праціўнікаў Кастрычніка ў грамадзянскай вайне, крах антысавецкай імперыялістычнай інтэрвенцыі, правал планаў стварэння буржуазна-дэмакратычнай беларускай дзяржавы прыцягнулі многіх інтэлігентаў, адкрылі ім магчымасць вяртання у Савецкую краіну. Яе горкі вопыт пераканаў, што без свайго народа, без штодзённай сувязі з ім, нічога з таго, што заслугоўвала б увагі, яна не магла стварыць. Былі і такія, хто вяртанню ў Савецкую Беларусь аддалі перавагу блуканням па задворках Германіі, Англіі, Францыі, ЗША.

Тэма 19. ВА УМОВАХ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

Вучэбныя пытанні. 1. Увядзенне НЭПа як адказ на запатрабаванні жыцця. 2. Аднаўленне сельскай гаспадаркі. Землеўпарадкаванне. Развіццё кааперацыі. 3. Аднаўленне прамысловасці. Роля прыватнага капіталу. 4. Вяртанне БССР усходніх тэрыторый. 5. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. Грамадска-палітычнае жыццё. 6. Палітыка беларусізацыі. 7. Развіццё культуры і навукі.

Становішча Беларусі пасля імперыялістычнай вайны, Кастрычніцкай рэвалюцыі, замежнай ваеннай інтэрвенцыі было вельмі цяжкім. Разарэнне дайшло да таго, што амаль не працавалі цэлыя галіны прамысловасці; фарбрычна-заводскае жыццё фактычна было паралізавана. У заняпад прыйшоў транспарт. На Заходняй чыгунцы колькасць неспраўных паравозаў дасягала да 40%, а пасажырскіх вагонаў перавысіла 80%. Не лепшым было становішча у сельскай гаспадарцы, прадукцыя якой складала менш паловы даваеннай. Запусцелі значныя абшары зямлі, была страчана вялікая колькасць жывёлы, рэзка знізілася не прадуктыўнасць.

У гэтых умовах аднаўленне гаспадаркі было надзвычай складанай справай. Катастрафічнае становішча назіралася ва усёй дзяржаве. Да таго ж эканамічныя цяжкасці перапляталіся з палітычнымі. Найбольш значным папярэджаннем аб вострым сацыяльна-эканамічным і палітычным крызісе было Кранштадтскае паўстанне, якое адбылося у лютым-сакавіку 1921 г. Яго удзельнікі выступілі супроць партыйнай дыктатуры, засілля бюракратаў, заклапочаных сваім уласным становішчам, за перадачу у рукі працоўнага народа кіравання краінай, за уладу Саветам, а не партыі. Паўстанцы патрабавалі правесці перавыбары Саветаў, забяспечыць свабоду слова і друку для рабочых і сялян, свабоду сходаў, прафесійных саюзаў, сялянскіх аб'яднанняў. Кранштадтскае паўстанне разам са шматлікімі іншымі выступленнямі супроць савецкай улады паказала, што палітыка ваеннага

камунізму прыйшла ў глыбокае супярэчанне з інтарэсамі працоўных.

Бачачы такое становішча, кіраўнік бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы У.І.Ленін прапанаваў прынцыповую змену палітычнага курса. Гэта знайшло ўвасабленне ў новай эканамічнай палітыцы, якую адобрыў у сакавіку 1921 г. X з'езд РКП(б). Яна, у прыватнасці, прадугледжвала замену харчовай развёрсткі, па якой ад сялян забіраліся усе лішкі прадуктаў, на падатак, пасля выплаты якога селянін мог сам распараджацца астатняй часткай прадукцыі. Быў прадугледжаны пераход ад прадуктаабмену да тавара-грашовых, рынкавых адносін. Важнае значэнне надавалася развіццю гандлю. У эканоміцы дапускалася выкарыстанне розных сацыяльна-эканамічных укладаў, прыватнага капіталу, ствараліся прыватныя прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы. У сельскай гаспадарцы маглі выкарыстоўвацца арэнда зямлі і наёмная праца. Гэтыя і іншыя нововядзенні пры захаванні эканамічных і палітычных камандных высот у руках савецкай дзяржавы павінны былі забяспечыць хуткае і бязбалючае аднаўленне сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці. У народзе гэтую прынцыповую змену ў палітыцы сустрэлі прыхільна, хаця многія партыйна-савецкія апаратчыкі былі незадаволены.

Аднаўленне эканомікі ў першую чаргу пачыналася з сельскай гаспадаркі. Асноўнай мэтай тут было павялічэнне вытворчасці прадуктаў харчавання і сыравіны для адпаведных галін прамысловасці. Важнай задачай было правядзенне вясенняга севу 1921 г. Нягледзячы на вялікія цяжкасці, у Беларускай ССР удалося засеяць 80% даваеннай плошчы.

Шмат увагі надавалася упарадкаванню землекарыстання на аснове законаў савецкай улады і у першую чаргу "Дэкрэта аб зямлі", прынятага II Усерасійскім з'ездам Саветаў. У выніку праведзенай работы сялянства БССР павялічыла сваё землекарыстанне у межах рэспублікі 1925 г. больш чым на 1 млн.дзесяцін. Сярэдні памер гаспадаркі узрос з 8,9 дзес. у 1917 г. да 10,3 дзес. у 1925 г. А тыя гаспадаркі, якія атрымалі зямлю, павялічыліся на 3-4 дзесяціны. Была адоле-

чака свабода выбару форм землекарыстання.

У адрозненне ад сталыпінскай аграрнай рэформы пры землеупарадкаванні у ходзе 20-х гадоў праводзілася дадатковае надзяленне зямлёй сялян за кошт не перараэмеркавання. З гэтай мэтай быў створаны спецыяльны зямельны фонд, які налічваў у пачатку 1926 г. больш за 0,5 млн.дзес. зямлі. Народны камісарыят земляробства БССР, які у той час узначальваў Зм.Ф.Прышчэпаў, праводзячы гэтую працу, улічваў у першую чаргу інтарэсы развіцця сельскай гаспадаркі і самих сялян, а не кулакоў, у чым яго потым абвінавачвалі.

У ходзе землеупарадкавання 20-х гадоў у Беларускай ССР на хутары выйшла каля 13% сялян -- фактычна столькі ж, колькі і у час правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы. Такім чынам, да 1929 г. агульная колькасць сялян, якія выйшлі на хутары і адрубы склала у рэспубліцы чвэрць усіх гаспадарак.

Асаблівасцю развіцця беларускай вёскі у гэты час была аграрная перанаселенасць. У мэтах яе аслаблення, забеспячэння прамысловасці рабочай сілай, асваення усходніх зямель Саюза ССР праводзілася перасяленне вясковых жыхароў у раёны Сібіры і Далёкага Усходу. Толькі на працягу 1925--1928 гадоў з БССР выехала каля 75 тыс.чалавек. Але істотнага уплыву на змяншэнне аграрнага перанасялення гэта не аказала.

Атрымала распаўсюджанне выкарыстанне у вёсцы наёмнай рабочай сілы. У 1929 г. у сельскай і лясной гаспадарцы БССР працавала звыш 88 тыс.наёмных работнікаў. Што датычыць арэнды зямлі, то ёю у 1927 г. карысталіся 11% сялянскіх гаспадарак -- бядняцкіх, серадняцкіх, заможных.

Сацыяльна-эканамічная палітыка савецкай улады прывяла да значных сацыяльных змен на вёсцы. Ужо у першыя яе гады у выніку жорсткай класавай палітыкі рэзка зменшылася колькасць заможных сялян-кулакоў. Калі выходзіць з наяўнасці плошчы пасеваў, то іх удзельная вага да канца 1920 г. паменшылася у БССР з 10 да 2% ад агульнай колькасці сялян. У выніку гэтага працэсу, а таксама таго, што частка сераднякоў стала жыць лепш, павялічылася серадняцкая праслойка вёскі. У канцы 1927 г. сераднякі у рэспубліцы складалі 46,5%, сераднякі -- 51%, кулакі -- 2,5% агульнай колькасці сялян.

Сераднякам належала 60% плошчы пасеваў і 66% сродкаў вытворчасці. Серадняк стаў асноўнай фігурай на вёсцы.

Пад канец 20-х гадоў у сувязі з хлебным крызісам і аб'яўленым курсам на калектывізацыю да заможных сялян былі прыменены жорсткія надзвычайныя меры. За ўкрывальне збожжа ў іх канфіскоўвалася маемасць, практыкавалася індывідуальнае абкладанне і г.д. У выніку колькасць заможных гаспадарак у рэспубліцы зменшылася да 2%. Адмоўную ролю адыграла і тое, што чвэрць канфіскаванага ў кулакоў хлеба маглі атрымоўваць беднякі, калі яны дапамагалі ў яго выкрыцці. Гэта разбэшчвала частку беднаты, арыентавала яе не на працу, а на даносы, што адпавядала сталінскай палітыцы размежавання сялянства.

У 20-я гады значны размах у беларускай вёсцы насыў кааператыўны рух. У першую чаргу ён ішоў па шляху сумеснай вытворчасці ў некаторых галінах дзейнасці, стварэння невялікіх прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Пад канец 1929 г. у рэспубліцы налічвалася звыш 3,8 тыс.сельскагаспадарчых таварыстваў, якія аб'ядноўвалі больш 740 тыс.членаў. Пераважалі тут меліяратыўныя таварыствы, насенныя, машынныя, жывелагадоўчыя, крэдытныя і інш. Хаця партыйна-дзяржаўныя органы пад канец 20-х гадоў нярэдка абмяжоўвалі даны накірунак кааператыўнага руху, тым не менш імкненне сялян да прасцейшых форм кааперавання прыдало яму значны размах.

Але тыя ж органы актыўна працавалі над тым, каб развіваць больш складаныя формы кааперацыі, калектыўныя гаспадаркі: камуны, сельскагаспадарчыя арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі. Яны адрозніваліся паміж сабою па ступені абагульнення сродкаў вытворчасці, арганізацыі працы, характару размеркавання даходаў.

Развіццё калектыўных форм гаспадарання не было паступальным. Калі у 1921 г. на беларускіх землях (у межах БССР 1925 г.) налічвалася 710 калектыўных гаспадарак, то у 1924 г. іх колькасць скарацілася да 324, а у 1928 г. у межах усей рэспублікі дасягнула 611. У 1927 г. у Беларускай ССР было таксама 227 саўгасаў. Удзельная вага калгасна-саўгаснага сектара у гэты час была нязначнай. Яна не пера-

вышала 1% і па пасяўных плошчах, і па вытворчасці прадукцыі. Беларуская вёска з'яўлялася у гэты час амаль паўсюдна аднаасобнай.

Аднаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці у БССР адбылося на працягу першай паловы 20-х гадоў. Гэта датычыць памераў пасяўной плошчы, ураджайнасці і валавых збораў культур. На працягу 1925--1928 гг. сярэдняя ўраджайнасць збожжавых павысілася да 7,4 ц супроць 6,5 ц у 1910--1915 гг. Сярэдні збор ільбы за гэты час узрос з 74 да 87 ц. Больш значнымі былі вынікі у жывёлагадоўлі — павялічылася пагалоўе жывёлы, узрасла яе прадукцыйнасць.

Аднак эканамічнае і сацыяльнае развіццё беларускай вёскі у 20-я гады мела і іншыя тэндэнцыі. У прыватнасці, на працягу 1918--1927 гг. колькасць сялянскіх гаспадарак у БССР (у межах 1925 г.) павялічылася з 540 да 688 тыс., а сярэдняя колькасць зямлі у іх нягледзячы на землеўпарадкаванне і надзяленне беднякіх гаспадарак зямлёю паменшылася з 11,3 да 9,9 га. Пад канец 20-х гадоў запаволіліся тэмпы сельскагаспадарчага развіцця, хаця магчымасці індывідуальнага гаспадарання не былі вычарпаны.

Тым не менш у снежні 1927 г. XV з'езд УКП(б) паставіў у якасці асноўнай задачы на вёсцы аб'яднанне дробных індывідуальных гаспадарак у буйныя калектывы. Актыўна пачалі стварацца машынныя таварыствы, хоць у 1929 г. у БССР налічвалася толькі 237 трактароў. У сувязі з курсам на калектывізацыю яшчэ больш жорсткай стала палітыка у адносінах да заможных сялян. У 1928 г. 11,5% сялянскіх гаспадарак плацілі падатак з працэнтнай надбаўкай, а 0,4% былі абкладзены у індывідуальным парадку. На іх долю прыпадала амаль палова агульнай сумы падаткаабкладання. У наступным годзе колькасць індывідуальна абкладзеных гаспадарак дасягнула у рэспубліцы 2%. Натуральнае развіццё сельскай гаспадаркі усё больш парушалася.

Ажыццяўленне новай эканамічнай палітыкі давала нядрэнны плён і у іншых галінах гаспадаркі. У адносінах да прамысловасці палітыка савецкай дзяржавы у пачатку 20-х

гадоў у значнай ступені была скіравана на падтрымку дробнай вытворчасці, здольнай у кароткі тэрмін ліквідаваць таварны голад, пашырыць тавараабарот паміж горадам і вёскай. Агульнае цяжкае становішча гарадоў дапаўнялася палітычным крызісам. Вялікімі намаганнямі савецкай улады і насельніцтва ён паступова пераадольваўся.

Важным мерапрыемствам была грашовая рэформа. Яе неабходнасць была выкліканa тым, што за час рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і замежных інтэрвенцый грошы моцна абясцэніліся. У лютым 1922 г. даваенны залаты рубель адпавядаў 150 тыс.савецкіх. Заработная плата замест 20-30 руб. у даваенны час у многіх выпадках стала перавышаць мільён рублёў. Неверагоднымі сталі цэны на прадукты і тавары першай неабходнасці. Вельмі ўзрасла эмісія грошай. Неймаверных памераў дасягнула інфляцыя. Выхад быў знойдзены ў тым, што у 1923--1924 гг. адбыўся пераход да чырвонца, які меў высокую пакупную здольнасць.

Гэта з'явілася асновай для аздараўлення гаспадаркі, павышэння прадукцыйнасці працы, якая у пачатку 20-х гадоў складала у прамысловасці 10-30% ад даваеннай. Да таго ж масавым стала раскраданне сыравіны і гатовых вырабаў. На многіх прадпрыемствах рэспублікі крадзёж складаў ад 25 да 40% вытворчасці. Цяжкае эканамічнае становішча ускладнялася палітычным і крымінальным бандытызмам, асабліва у заходніх раёнах рэспублікі, дзе з тэрыторыі буржуазна-памешчыцкай Польшчы закідваліся шматлікія банды. Аднаўленне прамысловасці у першую чаргу адбывалася шляхам разгортвання працы прыватных прадпрыемстваў. У 1925 г. у гарадах і гарадскіх пасёлках БССР налічвалася каля 10 тыс. такіх прадпрыемстваў. Новая эканамічная палітыка прадугледжвала і адпаведныя адносіны да прыватнага капіталу. Дэкрэтам СНК СССР ад 17 мая 1921 г. аб'яўлялася падтрымка дробных прыватных і кааператыўных саматужных прадпрыемстваў. Залішняя рэгламентацыя і фармалізм, якія асмяжоўвалі гаспадарчы пачын асобных прадпрымальнікаў і груп насельніцтва, абвяшчаліся недапушчальнымі.

На гэтай заканадаўчай аснове прадпрымальніцкі рух у савецкай Беларусі дасягнуў значнага размаху. У 1926 г. у

рэспубліцы налічвалася звыш 60 тыс.дробных прамысловых прадпрыемстваў, на якіх было занята больш 100 тыс.чалавек. Але паступова падаткавы націск на прыватныя прадпрыемствы узрастаў. Ужо 8 верасня 1926 г. СНК СССР пастанавіў максімальна ўзмацніць абкладанне прыватнага капіталу, перайсці да абмежавання дробнай вытворчасці і гандлю. Гэта азначала наступленне на новую эканамічную палітыку.

Аднак плён ад яе дзеяння быў відавочным. На працягу 1924--1928 гг. вытворчасць прамысловай прадукцыі ўзрасла у БССР у 2,3 раза. У 1926/27 гаспадарчым годзе завяршуся працэс аднаўлення прамысловасці. Найбольш дынамічна развіваліся тарфяная, металаапрацоўчая галіны і электраэнергетыка. Палепшылася матэрыяльнае становішча і умовы жыцця рабочых. Паступова лепшы выгляд набывалі гарады і гарадскія пасёлкі.

Важнымі падзеямі у жыцці беларускага народа у 20-я гады было вяртанне БССР тых усходнебеларускіх тэрыторый, якія вясною 1919 г. па ваенна-палітычных меркаваннях былі уключаны у склад РСФСР. Пры гэтым этнічныя і нацыянальныя асаблівасці, інтарэсы беларускага народа пад увагу не прымаліся.

Ужо з пачатку 20-х гадоў перадавыя дзеячы культуры і беларускага нацыянальнага руху усё больш настойліва ўздымалі пытанне аб пераадоленні данай несправядлівасці. Гэта знайшло падтрымку у перадавых кіруючых работнікаў, у першую чаргу кіраўнікоў-беларусаў А.Р.Чарвякова, У.М.Ігнатоўскага і іншых. Затым у вырашэнне данай справы уключыліся партыйныя і дзяржаўныя органы БССР.

У выніку абмеркавання праблемы у партыйных і савецкіх структурах розных узроўняў як БССР, так РСФСР і СССР было вырашана вярнуць савецкай Беларусі 15 паветаў і некаторыя асобныя валасці Віцебскай, Гомельскай, Смаленскай губерняў, якія з'яўляліся этнаграфічна роднаснымі беларускімі землямі. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася больш чым у 2 разы і склала 110584 кв.км. Колькасць насельніцтва дасягнула 4,2 млн.чалавек. Беларусы сярод іх складалі 70,4%. Гэтае павелічэнне памераў рэспублікі адбылося у 1924 г.

Але цэнтральнае дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва Саюза ССР не пайшло на больш поўнае вырашэнне данага пытання. У першую чаргу гэта датычылася паўднёва-усходняй часткі Беларусі, хаця Гомельскі губернскі з'езд Саветаў яшчэ у снежні 1923 года падтвердзіў рашэнне губвыканкома аб далучэнні да БССР Гомельскага, Рэчыцкага і іншых паветаў. ЦК КП(б)Б даволі настойліва ставіў пытанне аб як мага больш поўным вырашэнні данай праблемы. У выніку пэўных меркаванняў і узгадненняў палітбюро ЦК УКП(б) 18 лістапада 1926 года вырашыла лічыць даказаным беларускі характар насельніцтва Гомельскага і Рэчыцкага паветаў і прызнала неабходным далучыць іх да БССР.

Урады Расійскай федэрацыі і Украінскай ССР пагадзіліся з гэтым. У выніку тэрыторыя савецкай Беларусі павялічылася яшчэ на 15727 кв.км, а насельніцтва — на 649 тыс.чалавек. Да БССР адышлі мясцовасці з адносна развітой прамысловасцю, а таксама важны сельскагаспадарчы раён.

Вяртанне БССР тэрыторый на усходзе значна узмацніла эканамічны патэнцыял савецкай Беларусі. Павысілася яе вага у эканоміцы краіны. Большымі сталі магчымасці культурнага развіцця беларускага этнасу. Быў зроблены важны этап у працэсе аб'яднання беларускай нацыі, але гэта было завершана толькі у верасні 1939 г.

Асаблівасцю грамадска-палітычнага жыцця Беларускай ССР у пачатку 20-х гадоў было тое, што у рэспубліцы, як і ва ўсім СССР, усталявалася аднапартыйная сістэма. Гэта было адным з асноўных фактараў, якія прывялі да фарміравання адміністрацыйна-камандnай сістэмы, культу асобы, сталінскага дыктатарскага рэжыму.

Усталяванне аднапартыйнай сістэмы з'явілася не столькі вынікам унутранага развіцця грамадства, колькі мэтанакіраванай палітыкай і імкненнем кампартыі да адзінаўладдзя. З гэтаю мэтаю рабіўся націск на іншыя партыі і грамадска-палітычныя рухі. У сакавіку 1921 г. адбылася самаліквідацыя Бунда і частка яго членаў улілася у КП(б)Б. Але найбольш уплывовай палітычнай сілай у БССР з'яўлялася Бела-

руская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ЭПС-Р). У пачатку 1921 г. яна налічвала звыш 20 тысяч членаў і больш чым у 4 разы перавышходзіла колькасны склад кампартыі Беларусі. Яна мела сваю структуру, кантралявала дзейнасць адпаведнай маладзёжнай арганізацыі.

КП(б)Б прыняла жорсткія меры для ліквідацыі такога становішча. Згодна з рашэннем цэнтральнага бюро кампартыі Беларусі у пачатку 1921 г. ЭПС-Р падверглася фактычна разгрому. 860 актыўных яе членаў былі арыштаваны. Над імі адбыўся шэраг судовых палітычных працэсаў. Гэта з'явілася рашаючым крокам да ўсталявання у БССР аднапартыйнай сістэмы.

Даныя палітычныя змены ускладнілі становішча дзеячоў Беларускай Народнай Рэспуолікі (БНР), якія знаходзіліся у эміграцыі. Да таго ж на іх пазіцыю уплывалі і тыя зрухі у гаспадарчым і нацыянальна-культурным будаўніцтве, якія адбываліся у БССР. Сваю ролю адыграў і той факт, што у ліпені 1923 г. сумесным дэкрэтам Цэнтральных Выканаўчых Камітэтаў СССР і БССР была аб'яўлена амністыя усім удзельнікам нацыянальных арганізацый і фарміраванняў, якія мелі месца у першыя гады савецкай улады. Улічваючы ўсё гэта, у кастрычніку 1925 г. на нарадзе у Берліне частка дзеячоў БНР аб'явіла аб роспуску сваіх палітычных цэнтраў і спыненні барацьбы з савецкай уладай. Яны прызналі, што БССР як палітычная рэальнасць стала месцам кансалідацыі беларускага народу, адраджэння яго культуры, а Мінск з'яўляецца адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага аднаўлення Беларусі. Тыя дзеячы БНР (І.Ю.Лёсік, В.Ю.Ластоўскі, А.І.Цвікевіч і інш.), якія вярнуліся у БССР нямала зрабілі для развіцця беларускай культуры, але затым сталі ахвярамі сталінскага беззаконня.

Між тым КП(б)Б умацоўвала і павялічвала свае шэрэнгі. Калі на пачатак 1922 г. яна налічвала 4834 чалавекі, то на 1 студзеня 1929 г. — 38881. У мэтах захавання адзінства, умацавання пралетарскай асновы сістэматычна праводзіліся партыйныя чысткі. У час адной з іх, якая адбылася у 1921 годзе, колькасць выключаных з КП(б)Б дасягнула амаль 20%. Менш жорсткай была праверка членаў і кандыдатаў у члены КП(б)Б невытворчых ячэек, якая адбылася у 1924 г.

Павелічэнне партыйных радоў не спынілася і у сувязі з партыйнай чысткай 1929 г. У ходзе яе з КП(б)Б было выключана 3717 чалавек. За непрацяглы час на іх месцы было прынята больш чым 10 тыс.прадстаўнікоў рабочага класа, сялянства, інтэлігенцыі. Але выключаныміз партыі у гэты час аказаліся прыхільнікі новай эканамічнай палітыкі, хто не падзяляў сталінскае разуменне 1929 года як "года вялікага пералому"г Сярод выключаных былі і тыя, каго можна было аднесці да прыхільнікаў правага ўхілу ці да так званых беларускіх нацыянал-дэмакратаў. Гэтая чыстка сведчыла аб нарастанні аўтарытарных метадаў кіравання у партыі і дзяржаве.

Адносіны да новай эканамічнай палітыкі у кампартыі Беларусі былі фактычна дваякімі: з аднаго боку яна вымушана была, падпарадкоўваючыся партыйнай дысцыпліне, праводзіць яе у жыццё, а зругога — шмат хто з яе кіруючых работнікаў адмоўна адносіўся да нэпа. Гэта нават знаходзіла адлюстраванне у партыйных рашэннях рэспубліканскага узроўню.

Асцярожна, але усё больш настойліва КП(б)Б умешвалася у грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі. Найбольш яркае выражэнне гэта атрымала у канцы 20-х гадоў у сувязі з барацьбой з так званым правым ухілам. Погляды М.Бухарына, А.Рыкава, М.Томскага у Беларусі падзялялі нарком земляробства Зм.Прышчэпаў, вядомыя беларускія дзеячы Г. і М.Гарэцкія, С.Ждановіч, І.Кіслякоў, Я.Лабаноўскі, А.Смоліч і інш. Па сутнасці іхнія падыходы былі альтэрнатывай у вырашэнні праблемы далейшага развіцця вёскі. Але разгром "правага ухілу" ліквідаваў гэтую альтэрнатыву. У парадак дня быў пастаўлены толькі сталінскі падыход.

Грамадска-палітычнае жыццё у БССР у пачатку 20-х гадоў характарызавалася намерам кампартыі "ажывіць дзейнасць Саветаў". Але гэтая палітыка і некаторыя спробы яе практычнай рэалізацыі мелі больш дэкларатыўны характар, таму што сапраўдная актывізацыя дзейнасці Саветаў прывяла б да іх супрацьстаяння з партыйнымі органамі, якія фактычна імкнуліся да адзінаўладдзя. Дзейсныя Саветы патрэбны былі пар-

ны толькі як актыўныя выканаўчыя органы яе палітыкі.

Шмат увагі надавалася павышэнню удзелу працоўных у выбарах Саветаў. Спачатку гэты удзел быў нязначным. У выбарчай кампаніі 1924 г. удзельнічала 35,47% выбаршчыкаў. Пры гэтым у 50 раёнах рэспублікі удзел быў меншым, чым 35%, ау 17 раёнах ён не перавысіў 15%. Але ужо у паўторных выбарах, якія былі праведзены у 1925 г. у 737 Саветах з 1208, якія меліся у рэспубліцы, прынялі удзел 42,6% выбаршчыкаў. Выбары 1926—1927 гг. далі яшчэ больш значныя вынікі: толькі у вёсках у іх удзельнічала 46,3% выбаршчыкаў.

Пад канец 20-х гадоў партыйны, адміністрацыйна-камандны націск у час справаздачна-перавыбарных кампаній Саветаў значна узмацніўся. У 1929 г. яўка на выбары у гарадах БССР дасягнула 79,2%. У сельскай мясцовасці гэты паказчык раўняўся 58,7%. Як бачым, справа ішла да усеагульнага удзелу у галасаванні. Асновы гэтага былі закладзены пад канец 20-х гадоў.

Усё узрастаючую ролю у сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным развіцці павінны былі выконваць прафсаюзы і камсамол. Іх рады паступова папаўняліся. Калі у пачатку 1926 г. у БССР налічвалася 150 тыс.членаў прафсаюза, то пад канец 1928 г. — амаль 237 тыс. Камсамольскія шарэнгі былі больш сціплымі. У лістападзе 1925 г. яны аб'ядноўвалі каля 38 тыс.юнакоў і дзяўчат. Дзейнічалі таксама іншыя грамадска-палітычныя арганізацыі — Міжнародная арганізацыя дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР), сходы дэлегатак і інш. У вёсках праводзіліся сельскія сходы, сходы беднаты, працавалі сялянскія камітэты ўзаемадапамогі, групы беднаты. Але дзейнасць грамадскіх арганізацый, даволі значнае прадстаўніцтва у іх працоўных не змаглі прадухіліць усталяванне у БССР, як і ва ўсёй дзяржаве, аўтарытарных метадаў кіравання.

Характэрнай асаблівасцю гісторыі савецкай Беларусі 20-х гадоў з'явілася спроба нацыянальна-культурнага адраджэння, якая вылілася у палітыку беларусізацыі. Яна была вельмі неабходнай з'явай, таму што на прычыне шматвекавой

паланізацыі і русіфікацыі прэстыжнасць беларускай культуры значна знізілася нават у сямі яе носьбітаў.

Аб пераходзе да ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі было аб'яўлена ў ліпені 1924 г. II сесіяй ЦВК БССР. Яна прыняла пастанову "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі". Сутнасць палітыкі беларусізацыі заключалася у развіцці беларускай культуры, вылучэнні беларусаў на партыйную, савецкую работу, на працу у прафесійных і грамадскіх арганізацыях.

Галоўным звяном палітыкі беларусізацыі з'яўлялася аднаўленне ўжывання у шырокіх народных масах, дзяржаўных і грамадскіх структурах беларускай мовы. Пры гэтым ставілася задача, каб у час прыскарэтнага развіцця роднай мовы належная ўвага надавалася іншым мовам, на якіх размаўляла насельніцтва Беларусі — у першую чаргу рускай, польскай, украінскай, яўрэйскай.

Праца па ажыццяўленню палітыкі беларусізацыі была разгорнута у шырокіх памерах. У кампартыі Беларусі нават быў дэвіз: "Уся КП(б)Б павінна гаварыць на беларускай мове". Неаднаразова пытанні беларусізацыі закраналіся на вышэйшых партыйных форумах — пленумах і з'ездах. Фактычна беларусізацыя была ўведзена на ўзровень дзяржаўнай палітыкі. Прэзідыум ЦВК БССР стварыў камісію па ажыццяўленню нацыянальнай палітыкі. Яе ўзначаліў вядомы у БССР дзяржаўны дзеяч А.Хацкевіч.

Важным напрамкам беларусізацыі з'яўляўся пераход службовага справаводства на беларускую мову. Гэта паспяхова ажыццяўлялася, як і авалоданне работнікамі партыйных і дзяржаўных органаў беларускай мовай. Калі у 1925 г. толькі 22% супрацоўнікаў рэспубліканскіх устаноў валодалі беларускай мовай, а у акругах і раёнах — 36%, то у 1927 г. гэтыя паказчыкі адпаведна павысіліся да 80 і 70%.

Рухалася справа пераводу навучання на беларускую мову. У 1926/27 навучальным годзе сярод 4-х і 7-гадовых школ беларускамоўнымі адпаведна з'яўляліся 85 і 67%. У вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школе БССР тэрміны правядзення беларусізацыі у асноўным выконваліся паспяхова. Асаблівая гэта датычыла педагагічных навучальных устаноў. У адпавед-

насці з палітыкай беларусізацыі значна павялічылася колькасць прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці у складзе кіруючых органаў. Гэта адносілася як да партыйна-савецкага апарату, так і прафесійнага, камсамольскага і іншых.

Аднак ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі сутыкалася са значнымі цяжкасцямі. Найбольш трывожнай прыкметай было тое, што супроцьдзеянне ёй усё больш нарастала у партыйным кіраўніцтве КП(б)Б. Найбольш паказальнай у гэтых адносінах з'яўлялася думка першага сакратара ЦК кампартыі Беларусі В.Кнорына, выражаная ім у 1928 г. У кнізе "За культурную рэвалюцыю" ён выказаў свае негатыўныя адносіны да гісторыі беларускай культуры у эпоху сярэднявечча: "Мы так "раскрытыкуем" Смаляцічаў і Тураўскіх, што двух радкоў ім будзе шкада прысвячаць у нашай гісторыі, бо яны ідуць ад другой лініі, а не ад лініі працоўных мас". Гэтая жорсткая класавая пазіцыя наглядна адлюстроўвала нарастанне адмоўных адносін партыйнага кіраўніцтва БССР да палітыкі беларусізацыі. Паказальна, што гэта адбывалася у час, калі у рэспубліцы з'яўляліся прыкметы разгортвання барацьбы з так званай нацдэмаўшчынай. Яе нарастанне у канцы 20-х --пачатку 30-х гг. фактычна прывяло да таго, што ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі было спынена.

Аднак у сярэдзіне 20-х гадоў беларусізацыя у значнай ступені вызначала характар усяго культурнага будаўніцтва у рэспубліцы. Гэта праяўлялася па розных накірунках, хаця палітыка дарэвалюцыйных часоў, скіраваная на актыўную русіфікацыю беларускага краю, адчувалася вельмі моцна. Таму важнай, а нярэдка вызначальнай была пазіцыя партыйна-дзяржаўных органаў у развіцці культуры. У той час яна была пазітыўнай. Гэта нашло выражэнне у адпаведных рашэннях. У прыватнасці, студзеньскі (1925 г.) пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што лозунг, які кампартыя Беларусі павінна прыняць у культурнай рабоце, гэта лозунг "беларусізацыі".

Вострым пытанне культурнага будаўніцтва 20-х гадоў у БССР было ажыццяўленне кіраўніцтва ім. Імкнучыся да усталявання адзінаўладдзя, КП(б)Б настойліва пратэндавала на

гэтую ролю. Яшчэ на сваім X з'ездзе, які адбыўся у снежні 1925 г., яна паставіла задачу быць на чале ўсяго культурнага будаўніцтва. У хуткім часе гэтае ж пытанне ўзняў першы сакратар ЦК КП(б)Б А.І.Крыніцкі. Выступаючы 25 верасня 1926 г. на сходзе Мінскай гарадской арганізацыі Кампартыі Беларусі з дакладам "Аб чарговых пытаннях нацыянальнай палітыкі КП(б)Б", ён адзначыў, што партыя бачыць небяспеку з боку дробнабуржуазнага, нацыянал-дэмакратычнага, контррэвалюцыйнага крыла інтэлігенцыі. Па словах прамоўцы, дання небяспека заключалася у спробах захапіць кіруючую ролю у культурным будаўніцтве. Пры гэтым ставілася задача трымаць у сваіх руках гэтае кіраўніцтва, каб пралетарыят і КП(б)Б стаялі на чале работы па беларусізацыі і ўсяго культурнага будаўніцтва у БССР.

Але поўнасцю авалодаць у той час становішчам у галіне культуры, стаць на чале яе развіцця кампартыя Беларусі так і не змагла. Шмат што тут рабілася намаганнямі патрыятычнай, нацыянальна-свядомай інтэлігенцыі. Зыходзячы з такога становішча, пад канец 20-х гадоў партыйна-дзяржаўныя структуры рэспублікі, кіруючыся дырэктывамі цэнтра, усё больш рабілі стаўку на барацьбу з так званым беларускім нацыянал-дэмакратызмам, каб расправіцца з лепшай часткай беларускай інтэлігенцыі.

У такіх умовах ажыццяўлялася у БССР праца па развіццю культуры. У першую чаргу надавалася ўвага пераадоленню непісьменнасці насельніцтва. Хаця рэспубліка адносілася да ліку раёнаў з больш высокім узроўнем пісьменнасці (у 1920 г. 47,4% жыхароў ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў былі пісьменнымі) усё больш паловы грамадзян не валодалі граматай.

Найперш трэба было развіваць школьную справу. У мэтах прывядзення у адпаведнасць школьнай сеткі з задачамі культурнага развіцця у 1922 г. у рэспубліцы была праведзена рэформа школьнай сістэмы. Асноўным яе звяном стала сямігадовая працоўная агульнаадукацыйная школа. Яна замяніла 9-цігадовую школу. Аднак матэрыяльныя цяжкасці у забеспячэнні працы школ прывялі да значнага скарачэння іх сеткі.

Зменшыць гэтую тэндэнцыю дапамагла падтрымка насельніцтва, якое нярэдка брала на свой кошт частку выдаткаў на утрыманне школ. У выніку намаганняў дзяржаўных органаў, мясцовых Саветаў і насельніцтва колькасць школ у БССР паступова павялічвалася.

Нялёгкай задачай з'яўлялася падрыхтоўка кадраў настаўнікаў. У 1925/26 навучальным годзе не мелі спецыяльнай падрыхтоўкі 62,3% настаўніцкіх кадраў рэспублікі, а у 28% не было нават сярэдняй адукацыі. Да таго ж настаўніцтва раз'ядноўвалася рознымі палітычнымі поглядамі, разуменнем задач школьнага навучання і падыходаў да яго ажыццяўлення. Каб больш павярнуць кадры настаўнікаў у бок савецкай улады, у 1926 г. ону праведзены з'езд настаўнікаў БССР.

Нямала увагі надавалася пераводу школьнага навучання на беларускую мову. На практыцы гэта было цяжкай задачай. Перашкодай нярэдка станавіліся старыя падыходы часткі настаўнікаў, кансерватызм апарата, які кіраваў народнай асветай. Супроцьдзейнічалі і некаторыя мясцовыя жыхары, асабліва прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў, якія бачылі у гэтым праявы беларускага нацыяналізму. Цяжкасці у данай справе і слабыя вынікі прызнаваліся і у партыйных рашэннях. У прыватнасці, кастрычніцкі (1925 г.) пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, што беларусізацыя многіх школ носіць пакуль яшчэ павярхоўны характар.

І усё ж на працягу 20-х гадоў у рэспубліцы была у асноўным створана новая сістэма народнай адукацыі. У 1928/29 навучальным годзе у БССР налічвалася больш як 5,7 тыс. агульнаадукацыйных школ. У іх было 485 тыс.вучняў. Амаль 80% дзяцей 8-12 гадоў наведвалі школы, што з'яўлялася значным крокам наперад у ажыццяўленні усеагульнай граматнасці.

Аднак вырашыць гэтую задачу можна было не толькі шляхам развіцця школьнага навучання, але і актыўнай працай па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. Значную работу вяло таварыства "Далоў непісьменнасць", якое узнікла у 1924 г. Пры яго садзейнічанні была разгорнута шырокая сетка пунктаў ліквідацыі непісьменнасці. З мэтай лепшага правядзення работы па навучанню граматэ дарослых у 1925 г. для іх ону выдадзены беларуска-

моўны буквар. Вынікам агульных намаганняў стала тое, што на працягу 20-х гадоў каля 100 тыс.жыхароў БССР сталі пісьменнымі. Гэта з'явілася невялікім паказчыкам.

У час правядзення работы па навучанню грамаце дарослага насельніцтва выявілася шматлікія хібы ў гэтай рабоце — непрадуманасць, паспешлівасць, кампанейшчына. Многія дарослыя, крыху падвучыўшыся грамаце, кідалі навучанне. Каб замацаваць дасягнутае, трэба было працягваць навучанне. Для гэтай мэты з 1926 г. у БССР сталі працаваць школы малапісьменных. Яны давалі веды ў аб'ёме пачатковай школы. У цэлым намаганні па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці давалі станоўчыя вынікі. Згодна дадзеных на канец 1926 г., удзельная вага пісьменных жыхароў БССР ва узросце ад 9 да 49 гадоў павысілася да 58,1%.

Вялікае значэнне надавалася культасветнай працы. Па меры таго, як партыя усё больш забірала кіраўніцтва у свае рукі, узмацнялася палітычная накіраванасць гэтай работы. У 1920 г. быў створаны нават спецыяльны дзяржаўны орган — Галоўпалітпрасвет, які кіраваў усёй сістэмай палітычнай асветы насельніцтва. Стваралася сетка апорных пунктаў культасветнай працы. У вёсках гэта былі хаты-чытальні, у гарадах — клубы. У 1925 г. у БССР дзейнічала больш 300 раённых дамоў культуры і клубаў, а таксама 587 хатаў-чытальняў. Развівалася бібліятэчная справа. У 1929 г. у рэспубліцы мелася 630 бібліятэк, кніжны фонд якіх перавышаў 1,5 млн. тамоў.

Важным накірункам культурнага будаўніцтва было стварэнне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы. Значнай падзеяй стала адкрыццё у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вялікую арганізатарскую, педагагічную і навуковую работу праводзіў яго першы рэктар У.І.Пічэта, член праўлення універсітэта, нарком асветы БССР У.М.Ігнатоўскі і інш. У 1922 г. быў створаны Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. У 1925 г. ён быў аб'яднаны з Горацкім земляробчым інстытутам і створана Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія. У 1924 г. у рэспубліцы працавалі 4 вышэйшыя навучальныя установы. Стваралася таксама сетка

тэхнікумаў.

Прыём у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя установы ажыццяўляўся на класавай аснове. Таму выхадцы з заможных сем'яў былі абмежаваны ў магчымасцях атрымаць адукацыю. У мэтах стварэння лепшых умоў для навучання рабочай моладзі ствараліся рабочыя факультэты.

Значная ўвага надавалася развіццю навукі. На базе навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР у 1922 г. быў заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Плённай была яго дзейнасць як у галіне грамадазнаўчых навук, так і навук аб прыродзе. Асабліва актыўна у ім працавалі гісторык У.Ігнатоўскі, археолаг А.Ляўданскі, К.Палікарповіч, С.Дубінскі, мовавед П.Бузук, этнограф А.Сержпутоўскі, І.Сераў, А.Шлюбскі, біёлаг Г.Высоцкі і многія іншыя. На базе Інбелкульта І студзеня 1929 г. была адкрыта Беларуская Акадэмія навук.

Плённымі былі 20-я гады для развіцця беларускай літаратуры і мастацтва. Літаратары аб'ядноўваліся у літаратурныя аб'яднанні. У 1924 г. узнікла усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк". Яно лічыла сябе арганізацыяй пралетарскіх пісьменнікаў, якія прызнавалі вялікую ролю літаратуры у барацьбе за новае жыццё. Актыўнымі яго членамі былі А.Александровіч, П.Галавач, М.Лынькоў, П.Трус, М.Чарот і інш.

У 1926 г. літаратары А.Бабарэка, З.Бядуля, П.Глебка, В.Дубоўка, К.Крапіва, М.Лужанін, Я.Пушча, К.Чорны выйшлі з "Маладняка" і утварылі літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша". Яно аб'яднала прынцыпы высокага мастацтва. Прадстаўнікамі гэтага аб'яднання крытыкаваліся нігілістычныя адносіны маладнякоўцаў да класічнай спадчыны.

Арганізацыя літаратурных сіл працягвалася і у 1927 г. узнікла літаратурнае аб'яднанне "Полымя". У ім былі прадстаўлены пераважна пісьменнікі старэйшага і сярэдняга пакалення — Я.Колас, Я.Купала, А.Вольны, Ц.Гартны, А.Гурло, А.Дудар і іншыя. Яны звязвалі высокае грамадскае прызначэнне літаратуры з удасканаленнем яе нацыянальнай формы. Аб'яднанне стрымлівала крайнія тэндэнцыі у развіцці літа-

ратурнага працэсу.

20-я гады былі адзначаны з'яўленнем выдатных літаратурных твораў у галіне паэзіі, прозы, іншых жанраў. Сярод іх паэмы "Безназоўнае" Я.Купалы, "Босня на вогнішчы" М.Чарота, "Юны змаганец" П.Труса і інш. З'явіліся аповесці "У палескай глушы" і "У глыбі Палесся" Я.Коласа, раман Ц.Гартнага "Сокі цаліны", шэраг іншых выдатных твораў.

Але ўжо ў той час узмацнялася партыйна-дзяржаўная цэнзура на літаратурнай творчасцю. Адным з праяў гэтага было зняцце з рэпертуара Беларускага дзяржаўнага тэатра п'есы Я.Купалы "Тутэйшыя". Як адзначалася 8 снежня 1926 г. на бюро ЦК КП(б)Б, гэта было зроблена таму, што твор утрымліваў элементы нацыянал-дэмакратызму.

Складаны, але даволі плённы шлях творчага станаўлення прайшло ў гэты час тэатральнае і выяўленчае мастацтва Беларусі, графіка, скульптура, развівалася народная творчасць. Усё гэта гаварыла за тое, што беларуская нацыянальная культура ў 20-я гады перажыла ўздым, стала важным фактарам нацыянальнага адраджэння, якое пачалося з канца XIX ст. Палітыка беларусізацыі стварыла данаму працэсу даволі трывалую глебу. Нацыянальная свядомасць беларускага народа пачала аднаўляцца. Аднак пад канец 20-х гадоў у выніку фарміравання камандна-адміністрацыйнай сістэмы, культу асобы, дыктатарскага сталінскага рэжыму гэтыя станоўчыя працэсы былі фактычна спынены.

Тэма 20. ПАД СЦЯГАМ ПАБУДОВЫ САЦЫЯЛІЗМУ

Вучэбныя пытанні. 1. Барацьба з "нацыянал-дэмакратызмам". Усталяванне дыктатарскага рэжыму у БССР. 2. Ажыццяўленне сацыялістычнай індустрыялізацыі. 3. Драматычны шлях калектывізацыі. 4. Культурнае развіццё. Націск на літаратуру і навуку. 5 Рэгламентацыя грамадска-палітычнага жыцця. 6. Рэпрэсіі — самае цяжкае злачынства дыктатарскага рэжыму.

30-я гады увайшлі у гісторыю савецкай Беларусі, як адны з найбольш складаных і цяжкіх. Хаця жыццё людзей праходзіла у асноўным у мірных умовах і характарызавалася не толькі самаадданай працай народа, знешне мажорным пафасам, але і жорсткай, бязлітаснай, няўмольнай, добра спланаванай барацьбой з лепшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, рабочага класа, сялянства.

Пачаткам усталявання дыктатарскага сталінскага рэжыму на Беларусі была барацьба з так званым нацыянал-дэмакратызмам. Яна праводзілася у канцы 20-х—пачатку 30-х гадоў, але ідэалагічная падрыхтоўка да яе аднаўлення вялася кіраўніцтвам кампартыі Беларусі значна раней. Яна фактычна пачалася ўжо у сярэдзіне 20-х гадоў на аснове агульнапартыйных падыходаў да вырашэння нацыянальнага пытання і праблем культурнага развіцця. Гэтыя падыходы былі замацаваны у рашэннях з'ездаў, пленумаў ЦК кампартыі Беларусі, у адпаведных пастановах бюро ЦК.

Пад канец 20-х гадоў грунтоўная ідэалагічная падрыхтоўка наступлення на прадстаўнікоў беларускага "нацыянал-дэмакратызму" пачала праяўляцца у канкрэтных захадах. У рэзалюцыі вераснёўскага (1928 г.) пленума ЦК КП(б)Б "Задачы камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі на сучасным перыяд" было прапанавана шырока разгарнуць крытыку дробнабуржуазнай ідэалогіі, весці рашучую барацьбу супроць усіх праяў антыкамуністычнай ідэалогіі і немарксісцкіх ухілаў у дзейнасці навуковых устаноў БССР.

Канкрэтныя захады да гэтай барацьбы былі зроблены у 1929 г., у так званы год вялікага пералому — пералому да сталінскіх метадаў кіраўніцтва. Штуршок гэтаму даў да-

дзены у сувязі з працай у маі-чэрвені 1929 г. у Беларускай ССР камісіі ЦКК УКП(б). Яе узначальваў старшыня ЦКК кампартыі Украіны В.Затонскі. Выходзячы з яе вываду і улічваючы шматгадавую падрыхтоўку да барацьбы, у 1929 г. кампартыяй Беларусі была прынята ўстаноўка аб тым, што нацыянал-дэмакратызм з'яўляецца галоўнай небяспекай на даным этапе развіцця.

Для непасрэднага правядзення гэтай барацьбы былі зроблены адпаведныя змены ў кіраўніцтве. Першым сакратаром ЦК КП(б)Б стаў К.Гей. У сярэдзіне 1930 г. органы АДПУ рэспублікі ўзначаліў прысланы з Масквы Р.Рапапорт. Пад іх непасрэдным кіраўніцтвам была "раскрыта" "нацдэмаўская, контррэвалюцыйная, антысавецкая арганізацыя", якая атрымала кодавую назву "саюз вызвалення Беларусі" — "СВБ".

Усяго па данай справе было арыштавана 108 чалавек — буйных вучоных, літаратараў, іншых прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Фактычна першай ахвярай гэтай ганебнай кампаніі стаў У.М.Ігнатоўскі — вядомы вучоны-гісторык і грамадскі дзеяч БССР, быў кіраўнік Наркамзема, затым Наркамасветы рэспублікі, старшыня Інбелкульта, першы прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук, першы дырэктар Інстытута гісторыі, член бюро ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР. Абвінавачаны ў нацыянал-апартунізме, у прыналежнасці да "СВБ", знятый з адміністрацыйных пасад, выведзены з выбарных органаў, выключаны з партыі, ён застрэліўся 4 лютага 1931 г.

Рашэннем калегіі АДПУ БССР ад 18 сакавіка 1931 г. наркам земляробства рэспублікі Д.Ф.Прышчэпаў, нарком асветы А.В.Баліцкі і некаторыя іншыя абвінавачаныя былі прыгавораны да 10 гадоў канцлагераў. 10 красавіка таго ж года былі вынесены пазасудовыя прыгаворы яшчэ 86 арыштаваным. Большасць з іх атрымала ад 3 да 5 гадоў турэмнага зняволення. Толькі на 18 чалавек справу спынілі. Але у недалёкім будучым большасць з асуджаных і нават вызваленых зноў былі арыштаваны і іх напаткаў трагічны лёс сталінскіх ахвяр. Адзначым, што усё следства па справе "СВБ" праходзіла пад пільным кантролем цэнтральных партыйных, савецкіх і следчых органаў Масквы.

Барацьба з "нацыянал-дэмакратызмам" супярэчліва пера-

клікалася з палітыкай беларусізацыі. У ходзе кампаніі па разгрому "нацыянал-дэмакратаў" беларусізацыі быў нанесены моцны удар. Спагадлівае стаўленне да усяго беларускага атаясамлялася з нацыяналізмам. Суадносіны нацыянальнага развіцця і вялікадзяржаўных інтарэсаў цэнтральных партыйна-дзяржаўных структур адміністрацыйна-рэпрэсіўным шляхам былі вырашаны на карысць апошніх. У БССР, як і ва ўсёй дзяржаве, устанаўліваўся дыктатарскі сталінскі рэжым.

Ва умовах нацыску на ўсё нацыянальнае, узрастаючай цэнтралізацыі кіравання сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыццём адбывалася будаўніцтва сацыялізму. Найбольш важным звяном тут з'яўлялася сацыялістычная індустрыялізацыя. Яе неабходнасць была відавочнай, таму што па аб'ёму прамысловай прадукцыі на душу насельніцтва у другой палове 20-х гадоў СССР адставаў ад развітых капіталістычных краін у 5-10 разоў. Яшчэ горшымі былі гэтыя суадносіны з Беларускай ССР. Таму неабходна было зрабіць гераічныя намаганні, каб ператварыць дзяржаву у эканамічна незалежную. А гэта ёй магло забяспечыць толькі інтэнсіўнае індустрыяльнае развіццё.

Зыходзячы са спецыфікі эканамічнага становішча савецкай Беларусі у партыйна-дзяржаўных рашэннях прадугледжвалася, што развіццё прамысловасці рэспублікі будзе ажыццяўляцца пераважна на базе мясцовых рэсурсаў сыравіны. У першую чаргу гэта былі харчовая, тэкстыльная, гарбарная галіны. Вядучае месца павінна была заняць перапрацоўка прадукцыі сельскагаспадарчай вытворчасці. І на самой справе, ужо у 1927/1928 гаспадарчым годзе на яе долю прыходзілася больш паловы агульнай прамысловай вытворчасці. Разам з тым развіваліся энергетычная, паліўная (у першую чаргу тарфяная) машынабудаўнічая, швейная, панчошна-трыкатажная, тэкстыльная і іншыя галіны.

Самаадданая праца народа, дапамога саюзнага урада, савецкіх рэспублік садзейнічалі даволі актыўнаму прамысловаму будаўніцтву. Ужо на працягу першай пяцігодкі (1928—1932 гг.) у БССР было пабудавана 78 буйных і 480 дробных і ся-

рэдніх прадпрыемстваў. Сярод іх буйнейшая ў рэспубліцы электрастанцыя БелДРЭС, Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, швейныя фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі" (Віцебск), імя "Камінтэрна" (Гомель). Віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка і іншыя.

Аднак нават значныя тэмпы індустрыяльнага развіцця не дазволілі рэспубліцы выканаць заданні першай пяцігодкі. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 2,7 раза, у той час як планам прадугледжваўся рост у 3,7 раза. У рабоце прамысловасці было шмат праблем і цяжкасцей. Як адзначалася ў пастановах вышэйшых партыйных і дзяржаўных органаў БССР, у прыватнасці па гораду Бабруйску, у яго прамысловым развіцці мелася сістэматычныя прарывы ў выкананні прамфінплана як па якасных, так і па колькасных паказчыках. СНК БССР і ЦК КП(б)Б указвалі на значныя недахопы ў рабоце мукамольнай і крупяной прамысловасці, вялікія цяжкасці з энергазабеспячэннем прамысловых прадпрыемстваў. Так, Мінская электрастанцыя сістэматычна дапускала перабоі ў забеспячэнні энергіяй заводаў, фабрык, камунальнай гаспадаркі горада.

Вялікія намаганні рабіліся для павышэння тэмпаў прамысловага развіцця ў гады другой і трэцяй пяцігодак. Толькі на працягу 1932--1937 гг. аб'ём прамысловай прадукцыі ў БССР узрос амаль у 1,9 раза. У лік дзеючых уступілі такія прадпрыемствы як другая чарга БелДРЭС, Магілёўскі аўтарамонтны завод, Крычаўскі цэментны завод, Гомельскі завод шкляных вырабаў, Аршанскі льнакамбінат і іншыя. Валавая прадукцыя прамысловасці усходніх абласцей БССР у 1940 г. перавысіла узровень 1913 г. у 23 разы.

Гэта было вынікам самаадданай працы рабочых, сялян, інтэлігенцыі. Высокі працоўны энтузіязм паказваў рабочы клас рэспублікі. Шырылася сацыялістычнае спаборніцтва, якое прымала розныя формы -- ударніцтва, гаспадарча-разліковыя брыгады, сустрэчнае планаванне, грамадскі буксір і іншыя. Вяршыняй данага руху з'явілася стаханаўскія метады працы. Аднак ва ўсім гэтым мелася нямала негатыўных бакоў.

Шмат было кампанейшчыны, фармалізму, паказухі, прыпісак у паказчыках і г.д.

Тэмпы прамысловага развіцця Беларускай ССР былі ніжэйшыя чым саюзныя. Гэта прывяло да таго, што удзельная вага рэспубліканскай прамысловасці у саюзнай паменшылася толькі на працягу другой пяцігодкі з 2 да 1,88%.

Нягледзячы на дасягненні у развіцці розных галін прамысловасці тут было шмат нявырашаных задач. Так, магутнасць электрастанцый рэспублікі на працягу 1932—1937 гг. выраслa на 41%, але па стану на пачатак 1940 г., як адзначалася у пастанове ЦК КП(б)Б ад 3-4 студзеня 1940 г., гэта было самае вузкае месца у гаспадарцы рэспублікі. Толькі па асноўных гарадах Беларускай ССР дэфіцыт электраэнергіі складаў 25 тыс.квт.Асабліва востра стаяла пытанне электразабеспячэння сталіцы рэспублікі Мінска, жыхары якога задавальняліся электраэнергіяй толькі на 25-40%.

Шмат для якіх прадпрыемстваў была характэрна штурмаўшчына. Многія галіны прамысловасці, у першую чаргу тарфяная, шкляная, мясамалочная дапускалі недавыкананне планавых заданняў. У мэтах узмацнення партыйнага кіраўніцтва работай прамысловасці і транспарту у канцы 1940 г. было прынята рашэнне аб увядзенні пасады сакратара па прамысловасці і транспарту у некаторых абкомах і гаркомах КП(б)Б і аб стварэнні прамысловых аддзелаў у гарадскіх і некаторых раённых камітэтах партыі. У пачатку 1941 г. пры прамысловых наркаматах сталі стварацца тэхнічныя саветы пад кіраўніцтвам адпаведных наркомаў. У функцыі гэтых саветаў уваходзіў разгляд асноўных пытанняў тэхнічнага развіцця і рацыяналізацыі вытворчасці, рэканструкцыі прадпрыемстваў, укаранення новых тэхналогій, вытворчай экспертызы тэхнічных праектаў і г.д. Аднак даная праца была спынена вайной.

На працягу 30-х гадоў Беларуская ССР зрабіла значны крок наперад у прамысловым развіцці. За гады трох даваенных пяцігодак у рэспубліцы была фактычна створана новая матэрыяльна-тэхнічная база, пабудавана звыш 1000 прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку каля 400 буйных. Вялікую дапамогу у гэтым аказалі цэнтральныя улады, а таксама са-

юзныя рэспублікі. У той жа час і БССР уносіла свой адметны уклад у агульнасаюзнае прамысловае будаўніцтва. Дакументальныя матэрыялы сведчаць, што матэрыяльныя і фінансавыя паступленні з БССР нярэдка перавышалі памеры той дапамогі, якая аказвалася рэспубліцы.

Вынікам прамысловага развіцця быў рост рабочага класа рэспублікі. У 1940 г. яго колькасць дасягнула амаль 277 тыс.чалавек, а удзельная вага у складзе насельніцтва перавысіла 20%. Сацыялістычная прамысловасць фарміравалася як выключна дзяржаўная галіна гаспадаркі. На яе аснове былі зліквідаваны дробныя прадпрымальнікі, гандляры, рамеснікі. Выключная падпарадкаванасць цэнтру, узаемасувязь паставак і размеркавання вырабаў павінны былі рабіць дзяржаву высокацэнтралізаванай. Нягледзячы на ўсе выдаткі, ажыццяўленне індустрыялізацыі з'явілася дасягненнем, якое адыграла важную ролю у лёсе беларускага народу, як і іншых народаў СССР.

Найбольш цяжкім і драматычным накірункам перабудовы, праведзеных пад сцягам пабудовы сацыялізму, з'явілася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У час яе ажыццяўлення пераважалі націскныя метады работы, характэрныя для часоў адыходу ад нэпа, які Сталін вырашыў "адкінуць да д'ябла". Гэта быў прамалінейны жорсткі шлях, які не улічваў ні аб'ектыўных законаў эканамічнага развіцця, ні асаблівасцей вёскі.

Ажыццяўленне палітыкі масавай калектывізацыі фактычна пачалося ўжо з сярэдзіны 1929 г. Калі на 1 чэрвеня у Беларускай ССР у калектыўных гаспадарках знаходзілася 12,9 тыс.сялянскіх двароў, то да канца лістапада таго ж года — 77,7 тыс. За гэты час узровень калектывізацыі павысіўся з 1,4 да 9,8%, гэта значыць у 7 разоў. Акрамя таго у рэспубліцы налічвалася 227 саўгасаў.

Актыўнае нарошчванне тэмпаў калектывізацыі адбылося у снежні 1929 г. У выніку колькасць сялянскіх гаспадарак, якія аказаліся у калгасах на пачатак 1930 г., была даведзена да 165,3 тыс., а працэнт калектывізацыі узняўся да 20,9. На працягу месяца паказчыкі павялічыліся больш чым

удвая. Гэта значыць, што быў зроблены пераход да фарсіравання гэтага складанага сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага працэсу. Фактычна былі дасягнуты паказчыкі, прадугледжаныя першым пяцігадовым планам на канец пяцігодкі. Такая ж тэндэнцыя назіралася ў многіх іншых рэгіёнах СССР.

Тым не менш пастанова ЦК УКП(б) ад 5 студзеня 1930 г. "Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву" арыентавала на далейшае павелічэнне тэмпаў. На месцах, у тым ліку ў Беларускай ССР, партыйна-дзяржаўныя органы, не лічачыся з канкрэтнымі умовамі, настойліва імкнуліся як мага паскорыць даны працэс. Ужо на студзеньскім (1930 г.) пленуме ЦК КП(б)Б было прынята рашэнне завяршыць калектывізацыю ўсіх сядзяцка-сялянскіх гаспадарак да канца 1931 г. Але ў лютым 1930 г. бюро ЦК кампартыі Беларусі пайшло яшчэ далей: яно вырашыла калектывізаваць да веснавой сяўбы гэтага года 75-80% сялянскіх гаспадарак. Займаючыся палітычным прыкрыццём, ЦК КП(б)Б адправіў 10 лютага 1930 г. у ЦК УКП(б) дакладную запіску з прапановай прызнаць БССР рэспублікай суцэльнай калектывізацыі.

Хуткі адміністрацыйны націск, які знаходзіў адлюстраванне на практыцы ў адпаведнасці з данай палітычнай лініяй, прывёў да вялікага нарошчвання тэмпаў калектывізацыі. Па стану на 1 сакавіка 1930 г. у БССР у калгасах лічылася 457,5 тыс.сялянскіх гаспадарак. Яны складалі 58% іх агульнай колькасці. Гэта самыя высокія паказчыкі па рэспубліцы у гады першай пяцігодкі. Характэрна, што у розных мясцовасцях рэспублікі ход калектывізацыі значна адрозніваўся. Гэта з'яўлялася вынікам вольш рэальнага падыходу да данай праблемы некаторымі мясцовымі партыйна-дзяржаўнымі уладамі.

Для пачатковага перыяду прымусовай калектывізацыі суўнай негатыўнай з'явай было масавае забойства і продаж жатняй жывёлы. Гэта было не столькі вынікам кулацкай агітацыі, як прадстаўляла даную справу афіцыйная прапаганда, колькі рэакцыяй сялянства на недамаверное дарсіраванне тэмпаў калектывізацыі. Зазначым, што партыйна-дзяржаўнае кіраўніцт-

ва БССР даволі аператы́ўна імкнулася рэагаваць на ўзніклае становішча шляхам інтэнсіўнага ўзмацнення агітацыйна-прапагандысцкай работы. Але яе выніковасць была мізэрнай. Таму да канца красавіка 1930 г. пагалоўе коней і буйной рагатай жывёлы скарацілася у БССР больш чым на чвэрць.

Сарэіраванне тэмпаў калектывізацыі суправаджалася рэзкай актывізацыяй барацьбы з заможнымі сялянамі, так званымі кулакамі. На справе гэта вылілася у палітыку раскулачвання. У яе аснове ляжаў рэзка выражаны класавы падыход. Прынятыя супроць кулацтва меры былі вельмі кароткія. Яны не толькі не дыктаваліся неабходнасцю, але і супярэчылі здаровому сэнсу, разуменню гэтай справы У.І.Леніным, які у канцы свайго жыцця асудзіваў як каператывацьвяць, як абмежаваць кулакоў, не прыпыняючы пры гэтым рост вытворчых сіл.

У выніку кароткага націску на заможную частку вёскі да канца мая 1930 г. у БССР было раскулачана 15629 гаспадарак. Іх маёмасць перадавалася у непадзельныя фонды калгасаў. Ужо у даны час усё больш яскрава праяўлялася тэндэнцыя пашыранага падыходу да раскулачвання, што закранала і серадняка. Гэта было асабліва небяспечнай з'явай, таму нярэдка партыйныя і савецкія органы вымушаны былі папярэджваць мясцовых, найбольш актыўных выканаўцаў партыйнай лініі аб недапушчэнні распаўсюджвання палітыкі раскулачвання на серадняцкую частку вёскі.

Паспешлівасць у ажыццяўленні калектывізацыі прывяла да таго, што яна спачатку праводзілася без прыкладнога статута сельскагаспадарчай арцелі, які павінен рэгламентаваць асноўныя моманты арганізацыі калгаснага жыцця. Ён фактычна з'явіўся толькі у пачатку сакавіка 1930 г., калі фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі зайшло ужо вельмі далёка.

Вынікам усіх гэтых дзеянняў з'явілася масавыя выхады сялян з калгасаў, што адбылося вясною 1930 г. На працягу сакавіка--мая у БССР з калгасаў выйшла 370,8 тыс.сялянскіх гаспадарак, а працэнт калектывізацыі упаў з 58 да 11,1. Гэта быў самы нізкі узровень калектывізацыі з таго часу, як яе зрабілі масавай і загадна-прымусовай. Але гэта не спыніла ажыццяўленне партыйнай лініі. Паступова улады зноў

прыступілі да праводзення сталінскай стратэгіі. Да канца 1930 г. у Беларускай ССР працэнт калектывізацыі зноў узняўся да 15.

Выхады сялян з калгасаў назіраліся і у наступныя гады, хаця і не у такіх маштабах. Метадычная палітычная работа органаў партыйна-дзяржаўнай улады разам з прымяненнем эканамічнага ўціску на аднаасобныя гаспадаркі вяла да павышэння паказчыкаў калектывізацыі. На пачатак 1932 г. у БССР зноў звыш 388 тыс.сялянскіх гаспадарак былі у калгасах. Гэта -- 50,6% іх агульнай колькасці. Аднак першая пяцігодка была закончана са становішчам, калі у калгасах знаходзілася 48,3% сялянскіх гаспадарак. Ступень абагульнення пасяўных плошчаў дасягнула 47,1%. У гэты час у рэспубліцы налічвалася 429 саўгасаў.

Было зразумелым, што калі тэмпы калектывізацыі не будуць дапаўняцца працай па арганізацыйна-гаспадарчаму умацаванню калгасаў, то развіваць з такой цяжкасцю ствараемы калгасны лад будзе немагчыма. Таму ўсё большая ўвага надавалася данаму накірунку дзейнасці. Прыярытэтнае месца тут займала механізацыя калгаснай вытворчасці. Гэта ажыццяўлялася у форме стварэння машына-трактарных станцый. Першая з іх у БССР -- Койданаўская -- узнікла у 1929 г. У канцы першай пяцігодкі у рэспубліцы налічвалася 57 МТС. Яны мелі каля 1,5 тыс.трактараў, некаторую іншую тэхніку. Аднак механізацыя грамадскай вытворчасці толькі пачыналася.

Важным накірункам дзейнасці па умацаванню сельгасарцелей з'яўлялася выпрацоўка яе ўнутранай структуры. Ужо у пачатку 30-х гадоў асноўнай вытворчай ячэйкай у калгасах была прызнана брыгада. Пачалося іх актыўнае стварэнне. Удасканальвалася аплата працы. У яе аснову быў пакладзены працадзень як эквівалент паміж колькасцю зробленай работы і атрыманай аплаты. Уводзілася здзельшчына, што з'яўлялася у той час прагрэсіўнай формай аплаты працы.

Аднак у справе па арганізацыйна-гаспадарчаму умацаванню калгасаў не абышлося без драконаўскіх сталінскіх мер. Гэта адносіцца у першую чаргу да пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня 1932 г. "Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і умацаванні грамадскай

(сацыялістычнай) уласнасці". За самыя нязначныя правіннасці гэты "закон пяці каласоў", як яго празвалі у народзе, прадугледжваў не толькі асуджэнне на тэрмін не ніжэй 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці, але нават "вышэйшую меру сацыяльнай абароны — растрэл". На працягу 1933—1934 гг. толькі у БССР па гэтаму антычалавечаму закону было асуджана больш за 10 тыс.чалавек.

Вынікам рэзкага спаду вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў у рэарганізацыйны перыяд, жорсткай нарыхтоўчай палітыкі, імкнення выконваць знешнегандлёвыя абавязацельствы для патрэб індустрыялізацыі, ігнаравання нават мінімальных патрэб сельскага насельніцтва у прадуктах харчавання ў 1932 годзе, які распаўсюдзіўся на Украіну, Паўночны Каўказ, Паволжа, Паўднёвы Урал, Заходнюю Сібір, Паўночны Казахстан, Паўднёвую і цэнтральную часткі БССР. Так, у Ельскім раёне ім былі ахоплены 3 сельсаветы, у Нараўлянскім — 6. Да сярэдзіны 1933 г. у гэтых сельскіх Саветах памерлі ад голаду 130 чалавек. Колькасць апухлых сялян дасягала 280. Голадам былі закрануты частка калгасаў Гомельскага раёну, а таксама цэнтра Беларусі — Пухавіцкі раён, некаторыя мясціны вакол Мінска і інш. Прымаліся меры па аказанні медыцынскай і харчовай дапамогі хворым.

Значныя маштабы у час масавай калектывізацыі набылі мабілізацыі камуністаў, камсамольцаў, беспартыйных з гарадоў і накіраванне іх на часовую ці пастаянную работу у сельскую мясцовасць. Найбольш буйной акцыяй у гэтых адносінах была пасылка у калгасы і саўгасы рабочых-дваццаціпяцітысячнікаў. 612 з іх былі накіраваны у БССР, у тым ліку 99 прадстаўнікоў завода "Чырвонае Сормава" з Ніжняга Ноўгарада. Аднак накіраваным на вёску рабочым не хапала ведання вясковага жыцця і спецыфікі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Складанай палітычнай абстаноўкі на вёсцы прывялі да стварэння палітычных аддзелаў машына-трактарных станцый. Гэта рабілася у адпаведнасці з рашэннем студзеньскага (1933 г.) аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК УКП(б). У Беларускай ССР было створана 72 палітаддзела. Яны былі па сутнасці надзвычайнымі партыйнымі органамі. Разам з палітычнай рабо-

тай па падбору і растаноўцы кадраў яны праводзілі хоротку класавую лінію і метады іх працы пераважна былі націскныя. Палітаддзелы МТС праіснавалі да канца 1934 г.

Усе гэтыя меры садзейнічалі павышэнню паказчыкаў калектывізацыі. Ужо да канца 1934 г. яе працэнт узняўся да 72,6. Было абагулена 4/5 пасяўных плошчаў. Калектывізацыя у БССР была у асноўным закончана. Аднак гэтая праца працягвалася. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ва усходніх абласцях рэспублікі ступень аграмаджаных сялянскіх гаспадарак дасягнула 93,4%, а па пасяўной плошчы — 96,2%. У гэты час у рэспубліцы налічвалася 182 саўгаса.

Разам з нарошчваннем паказчыкаў калектывізацыі у гады другой і трэцяй пяцігодак актывізавалася праца па арганізацыйна-гаспадарчаму умацаванню сельгасарцелей. Адбываўся іх пераход на новы прыкладны статут, які прыняў другі усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў у 1935 г. Калгасам уручаліся акты на вечнае карыстанне зямлёю. Але гэтыя мерапрыемствы нярэдка ператвараліся у шумныя прапагандысцкія кампаніі.

На працягу 1939—1940 гг. звыш 160 тыс.хутарскіх гаспадарак Беларускай ССР былі перасялены у калгасныя цэнтры. Гэта было вынікам недаверу сталінскага кіраўніцтва да сялянства, яго імкненне да яшчэ больш цэнтралізаванага кіравання ім. З мэтай павышэння актыўнасці калгаснікаў у грамадскай вытворчасці устанаўліваўся мінімум працадзён, якія патрэбна было выпрацаваць на працягу года. У БССР іх колькасць раўнялася 80.

Значная ўвага надавалася пашырэнню сеткі МТС. У 1940 г. ва усходніх раёнах рэспублікі іх налічвалася 286. Трактарны парк дасягаў 9,7 тыс.машын. Павялічылася колькасць іншай тэхнікі. Аднак узровень механізацыі сельскагаспадарчых работ быў невысокім. У жывёлагадоўлі механізацыі амаль не было. Пэўныя дасягненні былі у падрыхтоўцы механізатарскіх і масавых калгасных кадраў, але іх змены адбываліся вельмі часта.

Нізкімі заставаліся вытворчыя паказчыкі як у раслінаводстве, так і у жывёлагадоўлі. Фактычна да канца 30-х га-

доў вытворчасць у сельскай гаспадарцы БССР, як і усёй дзяржавы, не прасунулася наперад. Адпаведным было і матэрыяльнае становішча сялян. Аплата працы у грамадскай вытворчасці была вельмі нізкай. Важную ролю у гэтых адносінах выконвалі прысядзібныя вучасткі.

Ігнаруючы агульнапрынятых прынцыпаў кааперавання, адказ ад магчымасцей новай эканамічнай палітыкі зрабілі пераход сялянства на калектыўны шлях гаспадарання цяжкім выпрабаваннем. Па найбольш гаспадарлівай частцы вёскі -- асноўным носьбітам сельскагаспадарчага вопыту -- быў нанесены моцны ўдар. Гэта вельмі адмоўна адбілася на развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці.

Важным накірункам пераўтварэнняў, якія ажыццяўляліся пад сцягам пабудовы сацыялізму з'яўлялася культурнае развіццё. У першую чаргу неабходна было ажыццявіць усеагульнае пачатковае навучанне. Выходзячы з поспехаў у гэтай галіне , ужо у 1932 г. партыйныя і дзяржаўныя кіраўнікі БССР паспешліва аовясцілі, што сыццам бы даная задача выканана, хаця на самой справе было не так. Гэта было зроблена пазней.

У 1934 г. XVII з'езд УКП(б) паставіў задачу дабіцца ажыццяўлення у бліжэйшыя гады усеагульнага абавязковага навучання у аб'ёме сямігадовай школы. Гэты пераход выконваўся ва умовах рэфармавання сістэмы адукацыі, якое фактычна пачалося з пачатку 30-х гадоў. На аснове адпаведных пастаноў партыйна-дзяржаўных органаў СССР мяняліся праграмы, падручнікі, устанаўліваўся распарадак школьнага жыцця і іншае. Усталёвалася адзіная школьная сістэма. Калі да гэтага часу у БССР асноўным звяном школьнага навучання з'яўлялася сямігодка, то з сярэдзіны 30-х гадоў ім усё больш станавілася дзесяцігадовая агульнаадукацыйная школа.

Шмат увагі у ёй надавалася не толькі навучанню асновам ведаў, але і выхаванню дзяцей у духу савецкага патрыятызму і пачуцця інтэрнацыяналізму. У той жа час настаўніцтва працавала пад пільным наглядам органаў НКУС. Імі ахоплівалася фактычна уся школьная сетка. А яна была значная. У 1939--1940 навучальным годзе ва ўсіх абласцях БССР

налічвалася 7195 школ, у якіх працавала звыш 40 тыс.настаўнікаў, навучалася каля I млн.II7 тыс.дзяцей.

Нельга было дасягнуць усеагульнай граматнасці без пераадолення непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. З гэтай мэтай была арганізавана значная колькасць пунктаў ліквідацыі непісьменнасці і школ для малапісьменных. Актыўную работу праводзіла таварыства "Далоў непісьменнасць". У I932 г. яно ахоплівала I65 тыс.чалавек. Вынікі работы былі значныя. На працягу I930—I939 гадоў у ліквпунктах займалася больш I млн. I2I тыс.чалавек, а у школах для малапісьменных — I млн. 289 тыс. Фактычна на працягу 20—30-х гадоў каля I млн.жыхароў БССР сталі пісьменнымі, а больш 0,5 млн. перасталі быць малапісьменнымі. Тым не менш у I939 г. яшчэ каля 0,7 млн.чалавек заставаліся непісьменнымі. Гэта складала I9,2% усяго насельніцтва ва узросце ад 9 да 49 гадоў. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ва усходніх абласцях рэспублікі каля 85% жыхароў у той ці іншай ступені валодалі граматай. Гэта было значным дасягненнем.

Разам з тым партыйна-дзяржаўныя органы вялікую ўвагу надавалі ідэалагічнай апрацоўцы народа. Яна вялася праз адпаведныя культасветустановы. На працягу 30-х гадоў колькасць хат-чытальняў у рэспубліцы павялічылася да I387, а клубаў — да 266. Гэтай жа мэце служылі і бібліятэкі. У Беларускай ССР у I940 г. іх налічвалася I760. Яны мелі фонд каля 4 млн.кніг. Фактычна на аднаго жыхара рэспублікі ва узросце звыш I0 гадоў прыпадала у сярэднім адна кніга. Павялічвалася колькасць выдаваемых газет. У I938 г. у БССР іх налічвалася I99 — рэспубліканскіх, абласных, раённых, шматтыражных. У іх ліку I49 выданняў было на беларускай мове. Агульны тыраж газет складаў каля I млн.экземпляраў. У жыццё працоўных уваходзіла радыё, кіно. Усе сродкі масавай інфармацыі і культасветустановы знаходзіліся пад жорсткім ідэалагічным кантролем. Работа у іх вялася у накірунку засваення працоўнымі сталінскага вучэння аб сацыялізме. З I938 г. гэта рабілася у адпаведнасці з "Кароткім курсам гісторыі УКП(б)".

У працэсе культурнага будаўніцтва фарміравалася інтэлігенцыя Беларусі. Важную ролю у гэтых адносінах выконвалі вышэйшыя навучальныя установы. У 1932 г. у рэспубліцы іх налічвалася 31 з 10,6 тыс.студэнтаў. У 1933 г. быў створаны Беларускі палітэхнічны інстытут. У выніку аб'яднання некалькіх сельскагаспадарчых устаноў быў адноўлены Горацкі сельскагаспадарчы інстытут. У гэты ж час адкрыўся інстытут народнай гаспадаркі у Мінску.

Пашыралася сетка сярэдніх спецыяльных устаноў. У 1932 г. у БССР іх было 104, а колькасць навучэнцаў складала амаль 20 тыс. З мэтай забеспячэння класавага прынцыпу у камплектаванні кантынгента студэнтаў пашыралася колькасць рабочых факультэтаў. У 1932 г. іх налічвалася 30 і ахоплівалі яны амаль 11 тыс.чалавек.

Вынікам усёй гэтай працы было тое, што колькасць спецыялістаў ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры рэспублікі дасягнула у канцы другой пяцігодкі амаль 50 тыс. Да канца 30-х гадоў у асноўным сфарміравалася беларуская савецкая інтэлігенцыя. Па свайму паходжанню у пераважнай большасці яна была рабоча-сялянскай.

У складаных умовах развівалася навука савецкай Беларусі. Вядучая роля у навуковых даследаваннях належала Беларускай Акадэміі навук. У пачатку 30-х гадоў удасканальвалася яе арганізацыйная структура. У 1932 г. тут налічвалася 14 навукова-даследчых інстытутаў. Усяго у рэспубліцы было 40 навукова-даследчых устаноў, дзе працавала каля 1,5 тыс.навуковых работнікаў.

У выніку сталінскіх рэпрэсій навуковым кадрам быў нанесены непапраўны урон. Толькі на працягу 1937—1938 гадоў у Акадэміі навук было арыштавана 57 чалавек, у тым ліку акадэмікі Я.М.Афанас'еў, Т.Ф.Домбаль, І.І.Замоцін, С.Ю.Матулайціс, В.А.Сяроента і многія іншыя. Фактычна была згорнута падрыхтоўка кадраў. У выніку цэлыя навуковыя напрамкі закрываліся.

З усталяваннем адміністратыўна-каманднай сістэмы, культу асобы ўзрасла практыка грубага умяшання у развіццё літаратуры і мастацтва. З мэтай яшчэ большага падпарадкавання партыйна-дзяржаўным уладам пісьменніцкіх арганізацый

выратана было аб'яднаць усіх пісьменнікаў у адзіны саюз. У 1934 г. у Мінску адбыўся першы з'езд пісьменнікаў Беларусі, які аформіў утварэнне адзінай пісьменніцкай арганізацыі у рэспубліцы. Метад сацыялістычнага рэалізму стаў выкарыстоўвацца для канцэнтрацыі ўвагі на пераўтварэннях у розных галінах жыцця і адпаведнага іх адлюстравання.

Тым не менш і у гэтых умовах з'яўляліся мастацкія творы, якія увайшлі у класіку беларускай літаратуры. Сярод іх паэма "Тарасова доля" Я.Купалы, аповесць "Дрыгва" Я.Коласа, раман "Трэцяе пакаленне" К.Чорнага, камедыя "Хто смяецца апошнім" К.Крапівы і іншыя. Аднак кадры літаратараў панеслі у выніку рэпрэсій вялікія страты. Былі рэпрэсаваны пісьменнікі А.Александровіч, П.Галавач, М.Гарэцкі, Ц.Гартны, А.Дудараў, М.Зарэцкі, Я.Пушча, М.Чарот і многія іншыя.

Цяжкія ўмовы накладвалі такоама адбітак на развіццё сцэнічнага мастацтва, музыкі, кіно, скульптуры, архітэктуры, выяўленчага мастацтва, вуснай народнай творчасці. Значыць, у 30-я гады літаратура і мастацтва савецкай Беларусі прайшлі складаны, супярэчлівы, драматычны шлях, адзначаны як дасягненнямі, так і балючымі стратамі.

Не толькі развіццё культуры і навукі, але і грамадска-палітычнае жыццё прымала у 30-х гадах усё больш выразна акрэсленыя адміністрацыйна-камандныя рысы. Пад уздзеяннем культу асобы і загадных метадаў кіравання паступова выпрацоўвалася адзінства думак. Гэтую з'яву афіцыйная прапаганда падавала як буйное дасягненне сацыялістычнага будаўніцтва, а на самай справе было глумленнем над дэмакратыяй, адыходам ад яе, адным з праяў сталінскага дыктатарскага рэжыму.

Наогул 30-я гады -- вельмі супярэчлівы час у гісторыі савецкай Беларусі, як і усёй дзяржавы. У ім спалучаліся у неймаверным перапляценні працоўны энтузіязм народа і яго страх перад беззаконнем, вера у Сталіна і няведанне таго, што іменна ён з'яўляўся асноўным арганізатарам і натхняльнікам масавых рэпрэсій.

У такіх грамадска-палітычных умовах народ актыўна

працаваў, паказваючы высокія прыклады энтузіязму і самаахвярнасці. Гэтыя два працэсы -- энтузіязм народа і культ асобы -- ішлі паралельна. Першы -- шырока і адкрыта. Другі -- тайна, схаваны за строга прасеянай афіцыйнай інфармацыяй і прапагандай. У грамадстве былі створаны абставіны, калі груба ігнаравалісь правы чалавека. Усюды вышукваліся "ворагаў народа". Заахвочваліся даносы і паклёпы. Нават прадугледжвалася пакаранне за "неданасіцельства". Паўсюдна устаўлявалася усеагульная падазронасць. Каштоўнасць чалавечага жыцця зменшылася да самай нізкай адзнакі. Ніхто не быў упэўнены ў заўтрашнім дні.

Працягвалася работа, скіраваная на устаўляванне аднадумства. У першую чаргу гэта праяўлялася ў ходзе кампаній па перавыборах Саветаў. Нават у 1931 г., калі былі складанні грамадска-палітычныя абставіны ў сувязі з правядзеннем прымусовай калектывізацыі, удзел выбаршчыкаў у галасаванні па гарадах і вёсках Беларускай ССР дасягнуў 66,8%. Гэты паказчык быў вынікам маскіраванай прапагандысцкай работы і націскных метадаў.

Асаблівае важнае значэнне надавалася выбарам у Саветы, якія адбыліся ў канцы 1934 г. Пасля XVII з'езда УКП(б), дзе была зроблена спроба часткі дэлегатаў змясціць Сталіна з пасады генеральнага сакратара, вярхоўнаму кіраўніцтву партыі і краіны асаблівыя патрэбны былі іх як мага лепшыя вынікі. Для іх дасягнення была зменшана колькасць грамадзян, якія былі пазбаўлены выбарчых правоў, вялася актыўная агітацыйная работа. І як вынік усеабаковых намаганняў, агульны удзел у выбарах дасягнуў па Беларускай ССР 92,3%. Гэта з'явілася рашаючым крокам да устаўлявання сталінскага адзінаўладдзя ў час выбарных кампаній Саветаў.

Дадзены працэс завяршыўся ў час выбараў на аснове новай Канстытуцыі Саюза ССР і Беларускай ССР. Выбары ў Вярхоўны Савет СССР адбыліся 12 снежня 1937 г. У БССР на выбарчыя участкі з'явілася 97,4% выбарчыкаў. За кандыдатаў у Савет Саюза аддалі свае галасы 96,7%, а у Савет Нацыянальнасцей -- 96,4% выбарчыкаў. Яшчэ больш высокія паказчыкі былі у час выбараў у Вярхоўны Савет БССР, якія прайшлі 26 чэрве-

на 1938 г. Такі ж малюнак назіраўся і у час выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных, што адбыліся 24 снежня 1989 г.

Практычна усеагульны удзел у выбарчых кампаніях і такое ж усеагульнае аднадушша у выказванні сваіх думак шляхам тайнага галасавання — вынік умацавання адміністрацыйна-камандных сістэмы, культу асобы, жорсткай рэпрэсіўнай палітыкі. Гэта была неад'емная рыса сацыялістычнага грамадства у яго сталінскім разуменні.

Рэгламентавалася праца і ўсіх грамадскіх фарміраванняў, якія ствараліся пры Саветах. Такімі фарміраваннямі былі секцыі і дэпутацкія групы. Удзел у іх працоўных быў значным, што садзейнічала фарміраванню даволі шматлікага актыву Саветаў. Ужо у 1981 г. у Беларускай ССР ён налічваў больш за 172 тыс.чалавек. Аднак гэта была сачасць народнага удзелу у кіраванні дзяржавай. На самой справе усе галоўныя пытанні вырашаліся партыйна-дзяржаўнымі уладамі, а актывісты займаліся пераважна дробнымі справамі.

Такую ж функцыю выконвалі і грамадскія арганізацыі, хаця яны былі даволі шматлікімі. Так,у прафесіянальных саюзах рэспублікі пад канец 1940 г. налічвалася амаль 650 тыс. чалавек. Зазначым, што калгаснікам у такіх аб'яднаннях у той час было адказана. Шэрэнгі камсамола БССР да пачатку 1941 г. налічвалі больш як 268 тыс.юнакоў і дзяўчат. Даволі прыкметнай арганізацыяй быў Асавіяхім. Ужо у пачатку 1937 г. у яго 6 тыс. первічных ячэйак налічвалася больш як 200 тыс.чалавек. Толькі на працягу 1936 г. у сістэме Асавіяхіма было падрыхтавана амаль 100 тыс.значкістаў супрацьпаветранай і процівхімічнай абароны, звыш 21 тыс.стралкоў першага разраду. Рыхтаваліся таксама танкісты, пілоты, парашутысты, радыстаўнікі іншых ваенных спецыяльнасцей. Гэта мела важнае значэнне у сувязі з узрастаннем пагрозы вайны.

Важнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці было абмеркаванне і прыняцце асноўных законаў -- Канстытуцыі Саюза ССР (снежань 1936 г.) і Канстытуцыі Беларускай ССР (чэрвень 1938 г.). Знешне яны ўлялі сабой даволі дэмакратычныя дакументы, дзе былі зафіксаваны не толькі абавязкі, але і правы савецкіх грамадзян. Аднак паўсядзённая практыка

масавых арыштаў і рэпрэсій сведчылі аб страшэнных парушэннях асноўных заканадаўчых актаў.

На жыццё Беларускай ССР, як і ўсёй дзяржавы, пэўны адбітак наклала савецка-фінская вайна. Яна адбывалася зімою 1939—1940 гг. Насуперак планам вярхоўнага кіраўніцтва лёгкай перамогі не атрымалася. Яна была дасягнута значнымі людскімі і матэрыяльнымі стратамі, хаця доўгі час гэта замоўчвалася.

У сувязі з пагрозай вайны з Германіяй у сярэдзіне 1940 г. быў уведзены 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы рабочы тыдзень. Парушэнні працоўнай дысцыпліны каралася судовымі органамі.

Значыць, на працягу 30-х гадоў не толькі ў сацыяльна-эканамічным, але і ў грамадска-палітычным жыцці былі зроблены вялікія дэфармацыі. Але ўсё гэта прыкрывалася бачнасцю сацыялістычнай дэмакратыі.

Аднак самым цяжкім злачынствам дыктатарскага сталінскага рэжыму былі масавыя рэпрэсіі. Наглядалася імкненне да іх тэарэтычнага апраўдання. У прыватнасці, Сталін сцвярджаў: "Рэпрэсіі у галіне сацыялістычнага будаўніцтва з'яўляюцца неабходным элементам наступлення". Праўда, на яго думку, гэта не галоўны элемент, а дапаможны. Рэпрэсіі разглядаліся як неабходная крыніца папаўнення рабочай сілы для звышнапружанай індустрыялізацыі. Тэму нярэдка праблемы індустрыяльнага развіцця ўзгадняліся з кіраўніцтвам карных органаў. Вялікія маштабы рэпрэсій былі абумоўлены і самым дыктатарскім рэжымам. Фактычна у жыцці рэалізоўваўся лозунг "Хто не з намі, той супроць нас".

У мэтах узмацнення рэпрэсіўнай палітыкі былі рэарганізаваны карныя органы і "удакладнена" заканадаўства. У 1934 г. АДПУ было рэарганізавана у НКУС. Тады ж быў утвораны пазасудовы орган -- асобая нарада замест судовай калегіі АДПУ. У сувязі з забойствам І снежня 1934 г. С.М.Кірава тэрмінова была зменена практыка вядзення следства. Справы пачалі разглядацца без удзелу пракурора і адваката. Хадайніцтвы аб памілаванні не прадугледжваліся, смяротныя пага-

воры выконваліся неадкладна. Была ўстаноўлена адказнасць аж да пакарання смерцю ў адносінах да дзяцей, пачынаючы з 12 гадоў.

Шырокія рэпрэсіі закранулі не толькі працоўныя калектывы рабочых, сялян, інтэлігентаў, але і партыйна-дзяржаўны апарат, партыйныя арганізацыі. Калі на 1 студзеня 1933 г. КП(б)Б налічвала 65040 чалавек, то у 1937 г. -- 31608. Праўда, да 1 студзеня 1941 г. колькасны склад кампартыі рэспублікі зноў павялічыўся да 72177 чалавек.

Трагічную ролю у адносінах камуністаў Беларусі адыграў Ліценьскі (1937 г.) пленум ЦК КП(б)Б. На ім над рэспубліканскай партыйнай арганізацыяй была учынена сапраўдная экзекуцыя прыбылымі з Масквы загадчыкамі аддзелаў ЦК УКП(б) Маленковым і Якаулевым. Але яшчэ раней, 16 чэрвеня 1937 г., у час работы XVI з'езда КП(б)Б, не вытрымаўшы націску, скончыў жыццё самагубствам старшыня ЦВК БССР А.Р.Чарвякоў. 21 чэрвеня гэтага ж года выкінуўся з вакна 5-га паверха будынка НКУС і загінуў старшыня СНК рэспублікі М.М. Галадзед. Былі арыштаваны і растраляны многія тагачасныя і ранейшыя кіраўнікі рэспублікі, а таксама мясцовых органаў улады.

Вялікія страты панеслі навуковыя кадры. Было рэпрэсіравана 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў. У 1937--1938 гг. загінулі прэзідэнты Беларускай Акадэміі навук П.В. Горын і І.З.Сурта, акадэмікі І.А.Пятровіч, Б.А.Тарашкевіч і іншыя. Рэпрэсіям падверглася больш за 100 беларускіх пісьменнікаў. Значныя страты панесла вёска. Ужо у снежні 1932 г. былі арыштаваны 24 селяніна шэрагу вёсак Старобінскага раёну. 9 з іх -- оратоў П.О. і Я.О.Будзіловічаў, І.М. і У.М.Пятровічаў, А.І.Курбаку і іншых -- прыгаварылі да растрэлу. Не абмінулі рэпрэсіі і рабочы клас. Курапаты, што пад Мінскам, іншыя месцы растрэлаў, уся сістэма лагераў і спецпасяленняў -- наш боль і прысуд дыктатарскаму сталінскаму рэжыму.

На працягу 30-х гадоў у БССР, як ва усёй савецкай дзяржаве, было створана новае грамадства. Для гэтага часу характэрны як значныя дасягненні, так і вялікія страты.

Тэма 21. БЕЛАРУСКІЯ ВАЙСКОВЫЯ ФАРМІРАВАННІ (1917—1941 гг.)

Вучэбныя пытанні. 1. Ідэя стварэння Беларускага нацыянальнага войска. Беларускія вайсковыя гурткі. Беларуская вайсковая Рада (1917). 2. Вайсковая палітыка ў час нямецкай і польскай акупацыі. Беларуская вайсковая камісія. 3. Чырвоныя аддзелы 1918—1921 гг. 4. Вайсковае будаўніцтва на Беларусі ў 20-30-я гады.

Агульнавядома, што ні адна нацыя не ў стане дасягнуць незалежнасці, асабістай дзяржаўнасці без стварэння ўласных узброенных сіл. Нашы суседзі добра разумелі гэтую ісціну яшчэ ў час першай сусветнай вайны, калі ў жорсткім змаганні адраджалі сваю незалежнасць Польшча, Літва, Латвія. У той жа час пэўныя захады ў гэтым накірунку рабіліся і беларускімі нацыянальна свядомымі дзеячамі.

Больш акрэслена ідэя беларускага войска ўзнікла пад час пачатку развалу Расійскай імперыі вясной 1917 года. Спачатку пачалі ўзнікаць гурткі беларускіх вайскоўцаў, якія несці вайсковую службу на розных франтах вайны. Адным з першых такі гурток узнік 8 мая 1917 г. у Рызе, паклаўшы пачатак беларускага вайсковага руху. Першапачаткова гэты рух накіроўваўся Беларускім Нацыянальным Камітэтам (БНК), па ініцыятыве якога і ўзнікла Беларуская Вайсковая Арганізацыя.

За лета 1917 г. на ўсіх франтах утварыліся шматлікія беларускія асяродкі. Асаблівы масавы і легальны характар беларускі вайсковы рух прыняў пасля выдадзенага ў жніўні 1917 года Часовым Урадам дакрэта, які дазваляў нацыяналізаваць тыя вайсковыя адзінкі рускай арміі, дзе большасць складалі прадстаўнікі нярускіх нацыянальнасцяў: украінцы, беларусы, палякі, літоўцы і інш. Шырокі размах беларускага вайсковага руху патрабаваў пэўнай каардынацыі, выпрацоўкі сумесных праграмы дзеянняў, стварэння кіруючых цэнтраў. Гэтыя задачы мог вырашыць толькі з'езд беларускіх вайскоўцаў, востра неабходнасць якога паўстала ўжо восенню 1917 г. Але ж сазваць з'езд усіх беларускіх вайскоўцаў, якія былі рассіданы па розных франтах, было вельмі нялёгкай справай. Таму спачатку, 18-20 кастрычніка 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд се-

ларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту. На з'езд прыбылі і прымалі удзел у працы таксама прадстаўнікі беларускіх вайсковых арганізацый 12-й арміі, Балтыйскага флоту і Румынскага фронту.

Па асноўнаму пытанню "Арганізацыя беларускага войска" з'езд вынес наступную рэзалюцыю: "З'езд... заклікае ўсіх сыноў Беларусі стаць грудзьмі на абарону сваёй зямлі і Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі. З'езд мяркуе, што сцементаваныя паходжаннем і зямляцтвам беларусы, з'яднаныя ў адно цэлае, не дапусцяць прыніжэння правоў свайго народа на самавызначэнне і нарушэнне гэтых ці іншых правоў і інтарэсаў кім бы то ні было. Выходзячы з гэтага, з'езд лічыць утварэнне беларускага войска ў сучасны момант вельмі неабходным і неадкладным, дзеля чаго з'езд пастанаўляе: 1. Шляхам узгаднення з усімі вайсковымі арганізацыямі беларусаў усіх франтоў утварыць Цэнтральную Беларускую Вайсковую Раду ў горадзе Мінску, якая сумесна са Стаўкай ВГК будзе кіраваць арганізацыяй Беларускага войска. 2. Да часу утварэння ЦВБР з'езд даручае ствараемаму Выканаўчаму камітэту часовай Цэнтральнай Вайсковай Рады акыцяўленне пастановы з'езда аб утварэнні Беларускага войска. 3. Арганізацыя Беларускага войска павінна праходзіць такім чынам, каб боегздольнасць армій на фронце не паслаблялася. 4. Штаты кадраў для утварэння Беларускага войска будуць рэкрутавацца з тых вайсковых часцей, якія найбольш укамплектаваны беларусамі. 5. Улічваючы тое, што толькі зямляцтва памі афіцэрскім і салдацкім складам змога унесці баявую аднасць і узаемны давер у войсках, з'езд лічыць мэтазгодным, каб увесь камандны састаў утвараемых часцей быў беларускім. Улічваючы вышэй адзначаныя падыходы па утварэнню Беларускага войска, з'езд звяртаецца да ўсіх беларусаў аб'яднацца вакол сваіх камітэтаў каб акыцявіць намечаныя планы".

З'езд утварыў Выканкам Часовай цэнтральнай Вайсковай Рады (ВЧЦВР) у склад якога ўвайшло 15 чалавек, у тым ліку: капітаны Ярушэвіч, Адамовіч, ст. унтэр-афіцэр Рак-Міхайлоўскі, вайсковы фінансіст Захарка, штабс-капітан Бандарчык, прапаршчык Красоўск малодшы унтэр-афіцэр Мамонька, яфрэйтар Шыла і інш.

Крыху пазней, у лістападзе-снежні, адбыліся з'езды вайскоўцаў-беларусаў Паўночнага, Паўднёва-Заходняга і Румынскага франтоў, якія прайшлі ў Віцебску, Кіеве і Адэсе. З'езды абралі сваіх прадстаўнікоў у склад БВЦР. Тым самым быў утвораны своеасаблівы штаб Беларускага войска, які ўзначаліў Сымон Рак-Міхай-

лоўскі. У склад управы ўвайшлі таксама падпаручнік Кастусь Езавітаў (заступнік старшыні) і Васіль Захарка (скарбнік).

Выканкам ВВЦР у снежні 1917--лютым 1918 г. выдаваў свой друкаваны орган -- газету "Беларуская Рада", якая шырока адлюстроўвала нацыянальна-кансалідацыйныя працэсы ў тагачасным беларускім грамадстве, асабліва сярод вайскоўцаў, імкненне беларусаў да нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння, стварэння ўласнага войска і інш. Газета выходзіла на рускай мове, але значная частка матэрыялаў друкавалася ча беларускай мове. Актыўнымі яе аўтарамі з'яўляліся Е.Ярушэвіч, К.Езавітаў, Г.Красоўскі, Ф.Шантыр, А. Уласаў, З.Бядуля, П.Бадунова і інш.

ВВЦР прыняла актыўны ўдзел у якасці аднаго з арганізатараў Усебеларускага кангрэсу. У прынцыпе рэзалюцыі ВВЦР па пытанню аб будучым грамадска-палітычным ладзе Беларусі гаварылася: аб'явіць Беларускую Дэмакратычную Рэспубліку як састаўную частку Федэратыўнай Расейскай Рэспублікі, стварыць часовую краёвую ўладу, прызначыць тэрмін склікання Устаноўчага сходу Беларусі, стварыць і паслаць беларускую дэлегацыю на мірную канферэнцыю, сфарміраваць нацыянальную армію.

Як вядома, у рэзалюцыі Усебеларускага кангрэса, які не скончыўшы работы, быў разагнаны бальшавікамі, упершыню адзначалася неабходнасць стварэння беларускай нацыянальнай арміі.

Стварэнню нацыянальных вайсковых адзінак на першым этапе спрыяла таксама палітыка цэнтральных бальшавіцкіх устаноў, якія на прыкладзе Фінляндыі, Украіны, Грузіі і Польшчы пераканаліся ў тым, якую каласальную сілу маюць нацыянальныя рухі, і таму, як адзначыў К.Езавітаў, "шукалі спосабу як-колечы без адчынення сваркі заўладаць беларускім рухам і накіраваць яго калі ўдо не цалкам на сваю карысць, дык прынамсі ў неякае нейтральнае ручво".

Аднак на месцах сітуацыя была некалькі іншая. Створаны пад час кастрычніцкага пераварота ў Мінску Абласны Выканаўчы Камітэт Заходняй вобласці (Аблвыканкамзах .), які складаўся, па словах Езавітава, "з расейскіх вайскоўцаў, якіх тады стаяла на Беларусі некалькі арміяў, з ыдоўскіх палітыканаў розных гатункаў і з латыскіх камуністаў. Аблвыканкамзах не вызнаваў ні правоў беларускага народу на нацыянальнае самавызначэнне, ні беларускай мовы, ні нават самога існавання беларусаў, як народу, і Беларусі, як асобнае краіны. Гэты Аблісполкамзах, на чале якога стаяў прапаршчык Мяснікоў, ішоў цалкам па шляхах старых расейскіх царскіх

урадаўцаў-русіфікатараў".

Гэтая акалічнасць прыводзіла да таго, што памiж цэнтральнымі бальшавіцкімі ўстановамі і бальшавіцкай уладай на месцах ішлі вострыя спрэчкі па пытаннях тактыкі ў адносінах да беларускага пытання і асабліва стварэння вайсковых беларускіх фарміраванняў.

Цэнтральныя ўстановы ў Петраградзе і Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага прапаршчыка Крыленка давалі на пэўных умовах дазвол на фарміраванне беларускіх вайсковых адзінак, а Аблвыканкамах, наадварот, абязбройвалі іх.

Так, 28 лістапада 1917 г. Вярхоўны галоўнакамандуючы выдаў загад, паводле якога дазвалялася стварэнне нацыянальных палкоў. Палкі павінны былі будавацца на класавых прынцыпах, пасля адпаведнага рэферэндуму, з улікам становішча на франтах. Ужо на наступны дзень начальнікам штаба генералам М.Бонч-Бруевічам быў дадзены дазвол на стварэнне 1-га пяхотнага мінскага беларускага палка. Аднак галоўнакамандуючы Заходняга фронту (галоўказах) А. Мясніковы сваім загадам адмяніў загад галоўкаверха Крыленкі ад 28 лістапада.

Пытанне аб фарміраванні нацыянальных палкоў было разгледжана на пасяджэнні Аблвыканкама Заха 2 снежня 1917 г. З дакладам выступіў камісар па нацыянальных пытаннях бальшавік С.Берсан, які як відавочны факт адзначыў фарміраванне нацыянальных украінскіх і чэшскіх палкоў. Берсан падкрэсліў, што фарміраванне новых, нацыянальных аддзелаў павінна дапускацца толькі ў тым выпадку, калі яны стаяць на строга рэвалюцыйных пазіцыях і будуць з'яўляцца абаронцамі заваёў пралетарыяту.

У спрэчках па дакладу выступіў бальшавік, беларус па нацыянальнасці, Васіль Муха. Ён горача прасіў падтрымаць беларусаў у арганізацыі сваіх палкоў для абароны інтарэсаў беларускага краю, таму што існуе пагроза ад палякаў, якія ўжо ўключылі беларускія землі ў склад польскай геаграфічнай карты. Муха патрабаваў вырашаць гэтае пытанне аднолькава для ўсіх нацый: альбо ўсім дазволіць фарміраванне нацыянальных палкоў, альбо нікому. На што яму адразу адпавядаў у рэзкай форме старшыня Абласнога Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронта К.Ландэр: "...у Ваенна-рэвалюцыйны камітэт амаль штодзенна паяўляюцца прадстаўнікі ўсялякіх "рад" і патрабуюць фарміравання сваіх палкоў, аднак гэтыя прадстаўнікі не з'яўляюцца голасам народа .Гэта вярхі сваёй нацыянальнасці, якія працуюць з капіталістамі, з буржуазіяй і

а'яўляюцца дамагатымі контррэвалюцыі... Нацыянальныя палкі самі па сабе нічога не вызначаюць: унутранан іх сутнасць альбо скрытая, альбо шавіністычная. Пагэтаму мы, — падкрэсліваў Ландэр, — прыняўшы ўсю ўладу на сябе, павінны адносіцца да фарміравання нацыянальных аддзелаў вельмі асцярожна, павінны разглядаць іх пад мікраскопам і выяўляць іх сутнасць. Зыходзячы з пункта гледжання Савецкай улады, прынцыпаў роўнасці і братэрства, мы можам дапусціць фарміраванне нацыянальных аддзелаў толькі ў тым выпадку, калі гэтае патрабаванне ідзе з народных глыбінь, ад рабочых і сялян і калі яны ставяць сваёй мэтай абарону заваёў рэвалюцыі і барацьбу з буржуазіяй".

Выступіўшыя затым беларусы-бальшавікі — Соркін і Піселкі рашуча выказаліся супраць фарміравання нацыянальных палкоў. Соркін адзначыў, што ён як член Савета сялянскіх дэпутатаў аб'ехаў Гомеленскі павет і добра ведае, што сяляне не жадаюць мець сваю армію, для гэтага няма ні ородкаў, ні сілаў. Сяляне стогнуць і галівацца крывёю ад таго, што ў іх ёсць: там знаходзяцца польскія легіёны, якія рабуюць і б'юць сялян. Таму, на яго думку, неабходна не толькі вывесці польскія легіёны, але і неадкладна іх распусціць. На што С.Берсан удакладніў, што расфарміраваць польскія легіёны па тэхнічных прычынах вельмі цяжка, аднак дэмакратызаваць іх магчыма. Прапанова Берсана была ўнесена як рэзалюцыя і паставлена на галасаванне, але яна не прайшла.

Па прапанове Піселкага прайшла рэзалюцыя, якая прадугледжвала неадкладнае расфарміраванне польскіх легіёнаў і недапушчэнне фарміравання беларускіх вайсковых аддзелаў, якія павінны былі быць заменены мужчынскай і жаночай міліцыяй і пралетарскай Чырвонай гвардыяй у гарадах і вёсках. (Газета "Советская правда", 6 снежня 1917 г.).

Аднак ужо на другі дзень на пасяджэнні бальшавіцкай фракцыі Аблвыканкамзаха гэтая рэзалюцыя як "небальшавіцкая" была адменена і прынята ў наступнай рэдакцыі:" Абмеркаваўшы пытанне аб прынятай рэзалюцыі пастанаўляем: затрымаць правядзенне ў жыццё адзначанай рэзалюцыі, дэмакратызаваць існуючыя нацыянальныя вайсковыя часткі і прапанаваць вайсковаму аддзелу выпрацаваць меры для ліквідавання ўсіх злачынстваў, якія творацца польскімі легіянерамі і прызнаць далейшае фармаванне нацыянальных палкоў недапушчальным".

31 студзеня 1918 г. газета "Советская правда" — орган выканкама Мінскага Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў — змясціла дэкрэт СНК Заходняй вобласці і фронта аб роспуску Беларускай вайсковай рады, а таксама зварот СНК да беларускага народа з "разоблачением контрреволюционных действий Белорусской рады". Гэтыя дакументы былі прыняты 30 студзеня, праз 5 дзён пасля арышту членаў ЦБВР і надрукаваны былі з яўнай палітычнай мэтай, каб скампраментаваць гэты орган беларускіх вайскоўцаў у вачах беларускага народа. Усё ж такі ён мэў, відаць, аўтарытэт у яго , калі бальшавікам прыйшлося фабрыкаваць кампрамат і звяртацца з адозвамі.

Пленная праца па стварэнню беларускіх вайсковых адзінак праводзілася ў 1917—пачатку 1918 г. на Румынскім фронце, дзе быў значны асяродак бедарускіх вайскоўцаў, якія, знаходзячыся далека за межамі Беларусі, марылі аб хутчэйшым вяртанні на радзіму. Якім жа чынам апынуліся беларусы ў Румыніі?

Як вядома 4 (17) жніўня 1916 года памiж дзяржавамі Антанты і Румыніяй былі падпісаны палітычная і ваенная канвенцыі. А ўжо праз 10 дзён Румынія аб'явіла вайну Аўстра-Венгрыі. Штуршком для ўступлення Румыніі на баку Антанты ў вайну паслужылі паспяховыя дзеянні рускай арміі Паўднева-Заходняга фронта пад камандаваннем генерала Брусілава. Да гэтага Румынія доўгі час вагалася каму аддаць перавагу. І на то ў яе былі важкія прычыны. Узброенныя сілы Румыніі складаліся на той час з чатырох армій, якія налічвалі каля 600 тысяч чалавек.

Аднак, ваенная фартуна не спрыяла каралю Фердынанду. У выніку кароткіх 4-х месячных баёў румынскія войскі пацярпелі паражэнне і амаль уся тэрыторыя Румыніі была занята германскімі войскамі. У такім становішчы расійскае кіраўніцтва вымушана было тэрмінова перакінуць на румынскі фронт значную колькасць сваіх войск: 85 пяхотных і 11 кавалерыйскіх дывізій і падоўжыць свой фронт тым самым на 500 кіламетраў.

Тады к сюды і была перакінута з Заходняга фронта 4-я армія і 6-я армія з Прыбалтыкі. У складзе гэтых армій была вялікая колькасць вайскоўцаў-беларусаў.

Якія ж абставіны выклікалі з'яўленне беларускага ва... руху на Румынскім фронце? Справа ў тым, што ні камандаванне фронтам, ні створаныя ў першыя дні пасля кастрычніцкага пераварота

па загаду зверху ваенна-рэвалюцыйныя камітэты не падтрымалі пераварот. Армейскі камітэт 4-й арміі асудзіў бальшавіцкі пераварот і выказаў гатоўнасць аказаць "самае моцнае процідзеянне паўстанню прадстаўленнем узброенай сілы".

Не прынялі пераварот армейскія камітэты таксама 9-й, 8-й і фактычна 6-й арміі.

Аднак бальшавіцкая агітацыя і прапаганда рабілі сваю справу і працэс дэмакратызацыі, ці дэмаралізацыі арміі фронту працягваўся.

У гэтай сітуацыі, камандуючы Румынскім фронтам кароль Фердынанд, па намаганню саюзнікаў, дазволіў фарміраваць нацыянальныя вайсковыя аддзелы. Гэтым спосабам саюзнікі спадзяваліся, -- пісаў у сваёй справаздачы ад 29 снежня 1920 года у Беларускую вайсковую камісію, палкоўнік Чуніхін-Карвацкі, што нацыянальны рух у гэтых аддзелах, дасць ім патрэбную апайнасць і дысцыпліну, дзякуючы чаму будзе магчымасць утрымаць супраць немцаў устойлівы фронт. К гэтаму часу беларусы на румынскім фронце ўжо мелі свае нацыянальныя арганізацыі".

Па рашэнню Беларускай вайсковай камісіі ранней за ўсё быў нацыяналізаваны 4-ы корпус, які да вайны доўга стаяў у Беларусі і складаўся амаль што з адных беларусаў. Гэты корпус у поўным сваім складзе з усімі аддзеламі і быў загадам па фронту аглошаны Беларускім. Апрача 4-га корпуса быў нацыяналізаваны Таўрагенскі пагранічны полк, які ўвесь складаўся з беларусаў. Загадам па фронту ён быў названы Беларускім Гусарскім Нацыянальным палком. Рабіліся захады аб перайменаванні ў беларускую 41-ю пяхотную дывізію, якая да вайны стаяла ў Віцебску і Магілёве.

Па меншымся звесткам былі аддадзены загады аб беларусізацыі таксама 43-й дывізіі, якая была далучана да 4-га армейскага корпусу, 26-га аўтабранявога аддзялення, 357-й Віцебскай і 401-й Менскай дружын.

Агульная колькасць беларускага войска на Румынскім фронце дасягала амаль 100 тысяч чалавек. Гэта была моцная сіла і пры ўмове яе арганізаванага вяртання на радзіму сітуацыя там магла стаць другой.

Беларускія аддзелы былі прыведзены ў патрэбны вайсковы парадак. Беларуская вайсковая камісія пачала клепаціцца аб тым, каб адправіць беларускія аддзелы на бацькаўшчыну, аднак Румынія рантам заключыла сепаратны мір з Аўстра-нямецкай кааліцыяй, паводле

якога ўсе, так званыя, рускія аддзелы ў Румыніі павінны былі дэмабілізавацца, а ўсё вайсковае ўзбраенне дастануць румынам.

Выкарыстаўшы адмову Троцкага падпісаць мірны дагавор, германскае камандаванне 16 лютага 1918 г. афіцыйна заявіла аб спыненні перамір'я і аднаўленні ваенных дзеянняў. 18 лютага германскія і аўстра-венгерскія войскі перайшлі ў наступленне на ўсім рускa-германскім фронце.

У ноч з 18 на 19 лютага бальшавіцкія ўлады на чале з В.Ландэрам пакінулі Мінск. У гэтых умовах Выканаўчы Камітэт Рады І-га Усебеларускага з'езду 19 лютага выдаў загад аб пераходзе ўлады ў яго рукі. Для падтрымання парадку ў горадзе камендантам быў прызначаны К.Езавітаў.

21 лютага Выканкам Рады отварыў беларускі ўрад -- "Народны сакратарыят Беларусі", ці,як умацавалася ў савецкай гістарыяграфіі, "контрреволюционное правительство". Аб гэтай падзеі абвясціла Першая Устаўная Грамата. Узначаліў урад Язэп Варонка. У гэты ж дзень нямецкія войскі ўвайшлі ў Мінск. 24 лютага дэлегацыя ўраду (Я.Варонка, К.Езавітаў, А.Смоліч) наведала прадстаўніка нямецкай ваеннай улады ў Мінску каб засведчыць факт свайго існавання і выказаць сваё стаўленне да акупацыйных улад.

Аднак немцы прыдалі гэтаму факту мала ўвагі. 25 лютага яны прымусова высялілі Народны Сакратарыят з займаемага будынку.

Справа ў тым, што Беларусь не была абвешчана дзяржавай. І таму нямецкае кіраўніцтва разглядала яе часткай савецкай Расіі. Такім чынам гэтае пытанне ставілася і на перамовах у Брэсце.

9 сакавіка адбылося ўрачыстае пасяджанне Выканкама І-га Беларускага з'езда. Да гэтага часу ён быў папоўнены прадстаўнікамі партый: сацыялістаў-рэвалюцыянераў, меньшавікоў, Паалей-Цыёна і інш. Усяго ў Выканкам уваходзіла 71 чалавек. На гэтым пасяджанні Беларусь была аб'яўлена Народнай рэспублікай. А 25 сакавіка 1918 г. Беларуская Народная Рэспубліка была абвешчана незалежнай. З першых дзён свайго існавання урад БНР меў намер сфарміраваць сваё войска. Аднак на шляху выканання гэтага, зусім зразумелага для любой дзяржавы намеру, было шмат цяжкасцей. Афіцыйна немцы не прызналі ўрада БНР і, натуральна, яны не былі зацікаўлены ў існаванні на захопленай імі тэрыторыі ўзброеных часцей гэтага ўраду. Ва ўрадзе БНР пасаду народнага сакратара па вайсковых справах займаў Кастусь Езавітаў. Перад ім стаяла задача правядзення працы сярод аддзелаў былой Беларус-

кай Вайсковай Цэнтральнай рады (БВЦР) з мэтай стварэння з іх, а таксама з беларускіх вайсковых аддзелаў, якія меліся па-за межамі Беларусі войска БНР.

Такім чынам, у 1918 годзе, пад час нямецкай акупацыі, урад БНР не здолеў стварыць сваю збройную сілу. З адыходам немцаў з Беларусі, а затым падзеннем пад польскім націскам Літоўска-Беларускай ССР, БНР аднавіла дзейнасць па фармаванню беларускага войска. Гэтай справай у 1919-1921 гадах займалася Беларуская Вайсковая Камісія, якая была створана 22 кастрычніка 1919 г. загадам Начальніка Польскай дзяржавы Ю.Пілсудскага. У склад Камісіі ўваходзілі: П.Алякснік (старшыня), А.Аўсянік, А.Прушынскі (Алесь Гарун), Д.Якубоўскі, Ф.Кушэль, А.Якубецкі, С.Рак-Міхайлоўскі, Ю.Мурашка. Камандуючым беларускім войскам быў прызначаны палкоўнік Г.Канапацкі, які таксама ўваходзіў у склад Камісіі, але падпарадкоўваўся непасрэдна польскім ваенным уладам.

Нягледзячы на прыкметную актыўнасць Камісіі, справа арганізацыі беларускага войска рухалася марудна. Да лета 1920 г. пад эгідай Камісіі ўдалося скамплектаваць толькі адну роту у Мінску. Адной з прычын такога становішча было тое, што на польскай палітычнай арэне існавалі уплывовыя сілы, не зацікаўленыя у набыцці народамі Беларусі, Літвы і Украіны якой-небудзь самастойнасці. Іх палохала перспектыва умацавання беларускай дзяржаўнасці ў выніку стварэння беларускага войска. У выніку, з вясны 1920 г. БВК была фактычна адхілена ад удзелу ў фарміраванні беларускіх вайсковых адзінак. Згодна з распараджэннем польскіх улад гэтае права стала належаць выключна вярбоўчаму інспектару Цывільнага управалення Усходніх зямель. У ліпені 1920 г. тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад польскіх войскаў. Дзейнасць БВК (у іншым складзе) аднавілася ў г. Лодзь у кастрычніку 1920 г. і працягвалася да Рыжскага міру.

22 студзеня 1920 г. у склад Беларускага войска быў залічаны атрад генерала Станіслава Булак-Балаховіча, які налічваў каля 2 тысяч чалавек. У сакавіку 1920 г. атрад перадыслакаваўся з Эстоніі ў Брэст, дзе быў залічаны як беларуская вайсковая адзінка у склад польскага войска. Пад час восеньскага наступлення 1920 г. польскай арміі Балаховіч кіраваў, так званай, Рускай добраахвотніцкай арміяй. Пасля заключэння 12 кастрычніка 1920 г. Рыжскага прэлімінарнага міру войска Балаховіча рушыла вызва-

лянъ Беларусь. Захапіўшы ў лістападзе 1920 г. Тураў, а затым Мазыр, Балаховіч аб'явіў сябе начальнікам Беларускай дзяржавы. Прыкладна ў гэты ж час пачалося Слуцкае паўстанне. Чырвоная Армія разграміла войскі Балаховіча і слуцкіх паўстанцаў. Рэшткі гэтых беларускіх вайскоўцаў перайшлі ў Польшчу, дзе была інтэрнавана палякамі.

Беларускія аддзелы існавалі таксама ў 1919-1923 гг. у Літоўскай арміі. Найбольш значнай вайсковай адзінкай з'яўляўся 1-ы пяхотны Гародзенскі полк, які быў створаны ў студзені-лютым 1919 г. У час польска-літоўскай вайны 1920 г. полк коратка супрацьстаяў палякам, многія жаўнеры загінулі ці трапілі ў турмы. Толькі аднаму батальёну пад камандаваннем палкоўніка Успенскага удалося прабіцца ў Коўню. Пры батальёне выдаваўся часопіс "Съветазар". На Дзвінскім фронце у складзе літоўскай арміі змагаўся асобны беларускі батальён пад камандаваннем маёра Рукянец-Рукянцова. Батальён выдаваў часопіс "Варта Бацькаўшчыны".

Захапіўшы у кастрычніку 1917 г. уладу, бальшавікі рабілі ўсе магчымае каб яе ўтрымаць і правесці ў жыццё свае планы. З першых дзён з цвердых прыхільнікаў новай улады фарміраваліся "рэвалюцыйныя" і "сацыялістычныя" атрады і палкі. Новая ўлада абяцала хутка скончыць вайну, вярнуць салдат у родныя сем'і, да ўласнай гаспадаркі. Гэта імпанавала настрою вайскоўцаў і ў пэўнай меры абумоўлівала іх паводзіны.

У канцы снежня 1917 г. пытанні фарміравання рэвалюцыйных войск былі разгледжаны ў Мінску на франтавой нарадзе прадстаўнікоў 2-й, 3-й і 10-й армій. Згодна прынятай пастанове арганізацыя рэвалюцыйных часцей ускладалася на рэўкомы, салдацкія камітэты і мясцовыя саветы. Меркавалася фарміраваць рэвалюцыйныя дружыны, атрады, роты, батальёны, палкі і нават дывізіі.

Выконваючы пастановы і загады Галоўнакамандуючага Заходнім фронтам А.Ф.Мяснікова, існаваўшыя мясцовыя Саветы і рэвалюцыйныя камітэты разгарнулі даволі значную дзейнасць у азначаным накірунку. Так, на праходзіўшым 9 студзеня 1918 г. у Віцебску аб'яднаным пасяджанні губернскага і гарадскога Саветаў былі выпрацаваны меры па стварэнню сацыялістычнай народнай гвардыі. Выканкомы Саветаў абявазваліся умацаваць свае ваенныя секцыі, дзеля чаго меркавалася накіраваць туды рэвалюцыйна вытрыманых прадстаўнікоў.

Аналагічным чынам дзейнічалі і другія мясцовыя Саветы ўсходніх, не акупаваных немцамі раёнаў Беларусі. Прыкладам у гэтым

накірунку з'яўляўся 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета, які ўзнік у кастрычніцкія дні 1917 г. У Мінскім гарнізоне заяву аб сваім прыходзе Савецкай уладзе зрабілі таксама салдаты і прапаршчыкі 37-га і 289-га пяхотных палкоў, кавалерыйскі эскадрон і батарэі зенітных гармат. У 2-й арміі быў створаны сацыялістычны атрад народнай арміі колькасцю за тысячу чалавек. З асабовага складу 3-й арміі былі ўтвораны 1-я і 2-я дывізіі народна-сацыялістычнай гвардыі — па тысячы чалавек у кожнай. Аналагічным чынам бальшавікі і іх прыхільнікі дзейнічалі ў часцях і падраздзяленнях прыфрантавой і франтавой паласы. У канцы 1917 г. у Магілёве ўзніклі наступныя рэвалюцыйныя фарміраванні: рэвалюцыйны атрад салдат Георгіеўскага батальёна, зводны атрад 27-га армейскага корпусу, этарны батальён, рэвалюцыйныя батарэі. У Оршы быў створаны Беларускі конны дывізіён.

Як ужо адзначалася раней, апрача зводных шматнацыянальных стваралiся таксама і нацыянальныя ваенныя падраздзяленні, у тым ліку польскія, латышскія, літоўскія і беларускія.

Вынікам дзейнасці бальшавікоў Беларусі і Заходняга фронту з'явілася тое, што на іх бок у канцы снежня 1917 г. перайшло каля 15 палкоў пяхоты і 8 артылерыйскія брыгады.

У студзені 1918 г. Саветы і рэўкомы пачалі адыходзіць ад першапачатковай ідэі агульнага ўзбраення працоўных мас і стварэння пастаяннага рэвалюцыйнага войска пры добраахвотным прынцыпу камплектавання часцей і падраздзяленняў. 15 (28) студзеня 1918 г. Ленін падпісаў дэкрэт СНК аб арганізацыі на добраахвотных пачатках Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі (РСЧА).

Працэс стварэння часцей Чырвонай Арміі на Беларусі згодна з дакрэтам больш шырока пачаўся пасля заняцця Мінска немцамі. Як адзначаецца ў справаздачы Аблвыканкамзаха, да красавіка 1918 года ў Заходняй вобласці ў Чырвоную Армію запісалася каля 10 тыс. чалавек. Да канца 1918 г. у Віцебскай і Магілёўскай вобласці добраахвотнікамі ў Чырвоную Армію запісалася больш як 30 тыс. рабочых і сялян. Былі сфарміраваны 1,2,3,4 і 5-ы чырвонаармейскія палкі імя Віцебскага Савета, Сенненскі народны полк, 1-ы Мсціслаўскі народны батальён, 1-ы Рэвалюцыйны полк Аршанскага Савета. Атрады Чырвонай Арміі былі створаны таксама ў Быхаўскім, Чаўскім, Чэрыкаўскім і іншых паветах. Летам 1918 г. Савецкі ўрад пераходзіць ад добраахвотнага прынцыпу фарміравання Чырвонай Арміі да прызыўной сістэмы, да абавязковай ваеннай службы працоўных

у арміі. З верасня 1918 г. да канца года з Беларусі было прызвана ў Чырвоную Армію каля 100 тысяч рабочых і працоўных сялян, на месцах наладжвалася ваеннае навучанне працоўных. З Беларусі на Усходні фронт у 1918 г. былі накіраваны 1-ы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета, 2,3-ці палкі імя Віцебскага савета, падраздзяленні Магілёўскай дывізіі, а таксама ўкамплектаваныя на Беларусі штабы 1-й Смаленскай і 1-й Арлоўскай дывізій. Апрача гэтага на Усходні фронт былі накіраваны асобны інжынерны батальён імя Віцебскага Савета і перасоўны шпіталь 1-й Смаленскай дывізіі.

Цікава зазначыць, што ў газеце "К оружію" была заведзена спецыяльная рубрыка "На фронтах в районе действий Витебских полков". 9 снежня 1918 г. у газеце быў надрукаваны матэрыял пад назвай "Доблесть Витебских красноармейских полков", у якім паведамлялася, што 3-ці Віцебскі полк вядзе паспяховае наступленне на Арэнбург, яго падраздзяленні знаходзяцца ў сцен самага горада, у выніку дзесяцігадзіннага бою яны вызвалілі населеныя пункты Кіндзельскае і Варшаўскае. 28 снежня тая ж газета надрукавала матэрыял аб мужнасці салдат і камандзіраў 1-га Віцебскага палка пад камандаваннем Чабатарова. У артыкуле адзначалася, што чырвонаармейцы гэтага палка сваёй крывёй даказалі "беззаветную преданность делу революции и интересам пролетариата".

У армейскім друку паведамлялася таксама аб мужнасці салдат і камандзіраў 1-га і 2-га Магілёўскіх, Аршанскага, Сенненскага, Гомельскага і іншых беларускіх палкоў.

Як вядома, у 1919 г. бальшавіцкая ўлада на Беларусі мяняла сваё аблічча некалькі разоў. Спачатку была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь - ССРБ. Затым не злілі з Літвой і абвясцілі аб утварэнні Літоўска-Беларускай ССР (Літбел), потым зноў абвясцілі аб утварэнні ССРБ. На войсках гэта адбівалася яшчэ горш. Таму ў маі 1919 г. ЦК РКП(б) прымае дырэктыву аб ваенным адзінстве. Згодна гэтага дакумента войсковыя часці, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларуска-Літоўскай ССР былі аб'яднаны ў 16-ю армію, якая падпарадкоўвалася Рэўваенсавету. Замест ваенных аддзелаў пры выканкамах Саветаў паўсюдна сталі стварацца ваенныя камісарыяты.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны было праведзена значнае скарачэнне ўзброеных сіл, давядзенне іх да 1 лютага 1923 г. да мінімальна неабходнай колькасці ў 600 тыс. чалавек для падтры-

мання ваеннай бяспекі краіны.

Чырвоная Армія пераводзілася на тэрытарыяльна-міліцыйныя умовы існавання, што прадугледжвала рэўнамернае размяшчэнне часцей па ўсёй краіне, а не паблізу найбольш небяўных у ваенных адносінах пунктаў нападу праціўніка, як было раней.

Пераход да тэрытарыяльнай сістэмы будаўніцтва арміі быў вымушанай мерай, якая была выклікана перш за ўсё эканамічнымі цяжкасцямі краіны, неабходнасцю скарачэння затрат дзяржавы на ўтрыманне арміі.

"Канешне, калі б перад намі быў выбар паміж I[1]/2-2-мільённай кадравай арміяй і сучаснай сістэмай міліцыі, - адзначаў М.Фрунзе, - дык з ваеннага пункту погляду ўсе дадзеныя былі б у карысць першага рашэння. Аднак такога выбару ў нас няма. А сістэма міліцыі ў сукупнасці з кадравымі часцямі забяспечвае абарону Саюза, безумоўна, дае".

Заканадаўча змешаная сістэма камплектавання Чырвонай Арміі была замацавана дэкрэтам УЦВК і СНК ад 8 чэрвеня 1923 г. "Аб арганізацыі тэрытарыяльных войсковых часцей і правядзенні ваеннай падрыхтоўкі працоўных", які ўстанавіў асновы арганізацыі, камплектавання і парадак праходжання службы ў міліцыйных часцях.

На тэрыторыі Заходняй ваеннай акругі, якая ў асноўным размяшчалася ў Беларусі, першым тэрытарыяльным фарміраваннем стала 2-я Беларуская дывізія, створаная ў 1928 г. на падставе 2-й Тульскай стралковай дывізіі. Яе палкі і асобныя падраздзяленні дыслакаваліся ў Барысаўскім, Ігуменскім (Чэрвеньскім), Слуцкім і Мінскім раёнах. Штаб дывізіі размяшчаўся ў Мінску. 10 верасня 1928 г. пачаўся першы вучэбны збор пераменнага складу гэтага фарміравання. Праз два тыдні прызыўнікі прынялі войсковую прысягу. Пасля гэтага камандуючы Заходняй акругай А.І.Корк уручыў дывізіі Чырвоны сцяг. Фактычна гэты акт і паклаў адлік гісторыі будавання беларускіх тэрытарыяльна-міліцэйскіх часцей у складзе адзінай Чырвонай Арміі. У інтарэсах падрыхтоўкі нацыянальных кадраў у Заходняй акрузе была створана Беларуская аб'яднаная войсковая школа імя ЦВК БССР. Нягледзячы на складаныя ўмовы (адсутнічанне неабходных навучальных дапаможнікаў, кадраў, добра валодаўшых нацыянальнай мовай, выпрацаванай тэрміналогіі, нізкі агульнаадукацыйны ўзровень курсантаў і г.д.), новы навучальны цэнтр змог наладзіць работу і ва ўстаноўлены тэрмін падрыхтаваць неабходную колькасць нацыянальных камандзі-

рау. Са сцен аб'яднанай Беларускай школы выйшлі такія, стаўшыя потым добра вядомымі ваеначальнікамі, як У.Ф.Маргелаў, У.А.Пянькоўскі, І.І.Якубоўскі і іншыя.

У наступныя гады работа па пераводу войск Заходняй акругі на тэрытарыяльна-міліцыйны прынцып камплектавання працягвалася. На новы вайсковы стан перайшоў 16-ы стралковы корпус (Магілёў), 29-я Вяцкая стралковая дывізія (2 палкі яе размяшчаліся ў Беларусі, а астатнія часці — на Смаленшчыне), 27-я Омская стралковая дывізія (дыслакавалася ў Віцебску і Оршы), 38-я Самарская стралковая дывізія (на Магілёўшчыне). У пачатку 30-х гадоў яна стала нацыянальнай дывізіяй, паколькі ў яе складзе беларусы перабольшвалі 80%, а таксама 37-я (два палкі якой размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі). Такім чынам, з меўшыхся на тэрыторыі Заходняй (з кастрычніка 1926 г. — Беларускай) ваеннай акругі 28 злучэнняў (17 стралковых, 5 кавалерыйскіх, 1 дэсантнае) толькі 5 сталі тэрытарыяльна-міліцыйнымі.

Трэба адзначыць, што да канца 20-х гадоў цэнтральныя ўлады (партыйныя, савецкія і ваенныя) вельмі стаўча адносіліся да працэсу фарміравання тэрытарыяльна-міліцыйных часцей.

Характэрнай рысай гэтага працэсу ў Заходняй ваеннай акрузе з'яўлялася тое, што ў новых вайсковых структурах даволі сур'ёзна праводзілася палітыка беларусізацыі. У першую чаргу яна, безумоўна, закранула тыя часці і падраздзяленні, якія ў большасці сваёй былі ўкамплектаваны з ліку карэннага мясцовага насельніцтва. Такія фарміраванні фактычна станавіліся нацыянальнымі. Першым нацыянальным фарміраваннем у Заходняй ваеннай акрузе, як зазначалася вышэй, стала 2-я Беларуская стралковая дывізія, дзе колькасць беларусаў дасягала да 60 працэнтаў. Беларускім стаў і 16-ы стралковы корпус. У трох палках 38-й стралковай дывізіі (97, 98 і 99-м) 40 працэнтаў старэйшых і сярэдніх камандзіраў паходзілі з Беларусі, а сярод малодшых камандзіраў гэты працэнт перавышаў лічбу 90.

У інтарэсах паспяховай падрыхтоўкі нацыянальных вайсковых кадраў друкаваліся беларускія ламантары, падручнікі, слоўнікі-дапаможнікі, статуты. Існаваў спецыяльны вайсковы сектар Дзяржвыдавецтва Беларусі. Да 1935 г. (пачатак згортвання тэрытарыяльных часцей і злучэнняў) ён надрукаваў 418 найменняў кніг і брашур, прычым па руску было надрукавана толькі 8. У акруговай газеце "Чырвонаармейская праўда" змяшчаўся асобны "куток беларуса".

спецыяльная рубрыка прысвячалася непасрэдна пытанню беларусізацыі ў вайсковых часцях. У штабе акругі існавала спецыяльная камісія па перакладу на беларускую мову вайсковых статутаў і распрацоўкі беларускай ваеннай тэрміналогіі.

У 1927 г. быў выдадзены "Практычны беларускі вайсковы слоўнік". Пры яго ўкладанні былі выкарыстаны апрацаваныя Вайсковай Камісіяй Інбелкульту лексічныя матэрыялы, укі выдадзеныя выпускі Беларускай Навуковай Тэрміналогіі. Слоўнік налічваў каля дзесяці тысяч слоў і ўстойлівых словаалучэнняў трох функцыянальных групаў.

У дапамогу камандзірам-небеларусам арганізоўваліся спецыяльныя падрыхтоўчыя курсы. Значную дапамогу ва ўсёй справе беларусізацыі войска аказвалі навукоўцы і супрацоўнікі Беларускага інстытута культуры, Беларускай Акадэміі навук, наркамата адукацыі БССР і іншыя ўстановы рэспублікі. Агульнымі намаганнямі камандавання, саміх вайскоўцаў, а таксама шырокага кола дзяржаўных і грамадскіх устаноў БССР да канца 20-х гадоў была закончана беларусізацыя 2-й Беларускай, 33-й Самарскай стралковых дывізій, а таксама Аб'яднанай Беларускай школы. Гэты працэс працягваўся і ў іншых часцях, што станоўча адбівалася на ўзроўні баявой падрыхтоўкі войск.

Трэба адзначыць, што адначасова з палітыкай стварэння нацыянальных вайсковых фарміраванняў у войску пашыралася інтэрнацыянальнае выхаванне вайскоўцаў у яскрава акрэсленым накірунку "пралетарскага інтэрнацыяналізму". Летам 1924 г., пад час работы V канграса Камінтэрна над шэрагам дывізій, якія дыслакаваліся на Беларусі, устанавілі шэфства камуністычныя і рабочыя партыі замежных краін. У сувязі з гэтым злучэнні атрымалі наступныя назвы: 7-я Самарская імя Англійскага пралетарыята дывізія, 4-я стралковая імя Германскага пралетарыята дывізія, 5-я Віцебская імя Чэхаславацкага пралетарыята дывізія, 27-я Омская імя Італьянскага пралетарыята дывізія і інш.

Як праходзіў гэты працэс і якія ён ставіў "стратэгічныя" мэты, можна ў нейкай меры меркаваць па публікацыі ў газеце "Звезда" ад 8 ліпеня 1924 года пад агульнай рубрыкай "Германскія камуністы ў Беларусі". Газета падрабязна расказала аб прыездзе ў Бабруйск трох дэлегатаў V канграса (Фельдманс - столяра з Гамбурга, Кілле - вугальшчыка з Верхняй Сілезіі, Якобса - камсамольца з Рура), аб іх выступленнях перад вайско-

ўцамі, аб заданнях, якія ставілі шэфы. Так, Першаму палку дывізіі было дадзена імя Рурскага пралетарыята. (Гэта сімвал таго, што неабходна выгнаць французаў з Рурскай вобласці, разбіць міжнародную буржуазію і не самым высокім месцы Рура ўстанавіць Чырвоны сцяг).

Другому палку дадзена імя Берлінска-Брандэнбургскага пралетарыята (у знак помсты за рэвалюцыянераў, якія загінулі ў Берліне, неабходна праз Брандэнбургскія вароты заняць сэрца Германіі — Берлін).

Трэці полк атрымаў імя Гамбургскага пралетарыята (неабходна захапіць Гамбург і замацавацца ў порце Гамбурга на стратэгічным пасту) і г.д.

У заключэнне газета паведаміла, што нямецкія дэлегаты сталі ганаровымі чырвонаармейцамі, ім былі выдадзены чырвонаармейскія кніжкі і па камплекту абмундзіравання.

Прыкладна па такому сцэнарыю праходзілі сустрэчы і з дэлегатамі іншых кампартый.

Як бачым, у 20-я гады мрою аб неабходнай будучай сусветнай рэвалюцыі з'яўляліся пануючымі ў вайсковых казармах. У сваім прывітанні да чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў 5-й стралковай Віцебскай дывізіі прадстаўнік ЦК КП Чэхаславакіі пісаў: "Ніколі яшчэ ў гісторыі не было ваеннай арганізацыі, якая б ва ўсіх краінах свету мела сяброў і саюзнікаў сярод шырокіх мас працоўных. Першай у такім стане знаходзіцца ваенная арганізацыя рабочых і сялян СССР — Чырвоная Армія. Мы зробім усё магчымае, каб нашае шэфства вызначылася ў яшчэ больш цеснай, пастаяннай, канкрэтнай сувязі рабочых і сялян, Чэхаславакіі з 5-й стралковай дывізіяй".

Практычная дзейнасць тэрытарыяльных вайсковых фарміраванняў, ажыццяўленне ў ходзе ваеннай рэформы 20-х гадоў паказала, што пры пэўнай колькасці кадравых вайсковых частак, выкарыстоўваючы тэрытарыяльна-міліцыйны прынцып камплектавання, стварэнні нацыянальных фарміраванні, магчыма было ахапіць ваенным навучэннем шырокія масы насельніцтва, падрыхтаваць іх да абароны. Разам з тым, далейшая цэнтралізацыя кіраўніцтва, стварэнне ўнітарнай тоталітарнай дзяржавы, пагаршэнне міжнароднага становішча і павялічэнне ваеннай пагрозы патрабавала і адпаведнай будовы арміі.

З восені 1929 г. у Беларусі пачалося інтэнсіўнае стварэнне негатыўнага вобраза "нацдэмаўшчыны". Гэты прадэ ахапіў усе сферы. На справе гэта азначала адмову ад палітыкі беларусізацыі. Разгортванне бескампраміснай барацьбы з нацдэмаўшчынай і іншымі "ворагамі народу фактычна сведчыла аб рэалізацыі прынцыпа іншай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі — палітыкі антыбеларусізацыі. Што ж датычыць лёсу тэрытарыяльна-нацыянальных фарміраванняў, то ён таксама вырашаўся ў агульным накірунку антынацыянальнага псіхозу. У сярэдзіне — другой палове 30-х гадоў дзесяткі і сотні вядомых кадраў Беларускай акругі былі беспадстаўна рэпрэсаваны і многія з іх загінулі ў сталінскіх гулагах. А тыя, хто волей лёсу ўцалеў, вымушаны былі падпарадкавацца новым запатрабаванням у ваеннай палітыцы: у 1935—1938 гг. Чырвоная Армія стала праводзіцца выключна на кадравы прынцып арганізацыі і камплектавання. Гэты прынцып быў канчаткова замацаваны пастановай ЦК ВКП(б) ад 7 сакавіка 1938 г. і загадам Наркома абароны СССР К.Варашылава ад 16 сакавіка таго ж года, згодна якіх тэрытарыяльна-нацыянальныя часці і злучэнні рэарганізоўваліся ў рэгулярнасаставныя, кадравыя. Такая сістэма праіснавала да распаду СССР, абвяшчэння былымі савецкімі рэспублікамі дзяржаўнага суверэнітэту.

У гады вайны ў поўнай меры выразна акрэслілася існаванне ў беларускім грамадстве двух плыняў — камуністычнай і нацыянальнай. Некаторая частка людзей займала выжыдальную пазіцыю, імкнулася захаваць свае жыццё, жыццё сваёй сям'і, слабістай маёмасці. Дамінуючай і найбольш актыўнай з'явілася першая плынь. Яна мела на сваім баку моцныя рэпрэсіўныя, арганізацыйныя структуры, падтрымку большасці свайго народа, дзяржавы, рэгулярнай арміі.

Беларускі нацыянальны рух на першым этапе вайны не ўяўляў значнай сілы. Робячы стаўку на падтрымку акупантаў, ён зразумела, не мог разлічваць на сімпатыі шырокіх народных мас. Пад канец вайны па розныя бакі барыкад аказалася значная колькасць людзей, якія фанатычна верылі ў абараняемыя ідэалы.

У сакавіку 1944 г. пасля цяжкіх параженняў немцаў на ўсходнім фронце, акупацыйныя ўлады далі згоду Беларускай Цэнтральнай Радзе (БЦР) на фарміраванне аддзелаў Беларускай Краёвай Абароны (БКА). Некалькі падраздзяленняў БКА былі ўтвораны з фарміраванняў беларускай самааховы. У ліпені 1944 г. частка гэтых фар-

міраванняў адступіла разам з гітлераўцамі. Спачатку яны былі дыслакаваны ў Аўстрыі, а потым перакінуты на тэрыторыю Германіі. Нямецкае камандаванне намагалася выкарыстаць іх на Заходнім фронце, але дарэмна: большая частка беларускіх жаўнераў перайшла на бок 8-й брытанскай і 3-й амерыканскай армій. Прычым, многія жаўнеры БКА за мужнасць у змаганні з гітлераўцамі былі ўшанаваны амерыканскімі, англійскімі і італьянскімі ўзнагародамі.

ТЭМА 22. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У 1921--1939 гг. УЗ"ЯДНАННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА.

Вучэбныя пытанні. 1. Эканамічнае і палітычнае становішча. 2. Нацыянальна-вызваленчы рух у 1921--1924 гг., узброеная барацьба партызан. 3. Беларуская сялянска-рабочая грамада і вызваленчая барацьба у 1925 -- першай палове 1929 г. 4. Барацьба за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне у 1929--1933 гг. 5. Антыфашысцкі народны фронт -- 1934--1939 гг. 6. Уз"яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

У выніку польска-савецкай вайны 1919--1920 гг. Беларусь была разарвана на дзве часткі. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. заходнія землі (40% тэрыторыі) далучаны да Польскай дзяржавы. Тут былі уведзены прынятыя у Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел -- ваяводствы, паветы, гміны. Тэрыторыя Віленскага, Навагрудскага, Палескага і большай часткі Беластоцкага ваяводстваў, населеная пераважна беларусамі, атрымала у грамадскасці назву Заходняя Беларусь. Плошча яе складала больш 112 тыс. кв.км., а насельніцтва у 1931 г. -- 4,6 млн. чалавек.

Сацыяльна-эканамічнае становішча Польшчы і палітыка яе урада вызначаліся панаваннем буржуазіі і памешчыкаў, залежнасцю ад замежнага капіталу. Эканамічная палітыка правячых колаў была накіравана на тое, каб пакінуць "усходнія крэсы" (ускраіны) у становішчы аграрна-сыравіннага прыдатку больш развітых прамысловых раёнаў карэннай Польшчы. Польскія і замежныя капіталісты выкачвалі багацці Заходняй Беларусі, асушаючы край на адсталасць і галечу.

Заходняя Беларусь была адсталай ускраінай Польскай Рэспублікі. У 1931 г. 85% насельніцтва жыло у вёсцы і толькі 15 у горадзе. 79% было занята сельскай гаспадаркай. Складаючы 23 тэрыторыі і 11% насельніцтва краіны, Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы у 1937 г. мелі толькі 2,8% прадпрыемстваў і 1,9% рабочых. З іх пераважную большасць складалі дробныя прадпрыемствы, занятыя перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі і мясцовай сыравіны.

Працуючы па 10--12 гадзін, рабочыя Заходняй Беларусі атрымлівалі у 1,2--2 разы менш, чым у цэнтральных і заходніх раёнах Польшчы. Больш 1/3 заробку паглынала кватэрная плата.

Многія рабочыя жылі у напауразбураных хібарах, сырых падвалах, халодных бараках. Большасць не атрымлівала аплачанага адпачынку, не была застрахавана. Расло беспрацоўе. У 1927 г. толькі 13,6% зарэгістраваных беспрацоўных атрымлівалі мізерную дапамогу.

Асабліва у цяжкім стане апынулася эканоміка Заходняй Беларусі у перыяд эканамічнага крызісу 1929--1933 гг. Колькасць рабочых на сярэдніх і буйных прадпрыемствах з 1928 па 1933 г. скарацілася на 46%, заработная плата да 1932 г. зменшылася на 39%. Толькі зарэгістраваных беспрацоўных у 1931 г. налічвалася 16,1 тыс. Не вытрымліваючы канкурэнцыі рамеснікі беднелі і разараліся, папаўняючы рады гарадскога пралетарыята.

У сельскай гаспадарцы панаўчае становішча займалі памешчыкі. У 1931 г. у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах каля 4,5 тыс. уладальнікаў (0,75% гаспадарак) з плошчай маёнткаў больш 50 га валодалі 3,2 млн. га зямлі (38%). З іх 83,7% належалі польскім памешчыкам. У той жа час 610 тыс. сялянскіх гаспадарак мелі 4320 тыс. га зямлі (51,4%).

Зямельная рэформа праводзілася на карысць памешчыкаў, сельскіх багацеяў. Урад выкарыстоўваў яе для насаджэння на "крэсах" польскіх вайсковых каланістаў-асаднікаў, якія служылі апорай улады. Да 1930 г. у заходнебеларускіх ваяводствах іх пасялілася 4840. Астатнюю зямлю, што ішла на мэты рэформы, купляліпераважна капіталісты, чыноўнікі, заможныя сяляне. Сельскагаспадарчыя рабочыя, большасць дробных арэндатараў, што працавалі на гэтай зямлі, страцілі сродкі існавання.

Да 1939 г. больш у прымусовым парадку былі выведзены на хутары 259 тыс. (43%) сялян. Хутарная гаспадарка дазваляла палепшыць апрацоўку зямлі, падняць яе прадуктыўнасць. Але толькі заможныя умацавалі сваё становішча. Выдаткі на правядзенне камасацыі (хутарызацыі) і перасяленне пагоршылі становішча беднякоў. Таму большасць сялян была супраць хутароў. Памешчыкі з дапамогай улады адбіралі у сялян сервітуты -- пашы, выганы.

Ва умовах малазямелля сялян сельская гаспадарка не магла нармальна развівацца. Сярэдні ураджай збожжавых у сялянскіх гаспадарках складаў каля 7 ц з гектара. Агульныя неўраджаі паўтараліся праз кожныя 2--3 гады. І тады галадалі дзесяткі тысяч беднякоў. Сельская гаспадарка знаходзілася у стане хранічнага застою.

Нягледзячы на тое, што большая частка сялян. У 1939 г. беднякі складалі каля 75%, сярэднякі 20%, заможныя --5% гаспа-

дарак. У 1927 г. каля 30% сялян не мелі коней, 13.5% — карову. Сяляне вымушаны былі за мізерную плату ісці на падсобную работу да памешчыкаў. Голеча вымушала іх збягаць у дарогі, за якія прыходзілася адпрацоўваць. У пошуках працы і хлеба ехалі яны ў краіны Заходняй Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. З 1925 па 1938 гг. з трох ваяводстваў выехалі на пастаяннае жыхарства ў іншыя краіны 78,1 тыс. чалавек.

У пачатку 30-х гадоў падаткі былі ў 3—4 разы вышэй, чым да сусветнай вайны. Лры спагнанні іх улады часта звярталіся да прымусу, канфіскацыі маёмасці.

Сельскагаспадарчыя рабочыя знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад памешчыкаў. Працягласць рабочага дня нярэдка дасягала 16 гадзін. Стрэцішы працу больш ясць іх не ,эгістрыравалася як беспрацоўныя і ніякай дапамогі не атрымоўвала.

Жыццевы ўзровень насельніцтва Заходняй Беларусі быў значна ніжэй, чым у цэнтральных і заходніх раёнах Польшчы і ніжэй, чым да рэвалюцыі. Сяляне насілі даматкаиую адзежу і лапці, дзялілі запалкі на часткі, рабілі дамашнюю работу пры газоўцы.

Насуперак умовам Рыжскага дагавора і трактата аб нацыянальных меншасцях, падпісанага Польшчай у 1919 г., польскія ўлады устанавілі жорсткі нацыянальны прыгнет беларускага насельніцтва. Яны імкнуліся выкараніць нацыянальную свядомасць і апалячыць беларусаў. Фальсіфікаваліся статыстычныя звесткі аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі. У 1931 годзе, паводле афіцыйнай статыстыкі, у Віленскім, Навагрудскім, Палескім ваяводствах беларусы складалі 22,5 % насельніцтва, а палякі 42,7%. Да палякаў залічвалі і беларусаў-каталікаў. Яшчэ 707 тысяч чалавек (20,4%) пераважна на Палессі былі запісаны "тутэйшымі" як нацыянальна несвядомыя. На самой справе у сучасных граніцах Рэспублікі Беларусь беларусаў было больш 77%, палякаў каля 10, яўрэяў — 8, рускіх 2 %. Усяго у Віленскім, Навагрудскім, Палескім і Беластоцкім ваяводствах беларусаў налічвалася не 934 тыс., а 2,9 млн. чалавек.

З першых гадоў захопу краю польскія ўлады пачалі закрываць беларускія школы, якіх тут у 1918—1919 гг. было адкрыта каля 350. У 1925 г. засталіся толькі 4беларускія школы. У 1927—1928 гг. пад націскам нацыянальна-вызваленчага руху былі адкрыты 29 беларускіх і 49 змешаных польска-беларускіх школ. У Вільні, Радашковічах, Клецку, Навагрудку існавалі беларускія гімназіі. На пачат-

ку 30-х гадоў тры з іх былі закрыты, а віленская ператворана ў філіял польскай гімназіі. У 1938/ 1939 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі не было ніводнай беларускай школы. Польскіх школ не хапала. Каля 13% дзяцей школьнага ўзросту не вучыліся ў школе. У выніку непісьменных у 1931 г. было 43%.

Высокая плата за навучанне, беднасць і перашкоды з боку ўлад рэзка абмяжоўвалі доступ працоўных дзяцей у сярэднія школы. Вышэйшыя навучальныя установы па сутнасці былі для іх недаступнымі. Вынікам была крайне нязначная колькасць беларускай інтэлігенцыі : каля 5% і 75% польскай.

Культурнае жыццё беларусаў усяляк абмяжоўвалася. Не было беларускіх тэатраў, закрываліся нешматлікія клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, створаны намаганнямі грамадскасці. Прагрэсіўныя газеты канфіскаваліся і закрываліся, іх рэдактараў садзілі ў турму.

Абвешчаныя Канстытуцыяй 1921 г. дэмакратычныя свабоды груба парушаліся. Паліцыя сачыла і арыштоўвала усіх, хто падазраваўся ў "падрыўной дзейнасці". У 1931 г. у турмах Польшчы знаходзілася больш 10 тыс. палітзняволеных, з іх 2--3 тыс. на Заходняй Беларусі. У сейм праходзілі прадстаўнікі буржуазных і дробнабуржуазных партый і толькі нязначная колькасць ад левых нацыянальных арганізацый. На выбарах у 1935 і 1938 гг. не было выбрана ні аднаго беларуса, ні аднаго прадстаўніка левых сіл.
Усе гэта абвастрала сацыяльныя супярэчнасці. Палітычная сістэма, устаноўленая ў Польшчы і дапоўненая на захопленых заходнебеларускіх землях шэрагам мер падаўлення і прымусу, не дазваляла прыгнечаным народам дабіцца дэмакратычнымі метадамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення і нават значных уступак з боку ўладаў і пануючых класаў. Заставаўся адзіны шлях масавай вызваленчай барацьбы, выкарыстання легальных і нелегальных метадаў работы.

Народ Заходняй Беларусі на працягу 20 год вёў барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за уз'яднанне з БССР. Асноўнымі сіламі яе былі палітычна актыўная частка рабочага класа і працоўнага сялянства. У нацыянальна-вызваленчым руху удзельнічала беларуская інтэлігенцыя.

У першай палове 20-х гадоў вызваленчы рух у Заходняй Беларусі яшчэ не дасягнуў значных памераў. Арганізацыі кампартыі толькі ствараліся і не мелі значнага уплыву. У гэты час большасць насель-

ніцтва верыла у лозунгі дробнабуржуазных партый. Гэта адбілася і на выніках выбараў у сейм у лістападзе 1922 г. У Заходняй Беларусі прайшлі пераважна прадстаўнікі беларускіх нацыянальных і польскіх дэмакратычных партый. Беларускія дэпутаты (паслы) утварылі у сейме фракцыю -- Беларускі пасольскі клуб. Яны выступалі з крытыкай нацыянальнай і зямельнай палітыкі польскага ўрада. Але праводзячы хісцкую палітыку ад апазіцыі да эгоды з уладамі, клуб хутка пачаў траціць уплыў на масы.

Ужо у 1921--1924 гг. прайшоў шэраг эканамічных забастовак рабочых. Баставалі рабочыя Гродна, Брэста, Пінска і іншых гарадоў. У гэты час Кампартыя Польшчы пераадольваючы недаацэнку сялянскага і нацыянальнага пытанняў, пашырала уплыў у горадзе і вёсцы. Гэтаму садзейнічала пастанова яе другога з"езда (верасень-кастрычнік 1923 г.), у якой сцвярджалася "права украінскіх і беларускіх рабочых і сялян на вызваленне з-пад прыгнёту памешчыцка-капіталістычнай Польшчы і далучэння да Савецкай Украіны і Беларусі".

У кастрычніку 1923 г. першая канферэнцыя камуністычных арганізацый краю, якая адбылася у Вільні, абвясціла стварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі як састаўной часткі Кампартыі Польшчы. КПЗБ распаўсюджвала сваю дзейнасць на Віленскае, Навагрудскае, Палескае і большую частку Беластоцкага ваяводства. Яе арганізатарамі былі А. Данілюк, С. Дубовік, С. Мартэнс (Скульені), А. Славінскі, С. Міллер. Сакратаром ЦК КПЗБ з 1926 г. па 1936 г. з"яўляўся Я. Лагіновіч (Павел Корчык). Да кіраўнічага ядра партыі належалі таксама А. Альшэўскі, А. Араншам, М. Арэхва, Я. Бабровіч, М. Блінчыкаў, Ю. Брун, Р. Вольф, А. Канчэўскі, Л. Родзевіч, В. Харужая і інш.

З утварэннем КПЗБ вызваленчы рух у Заходняй Беларусі становіцца больш арганізаваным і радыкальным. У цяжкую пару падполля кампартыя наладзіла выданне нелегальных газет.

Адначасова фарміраваўся і камсамол, які пашыраў уплыў на рабочую і сялянскую моладзь. У 1924 г. камсамольскія арганізацыі аб"ядналіся у Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі.

У 1921--1923 гг. пэўным уплывам сярод сялян Заходняй Беларусі карысталася Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў на чале якой стаялі Ф.Грыб, П.Бадунова, Г.Мамонька, А.Цьвікевіч, В.Ластоўскі і інш. Яна патрабавала правядзення рэформы з падзелам памешчыцкай зямлі паміж сялянамі, дэмакратычных свабод, нацыянальных правоў, утварэння незалежнай Беларускай дэмакратычнай

рэспублікі, здучанай з Літвой у адну дзяржаву. У адносінах да польскага ўрада беларускія эсеры знаходзіліся у парламенцкай апазіцыі.

На пазіцыях згоды з існуючым ладам стаяла Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, якую узначальвалі А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, В. Іваноўскі, С. Яроміч і інш. БСДП абапіралася пераважна на нацыянальна настроеную частку беларускай інтэлігенцыі. Побач з задачай развіцця беларускай культуры, яна патрабавала адкрыцця беларускіх школ, культурна-нацыянальнай аўтаноміі, стварэння незалежнай Беларускай дэмакратычнай рэспублікі, якая аб'ядноўвала усе землі заселеныя у большасці беларусамі. Дабівацца гэтых мэтаў БСДП імкнулася парламенцкімі метадамі.

Найбольш кансерватыўнай з палітычных партый была Беларуская хрысціянская дэмакратыя, на чале якой стаялі каталіцкія ксяндзы А. Станкевіч, В. Гадлеўскі і інш. Яна абапіралася на дробную буржуазію, мела некаторы уплыў сярод сялян каталіцкага веравызнання. БХД заяўляла, што мае сваёй мэтай стварыць лад на аснове хрысціянскай і дэмакратычнай справядлівасці, выступала за эвалюцыйны шлях развіцця грамадства, заснаванага на прыватнай уласнасці.

Патрабаванні беларускіх нацыянальных партый мелі буржуазна-дэмакратычны характар, азначалі захаванне асноў капіталізму, утварэнне буржуазна-дэмакратычнай рэспублікі. Але адным парламенцкімі метадамі без масавай барацьбы у тых умовах нельга было дабіцца ні дэмакратычных свабод, ні паляпшэння сацыяльнага становішча, ні нацыянальнага вызвалення. Таму рабочыя і сяляне, незадаволеныя згодніцкай палітыкай гэтых партый адыходзілі ад іх. У пачатку 1924 г. спыніла сваю дзейнасць БСДП. А у чэрвені заявіла аб роспуску Партыя беларускіх эсераў, прызнаўшы БССР і праведзеныя у ёй пераўтварэнні. Рэвалюцыйна настроеныя члены яе уступілі у КПЗБ.

Уплывам сярод каталіцкай часткі насельніцтва на Палессі і Віленшчыне карысталіся польскія дэмакратычныя партыі -- Польская сацыялістычная партыя (ППС), сялянская партыя Польскае стронніцтво людове "Вызволенне". Гэтаму садзейнічалі патрабаванні дэмакратычных рэформаў абвешчаныя у іх праграмах. У аснове гэтых партый заставаліся на пазіцыях згоды з існуючым ладам.

Сярод яўрэйскага насельніцтва гарадоў і мястэчак пераважалі уплывы яўрэйскіх дробнабуржуазных дэмакратычных партый Бунда і Пааалей-Цыена. Выступаючы пад лозунгам самастойнасці яўрэйскіх

рабочых, яны неслі ідэі нацыянальнай адасобленасці яўрэяў, што адцягвала іх ад барацьбы за сацыяльныя патрабаванні і еднасці з рабочымі іншых нацыянальнасцяў.

Правыя сіянісцкія партыі "Мізрахі", "Агудас Ізраэль"("Вярныя Ізраіля") і іншыя насаджалі нацыяналістычныя ідэі выключнасці і выбранасці яўрэйскай нацыі.

Ячэйкі у другой палове 1921 г. у Заходняй Беларусі пачалі узнікаць падпольныя паустанчыя арганізацыі. У канцы 1922 г. у іх налічвалася 5--6 тыс. членаў, пераважна з сялян. Дзейнічаючы невялікімі атрадамі, партызаны нападалі на паліцэйскія участкі, гмінныя управы, вайсковыя патрулі. Яны змагаліся супраць польскай акупацыі, за зямлю, сацыяльныя і нацыянальнае вызваленне. У заходніх паветах -- Гродзенскім, у Беларускай пушчы, Лідскім партызанскія атрады узначальвалі беларускія эсэры. На усходзе -- камуністы і рэвалюцыйна настроеныя актывісты. Сярод камандзіраў партызанскіх атрадаў і груп вызначаліся С. Ваупшасаў, К. Арлоўскі, Г. Шыманюк, Ф. Яблонскі і інш.

Партызаны абапіраліся на падтрымку сялян, якія забяспечвалі іх харчамі, паведамлялі аб ..расоўванні войска і паліцыі. У 1924 г. партызаны разграмілі паліцэйскія участкі у мястэчку Крывічы Вілейскага павету, у Стоўбцах, Кожан-гарадку Столінскага павету. Толькі з красавіка 1924 г. да лістапада 1925 г. партызаны правялі кала 280 баявых аперацый. Аднак ва умовах спаду рэвалюцыйнага руху у Польшчы і адсутнасці масавага вызваленчага руху на Заходняй Беларусі партызанская барацьба не мела перспектыў. Ды і сілы былі нераўныя. Ячэйкі летам 1924 г. супраць партызан улады накіравалі буйныя сілы войск і паліцыі, у Навагрудскім ваяводстве ўвялі асаднае становішча. Пачаліся масавыя арышты і катаванні мірных жыхароў, западозраных у сувязях з партызанамі.

У 1925 г. пачаўся новы этап нацыянальна-вызваленчага руху у Заходняй Беларусі звязаны з перыядам стабілізацыі капіталізму. У гэтых умовах кампартыя паставіла на першы план збіранне у адно рэчышча усіх сіл пралетарскага, сялянскага і нацыянальна-вызваленчага руху, прыцягненне да яго большасці працоўных на аснове барацьбы за іх надзённыя патрэбы. КПЗБ імкнулася пашырыць свой уплыў ва усіх легальных рабочых і сялянскіх арганізацыях, стварыць новыя радыкальныя арганізацыі. Да 1926 г. яна узрасла колькасна.

Бліжэйшымі задачамі КПЗБ ставіла барацьбу супраць падпарадкавання краіны іншаземнаму капіталу, за дэмакратычныя правы і

вызваленне палітзняволеных, за 8-гадзінны рабочы дзень, канфіскацыю без выкупу памешчыцкіх зямель і падзел іх памiж мясцовымі сялянамі, скасаванне закона аб асаднiцтве, выступленне супраць нацыянальнага прыгнечання і паланізацыі і інш. Канчаткову мэту яна бачыла ва устанаўленні рабоча-сялянскай улады, уз"яднанні Заходняй Беларусі з БССР. Гэтыя патрабаванні у цэлым адпавядалі інтарэсам працоўных і тэму дзейнасць КПЗБ знаходзіла усё больш шырокую падтрымку.

У чэрвені 1925 г. дэпутаты сейма Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла і П. Валошын выйшлі з беларускага пасольскага клуба і утварылі клуб Беларускай сялянска-рабочай грамады. У май-чэрвені 1926 г. Грамада афармілася як палітычная партыя, У склад яе Цэнтральнага камітэта увайшлі Б. Тарашкевіч (старшыня), С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, П. Валошын, М. Бурсевіч.

Праграма БСРГ змяшчала патрабаванні шэрагу глыбокіх рэвалюцыйных дэмакратычных пераўтварэнняў. Ажыццяўленне гэтых мэтаў Грамада бачыла у цесным саюзе сялян і рабочых. Праграма Грамады была блізкай і зразумелай для працоўных і яны успрымалі яе як сваю уласную праграму.

У маі 1926 г. у Польшчы адбыўся дзяржаўны пераварот, да улады прыйшлі ваенныя на чале з маршалам Ю. Пілсудскім. У краіне устанавілася ваенна-буржуазная дыктатура. Кампартыя спачатку заклікала працоўных падтрымаць Пілсудскага як прадстаўніка дэмакратычных сіл, яке зразумеўшы сваю памылку, павяла барацьбу супраць рэжыма санацыі, як прызвалі яго у народзе за абяцанні пілсудчыкаў ажыццявіць аздараўленне (санацыю) эканомікі і грамадскага жыцця. Супраць дыктатуры выступіла і Грамада.

У другой палове 1926 г. у выніку дзейнасці дэпутатаў, камуністаў, мясцовага рабочага і сялянскага актыву, беларускіх настаўнікаў Грамада ператварылася у масавую арганізацыю. У пачатку 1927 г. больш 2 тыс. гуртоў яе аб"ядноўвалі каля 120 тыс. членаў. Пераважную большасць іх складалі бядняцкія і сярэднія сяляне. У арганізацыю уступалі таксама рабочыя, гарадская беднята, прадстаўнікі інтэлігенцыі. Дзейнічалі 18 павятовых камітэтаў Грамады. Арганізацыя выдавала газеты, якія з-за праследаванняў часта мянялі сваю назву: "Жыццё беларуса", "Народная справа", "Наша справа", сатырычны часопіс "Маланка" і інш.

У выніку палітычнай і арганізацыйнай работы КПЗБ і Грамады у Заходняй Беларусі у сярэдзіне 1926 г. пачаўся ўздым вызвалечай барацьбы. Сяляне выступалі супраць аграрнай палітыкі урада, за захаванне іх правоў на сервітуты, ухіляліся ад уплаты падаткаў.

Пашыраліся забастоўкі рабочых. У гарадах праходзілі шматлюдныя мітынгі і дэманстрацыі. Узмацнілася барацьба за дэмакратычныя і нацыянальныя правы, за школу на роднай мове. Працоўныя патрабавалі амністыі для палітзняволеных. У апошнія месяцы 1926 г. супраціўленне народа уладам стала паўсюдным і масавым. У Заходняй Беларусі наспявала рэвалюцыйная сітуацыя.

Урад Пілсудскага вырашыў зліквідаваць Грамаду. Ноччу 15 студзеня 1927 г. ва ўсёй краіне пачаліся масавыя арышты камуністаў і актывістаў Грамады. Без згоды сейма, парушаючы Канстытуцыю, былі арыштаваны кіруючыя арганізацыі. Арыштаваны і адданы пад суд 490 актывістаў. 21 сакавіка 1927 г. Грамада была забаронена. А ў лютым--маі 1928 г. у Вільні адбыўся судовы працэс над 56 кіраўнікамі і актывістамі Грамады. Нягледзячы на беспадстаўнасць абвінавачання кіраўнікі Грамады былі асуджаны на 8--10 гадоў; астатнія на 3--6 гадоў турэмнага зняволення. Працоўныя Заходняй Беларусі адказалі на разгром Грамады рэвалюцыямі пратэсту, мітынгамі і дэманстрацыямі.

Дзейнасць Грамады была адной з самых яркіх старонак вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі. Грамада ўскалыхнула народныя масы і далучыла іх да актыўнага палітычнага жыцця, узняла іх класавую і нацыянальную свядомасць, веру ва ўласныя сілы, у магчымасць паспяховай барацьбы.

Ліквідацыя Грамады, рэпрэсіі затармазілі развіццё вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У гэтых умовах КПЗБ імкнулася захаваць існуючыя і стварыць новыя дэмакратычныя арганізацыі, арганізаваць выступленні працоўных. 1928 г. адзначыўся ўздымам забастоўчай барацьбы рабочых.

На выбарах у сейм у сакавіку 1928 г. за кандыдатаў левых сіл было падана 26% галасоў. Абраныя дэпутаты Я. Гаўрылік, І. Дварчанін, Ф. Валынец, І. Грэцкі, П. Крычык утварылі радыкальную фракцыю Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб "Змаганне". Клуб аб'яднаў некалькі соцен чалавек былога актыву Грамады. Дзейнічалі яго 16 павятовых сакратарыятаў. Патрабаванні клуба супадалі з праграмай Грамады.

Значную ролю ў барацьбе за беларускую школу і культуру ў другой палове 20--пачатку 30-х гадоў адыграла культурна-асветніцкая арганізацыя Таварыства беларускай школы, створаная ў 1921 г. У 1926--1928 гг. таварыства вырасла ў буйную арганізацыю: 430 гуртоў аб'ядноўвалі больш за 14 тыс. членаў. Дзейнічалі 12 акруговых управаў. На з'ездзе 19 мая 1929 г. у склад Галоўнай управы былі выбраны прагрэсіўныя дзеячы беларускай культуры Ф. Стацкевіч

(старшыня), Р. Шырма (сакратар), А. Лябецкая (старшыня кантрольнай рады), І. Дварчанін, Ф. Вальнец, М. Пяткевіч і іншыя.

Эканамічны крызіс 1929--1933 гг. прывёў да новага абвастрэння сацыяльных супярэчнасцей і класавай барацьбы. Развіццю вызваленчага руху у Заходняй Беларусі спрыяла умацаванне левых сіл, якія да гэтага часу набылі значны вопыт барацьбы. КПЗБ стала вопытнай і загартаванай у барацьбе партыяй. У 1932 г. яна налічвала 3000 членаў акрамя тых, хто знаходзіўся у турмах. Дзейнічалі больш 500 падпольных партыйных ячэек, 6 акруговых і больш 70 гарадскіх і раённых камітэтаў. Сфарміраваўся шматлікі рабочы і сялянскі актыў.

У першыя гады эканамічнага крызісу непасрэдна на масавыя звальненні рабочыя працягвалі абараняць свае сацыяльныя інтарэсы. У 1929--1931 гг. забастоўкі рабочых супраць прадпрыемстваў. У 1932--1933 гг. рабочы рух пераліў новы ўздым. Баставалі рабочыя у Брэсце, Гродне, Пінску, Гайнаўцы, Мастах, на лесараспрацоўках у Белавежскай пушчы, Слоніме і ім павеце. Усё часцей эканамічныя забастоўкі перарасталі у палітычныя, суправаджаліся мітынгамі і дэманстрацыямі. Пачасціліся выпадкі захопу прадпрыемстваў рабочымі -- т.зв. акупацыйныя стачкі. Усяго у 1932 г. у Заходняй Беларусі адбылася 51 забастоўка, у якіх прынялі удзел 32,4 тыс. рабочых, у 1933 г. 81 забастоўка з удзелам 36,7 тыс. рабочых.

У 1931 г. пачаўся ўздым сялянскага руху. Узмацнілася барацьба супраць памешчыкаў, падаткавага цяжару, парварак. Яна набывала розныя формы, ад адказу ад уплаты падаткаў да масавых палітычных выступленняў. Гадамі працягвалася барацьба супраць намасацыі і ліквідацыі сервітутаў.

Для падаўлення сялянскіх выступленняў улады пасылалі карныя экспедыцыі і праводзілі т.зв. "пацыфікацыі" (уціхамірванне), учыняючы масавае збіванне людзей, руйнавалася маёмасць сялян. У 1931 г. карныя атрады дзейнічалі у Брэсцкім, Кобрынскім, Навагрудскім і іншых паветах. У адказ на расправы сяляне месцамі сталі паліць панскія маёнткі, пераходзілі да партызанскай барацьбы. Урад накіраваў супраць партызан войска і паліцыю, увёў надзвычайныя суды. Толькі у другой палове 1931 г. у Заходняй Беларусі было вынесена 44, а у 1932 г. 76 смяротных прысудаў.

Барацьба сялян у Заходняй Беларусі у 1931--1933 гг. дасягнула вялікай вастрыні і сілы. У гэтыя гады адбылося каля 500 выступленняў сялян, якія ахапілі каля 1500 вёсак. У іх удзельнічала 130--150 тыс. чалавек, або па 40--60 тыс. за год. Сялянскія выступленні пашыраліся на цэлыя гміны і паветы.

Аднак барацьба за нацыянальныя правы у сувязі з ліквідацыяй легальных народных арганізацый у першай палове 30-х гадоў значна звузілася. Толькі у 1931--1932 гг. улады закрылі больш 200 гурткоў ТБШ. На развіцці нацыянальна-вызваленчага руху у Заходняй Беларусі балюча адбіліся неабгрунтаваныя рэпрэсіі у БССР над былымі кіраўнікамі Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, Грамады, клуба "Змаганне". У ліку рэпрэсіраваных беларускіх паэт Л. Родзевіч, Я. Бабровіч, А. Капуцкі, А. Клінцэвіч, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, П. Валошын, М. Бурсевіч, І. Дварчанін, І. Гаурылік, Ф. Валынец, І. Гарэцкі, П. Крычук.

Аслабленне легальнай работы рэвалюцыйна-дэмакратычнага актыву выкарысталі беларускія нацыянальныя і нацыяналістычныя групоўкі. У 1929--1930 гг. аформілася група на чале з А. Луцкевічам і Р. Астроўскім, якая прытрымлівалася палітычных пазіцый беларускай дробнай буржуазіі і нацыянальна-настроенай часткі інтэлігенцыі. Прыхільнікі яе дзейнічалі у Беларускім студэнцкім саюзе, жаночым, дабрачынным і навуковым таварыствах. У 1930 г. група А. Луцкевіча-Р. Астроўскага заснавала грамадска-палітычную арганізацыю "Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый". А у 1932 г. замест яго -- Таварыства беларускай асветы.

На пачатак 30-х гадоў некалькі пашырылася дзейнасць Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Яна зноў змяніла сваю праграму, узмоцніўшы яе кансерватыўна-клерыкальную накіраванасць. Прыватная уласнасць аб'яўлялася асновай цывілізаванага прагрэса грамадства. Норма пры надзяленні сялян зямлей павінна была складаць такую колькасць зямлі, якую гаспадар мог апрацаваць сам або з дапамогай аднаго-двух работнікаў.

У 1934--1935 гг. вызваленчы рух на Заходняй Беларусі праходзіў у яшчэ больш цяжкіх умовах, чым раней. Пасля прыходу Гітлера да улады у Германіі узмацнілася палітычная рэакцыя і у Польшчы. У 1934 г. быў створаны канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картузскай на Палессі. Тысячы камуністаў і радыкальна настроеных рабочых, сялян, прадстаўнікоў інтэлігенцыі былі кінуты у турмы і лагер, выселены з розных мясцін. У 1935 г. у Польшчы была прынята новая канстытуцыя прафашысцкага накірунку, якая заканадаўча ўводзіла аўтарытарнае праўленне. Закрываліся апошнія беларускія школы, гуркі ТБШ, іх бібліятэкі. У знешняй палітыцы ішло збліжэнне з

гітлераўскай Германіяй.

Ва умовах наступу фашысцкай рэакцыі і нарастання пагрозы вайны ў Польшчы, як і у іншых краінах Еўропы пачалося палявенне народных мас, узрасло імкненне рабочага класа да адзінства. Улічваючы гэтыя зрухі, другі з'езд КПЗБ, які адбыўся 9—18мая 1935г. паставіў задачу стварэння адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту. З'езд звярнуў асаблівую ўвагу на пераадоленне сектанскіх нахілаў у партыі, недаацэнкі дэмакратычных і нацыянальных патрабаванняў. Кампартыя звярнулася да усіх дэмакратычных партый з заклікам стварыць шырокі антыфашысцкі народны фронт на падставе барацьбы за дэмакратыю, супраць фашызму і падрыхтоўкі новай сусветнай вайны.

Паступова ідэя адзінага фронту атрымала шырокае распаўсюджанне і падтрымку рабочых. Працэс палявення ахапіў і рэфармісцкія партыі ППС, Бунд, Паалей-Цыона. Хоць не адразу і з цяжкасцямі іх арганізацыі пачалі на сумесныя дзеянні з камуністамі. У асобных гарадах створаны адзіна-франтавыя камітэты і камісіі. У Заходняй Беларусі у 1936г. у асноўным было дасягнута адзінства дзеянняў рабочага класа. Гэта спрыяла ўплыванню на стан рабочага руху.

У студзені—лютым 1936г. адбылася забастоўка на фабрыцы гумавых вырабаў у Лідзе, падтрымана рабочымі усіх прадпрыемстваў горада. Зімой 1935—1936гг. баставалі лесарубы і возчыкі Сакальскага, Навагрудскага і Брэсцкага лясніцтваў. У 1936г. баставалі рабочыя Гродна, Вільні, Беластока, Брэста, у першай палове 1937г. — Гарадзішчанскай фанернай фабрыкі, лесапільных заводаў Брэсцкага, Беластоцкага і Слонімскага павеццаў. Усяго у Віленскім, Навагрудскім, Палескім і Беластоцкім ваяводствах у 1936г. адбылося 184 забастоўкі, у якіх удзельнічалі 40 тыс. рабочых. Пад лозунгамі адзінага фронта ў 1936 і 1937гг. прайшлі масавыя першамайскія дэманстрацыі у Вільні, Беластоку, Гродне, Брэсце, Баранавічах, Слоніме, Лідзе і іншых гарадах. У іх разам з рабочымі удзельнічалі беспрацоўныя, рамеснікі, сяляне. Імкнуліся камуністы, сацыялісты, бундаўцы, беспартыйныя. Дасягнутае адзінства дзеянняў рабочага класа адкрывала магчымасць для больш шырокага аб'яднання дэмакратычных сіл рабочых, сялян, інтэлігенцыі, дробнай буржуазіі.

Пад уплывам рабочага руху, работы левых сіл па стварэнні народнага фронту ажывілася барацьба сялян. Адначасова з патрабаваннем зямлі без выкупу ставіліся . больш палярызаваныя-адкласці тар

выплаты падаткаў, вызваліць ад падаткаў беднякоў, спісаць даўгі, зменшыць арэндкі. Вялася барацьба супраць камасацыі і ліквідацыі сервітутаў. Шырокі водгук у краіне мелі выступленні сялян-рыбакоў у 1935--1936 гг. на буйнейшым у Беларусі возеры Нарач, вядомыя пад назвай паўстання нарачанскіх рыбакоў. У іх удзельнічала некалькі тысяч чалавек з больш чым 40 вёсак, якія выступілі супраць забароны свабоднага лову рыбы.

Беларускія сяляне праявілі салідарнасць з барацьбой сялян Польшчы і Заходняй Украіны. У масавых выступленнях у Сувалкаўскім павеце вясной 1935 г. удзельнічалі польскія, літоўскія і беларускія сяляне. Выступленні украінскіх сялян Валыні восенню 1936 г. былі падтрыманы сялянамі Кобрынскага і Брэсцкага паветаў. А калі у жніўні 1937 г. пачалася агульнапольская забастоўка сялян, у якой удзельнічалі каля 10 млн. чалавек, яе падтрымалі сяляне Бельскага, Гродзенскага і Слонімскага паветаў.

У 1935--1937 гг. узмацнілася барацьба прагрэсіўных сіл супраць палітычнага бесправя, рэакцыйнай канстытуцыі, за дэмакратычныя правы. На Заходняй Беларусі амаль палова мужчын права голасу не ўдзельнічалі у парламенцкіх выбарах у верасні 1935 г. Прагрэсіўныя патрабавалі вызвалення палітычных зняволеных, ліквідацыі канцлагера у Бярозе Картузскай. Урад выкарыстаны быў вызваліць з турмаў частку палітзняволеных.

Праяўляючы салідарнасць з барацьбой дэмакратычных сіл Іспаніі супраць фашысцкага мяцяжа Франко і дапамагаючых яму італьянскіх і германскіх фашыстаў, антыфашысты праводзілі сходы і масоўкі, збіралі грошы для Іспанскай рэспублікі. 137 ураженцаў Заходняй Беларусі змагаліся ў радах інтэрнацыянальных брыгад.

Преодоление сектанцкіх тэндэнцый, новы падыход да дробнабуржуазных партый дазволілі камуністам знайсці шлях да інтэлігенцыі, збліжэнцце з тымі, хто імкнуўся змагацца, далучыць іх да актыўнай палітычнай дзейнасці. Дзеячы беларускай культуры групаваліся вакол легальнай антыфашысцкай газеты "Наша воля", якая выходзіла у 1936 г. у Вільні. У ей друкаваліся вершы беларускіх прагрэсіўных паэтаў М.Танка, М.Васілька, М.Машары, М.Засіма і інш.

Развіццё руху за стварэнне антыфашысцкага народнага фронту, рост грамадска-палітычнай актыўнасці інтэлігенцыі садзейнічалі узмацненню барацьбы за нацыянальнае вызваленне. Асноўная увага была звернута на разгортванне барацьбы на глебе канкрэтных праяў нацыянальнага прыгнечання за нацыянальныя правы.

Да сярэдзіны 30-х гадоў у Заходняй Беларусі большасць нацыянальных і нацыяналістычных груповак распалася. Правяліся спробы Ф. Акінчыца і В.Казлоўскага стварыць фашысцкую Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю. Беларуская хрысціянская дэмакратыя некалькі павялічыла свой уплыў. Так званы Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры, на які яна абапіралася ў 1934 г. налічваў 80 гурткоў і 1200 членаў. У канцы 1935 г. БХД змяніла сваю назву на Беларускае народнае аб'яднанне і прыняла новую праграму, якая змяшчала буржуазна-дэмакратычныя патрабаванні.

Падобна старой праграме БХД, яна сцвярджала, што грамадскі лад беларускага народа у цэлым павінен абапірацца на прынцыпах прыватнай уласнасці, г.зн. выходзіла з пазіцый захавання асноў капіталізму. БНА ставіла сваей мэтай дасягненне самастойнасці беларускага народа на усіх яго этнаграфічных землях, аб'яднаных у незалежную дэмакратычную (буржуазна-дэмакратычную) рэспубліку, якая супрацьпастаўлялася БССР.

Пасля рэвалюцыйнага ўздыму 1936--1937 гг. у Заходняй Беларусі, як і у Польшчы, наглядаўся спад вызваленчага руху. Ен быў выкліканы не толькі узмацненнем рэпрэсій у абстаноўцы набліжання вайны. Адмоўную ролю адыгралі пазіцыі дробнабуржуазных партый. Сталінскія рэпрэсіі і палітычныя судовыя працэсы у СССР паскорылі іх адыход ад народнага фронта.

Асаблівa цяжкія наступствы для вызваленчага руху у Заходняй Беларусі меў неабгрунтаваны роспуск у жніўні 1938 г. Выканкамам Камінтэрна Кампартыі Польшчы. Супраць КПП па свабрыкаваных матэрыялах было высунута ілжывае абвінавачанне у тым, што яе кіраўніцтва было захоплена агентамі польскіх уладаў і палітычнай паліцыі (дэфензівы). Кіруючыя дзеячы КПП, КПЗБ, КПЗУ, якія знаходзіліся у Маскве, Кіеве, Мінску былі арыштаваны і амаль усе загінулі. Рэпрэсіраваны члены ЦК КПЗБ С.Мертэнс, А. Славінскі, А.Альшэўскі, Р.Вольф, І.Сяменнікаў, І.Маслоўскі і інш. Ямчэ у 1936 г. быў арыштаваны па абвінавачанню у шпіянажы сакратар ЦК КПЗБ Павел Корчык (Я.Лагіновіч). Рэпрэсіраваны таксама больш 200 актывістаў КПЗБ, якія у розны час перайшлі граніцу, шукаючы сховішча у СССР.

Такім чынам, гісторыя Заходняй Беларусі у 1921--1939 гг. адзначалася высокім узроўнем рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, напружанай барацьбой мас за сацыяльнае і нацыянальнае вызва-

ленне, за уз'яднанне беларускага народа. Гэтая барацьба аслабляла панаванне польскіх памешчыкаў і буржуазіі. У хадзе яе выхоўваліся сілы для рашучых дзеянняў, расла класавая і нацыянальная свядомасць народа, узмацнялася супрацьленне паланізацыі, што спрыяла захаванню беларускай нацыі.

Да 1939 г. небяспека другой сусветнай вайны навісла над Еўропай. Адказ заходніх дзяржаў ад палітыкі калектыўнай бяспекі, што прапанаваў Савецкі Саюз, іх патуранне агрэсару з мэтай накіраваць яго на Усход не дазволілі стварыць адзіны фронт міралюбівых і дэмакратычных сіл супраць фашысцкай агрэсіі. У гэтых умовах Савецкі Саюз, астаўшыся у адзіноцтве, вымушаны быў падпісаць 23 жніўня 1939 г. дагавор аб ненападзе з Германіяй, каб пазбегнуць вайны з аб'яднанымі сіламі Германіі, Італіі і Японіі. Але дадатковы сакрэтны пратакол да гэтага дагавора, які прадугледжваў ліквідацыю Польскай дзяржавы, раздзел сфер уплыву, з'явіўся грубым парушэннем умоў Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. і пакту аб ненападзе паміж Савецкім Саюзам і Польшчай, падпісанага у 1932 г. Аднак Рыжскі дагавор таксама быў грубым парушэннем волі і права на існаванне і самавызначэнне беларускай і украінскай нацый. Справа ішла аб лесе Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якія былі захоплены Польшчай, сілай адарваны ад Беларускай і Украінскай савецкіх рэспублік. Савецкі Саюз не мог дапусціць акупацыю Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі гітлераўскімі войскамі, пагадзіцца з устанаўленнем тут фашысцкага рэжыму, пакінуць у бядзе перад смяротнай небяспекай кроўныя беларускі і украінскі народы.

Заключэнне дагавору дало Савецкаму Саюзу пэўны выйгрыш часу для падрыхтоўкі адпору фашысцкай агрэсіі, хоць ен і не быў выкарыстаны належным чынам. У той час дагавор дазволіў не дапусціць акупацыі гітлераўцамі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Гэтым былі створаны умовы для уз'яднання беларускага і украінскага народаў.

І верасня 1939 г. гітлераўская Германія напала на Польшчу. 3 верасня Англія і Францыя аб'явілі вайну Германіі. Пачалася другая сусветная вайна. Нямецкія войскі перайшлі граніцу і з некалькіх напрамкаў пачалі рухацца ў глыб краіны. Польскі ўрад і камандаванне арміі не змагло арганізаваць эфектыўную абарону і на трэцім тыдні пакінулі краіну.

У сярэдзіне верасня нямецкія войскі падышлі да зямель Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. 17 верасня, калі польская армія у асноўным была разбіта, а тэрыторыя каронкай Польшчы занята нямецкімі войскамі і заставаліся толькі асобныя вузлы супраціўлення, савецкі урад аддаў загад Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі сіламі войск Украінскага і Беларускага франтоў перайсці граніцу і узяць пад сваю абарону жыццё і маемасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

17 верасня уранку часці Чырвонай Арміі пачалі свой паход у Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. У першы дзень былі вызвалены Баранавічы, 18 верасня -Навагрудак, Ліда, Слонім, 19 - Вільня, Пружаны, 20 - Гродна, 21 - Пінск, 22 - Беласток і Брэст. Пераважная большасць польскіх войск здавалася без бою. Толькі асобныя часці і групы аказвалі супраціўленне.

Насельніцтва Заходняй Беларусі сустракала савецкіх салдат з вялікай радасцю, як родных братоў, з кветкамі, хлебам-соллю. У гарадах і селах узнікалі шматлюдныя мітынгі, на якіх працоўныя горача віталі сваіх вызваліцеляў. У некаторых месцах пад кіраўніцтвам былых членаў КПЗБ ствараліся ваенна-рэвалюцыйныя камітэты. Яны стваралі узброеныя групы з рабочых і сялян, якія разбройвалі палітэйскіх, бралі пад ахову чыгуначныя масты, прадпрыемствы і іншыя аб'екты. У ваяводскіх і павятовых цэнтрах былі створаны органы новай народнай улады - часовыя управы і сялянскія камітэты. У склад часовых управаў уваходзілі прадстаўнікі рабочых, сялянскіх камітэтаў, працоўнай інтэлігенцыі, вызваленыя з турмаў былыя члены КПЗБ, прадстаўнікі Чырвонай Арміі.

Часовыя управы і сялянскія камітэты, абапіраючыся на падтрымку мас, устанавілі новы рэвалюцыйны парадак. Для яго падтрымкі ствараліся атрады рабочай гвардыі і сялянскай міліцыі. Сялянскія камітэты падзялялі памешчыцкую зямлю між беззямельных сялян. Яны атрымалі 491 тыс. га зямлі, 14 тыс. коней і 33,4 тыс. кароў. У выніку павялічылася сярэдняцкая прасойка у вёсцы. Сяляне вызваліліся ад эксплуатацыі з боку памешчыкаў, ад даўгоў банкам і ліхвярам.

Часовыя управы бралі на ўлік фабрыкі і заводы, пакінутыя іх уладальнікамі, арганізоўвалі вытворчасць. На астатніх прадпрыемствах былі створаны групы і камісіі, якія ажыццяўлялі кантроль за іх дзейнасцю. Узялі на ўлік наяўныя запасы прадуктаў і тавараў, ор-

ганы новай улады наладзіліі забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці.

6 кастрычніка 1939г. часовая управа г.Беластока звярнулася да усіх часовых управаў краю з прапановай склікаць Народны сход Заходняй Беларусі для вырашэння пытанняў дзяржаўнага ладу. Створаны з прадстаўнікоў часовых управаў адпаведны камітэт прыняў "Парадак арганізацыі выбараў Народнага сходу Заходняй Беларусі", у якім абвяшчаліся усеагульныя, роўныя, прамыя выбары цыі таемным галасаванні. Права вылучэння кандыдатаў мелі часовыя управы, сялянскія камітэты, сходы рабочых прадпрыемстваў, рабочай гвардыі, інтэлігенцыі.

На перадвыбарных сходах рабочыя і сяляне давалі свае кандыдатам наказы, у якіх патрабавалі устанаўлення ў Заходняй Беларусі савецкай улады, з'яднання з БССР, уваходжання у склад Савецкага Саюза. Выбары прайшлі 22 кастрычніка 1939г. Прадстаўнікі Чырвонай Арміі не ўмешваліся у правядзенне выбараў.

У галасаванні прынялі удзел 2672 тыс. чалавек, што складала 96,7% усіх маючых права голасу. За кандыдатаў было падана 90,7% галасоў. З 926 дэпутатаў Народнага сходу 563 былі з сялян, 197 з рабочых, 166 з інтэлігенцыі і іншых пластоў насельніцтва. Па нацыянальнаму складу 621 беларус, 127 палякаў; 72 яўрэі, 53 украінцы, 49 рускіх і 10 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Народны сход Заходняй Беларусі адбыўся 28-30 кастрычніка 1939 г. у г.Беластоку. З дакладам аб характары дзяржаўнай улады на ім выступіў дэпутат С.В.Прытыцкі. Абмеркаваўшы пытанне, 29 кастрычніка Народны сход прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўна.. уладзе, у якой абвяшчалася устанаўленне савецкай улады у Заходняй Беларусі. У той жа дзень Народны сход прыняў Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі у састаў Беларускай ССР: "Прасіць Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у склад Савецкага Саюза і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, аб'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласлі тым самым канец раз'яднанню беларускага народа".

30 кастрычніка Народны сход прыняў Дэкларацыю аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, у ей абвяшчалася канфіскацыя без выкупу памешчыцкіх зямель, зямель манастыроў і буйных чыноўнікаў з усім жывым і мёртвым інвентаром і сядзібнымі пабудовамі. Уся зямля з яе нетрамі, лясамі, рэкамі аб'яўлялася усенародным здабыткам, дзяр-

хеўнай уласнасці. Затым была прынята Дэкларацыя аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці.

2 лістапада 1939г. Нечарговая У сесія Вярхоўнага Савета СССР першага скліканння, выслухаўшы заяву Паўнамоцнай камісіі Народнага сходу Заходняй Беларусі, вырашыла: задаволіць просьбу Народнага сходу Заходняй Беларусі аб уключэнні Заходняй Беларусі у саостаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з уз'яднаннем яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай.

Завершальным заканадаўчым актам уз'яднання з'явілася прынятае Нечарговай III сесіяй Вярхоўнага Савета БССР 14 лістапада 1939г. закона, у якім запісана: "Прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і уз'яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзіную Беларускую дзяржаву". У склад Беларускай ССР увайшла тэрыторыя плошчай 100 тыс. кв. км з насельніцтвам 4,7 млн. чалавек. Пераважную большасць яго складалі беларусы і толькі у заходніх паветах Беластоцкай вобласці пераважалі палякі. Плошча рэспублікі павялічылася са 125,6 тыс. кв. км да 225,6 тыс. кв. км, насельніцтва з 5,6млн. да 10,3 млн. чалавек.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі у адзіную Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку было актам гістарычнай справядлівасці. Яно паклала канец падзелу Беларусі, аднавіла яе тэрытарыяльную цэласнасць. Уз'яднанне паскорыла кансалідацыю беларускага народа у адзіную нацыю.

У канцы 1939 г. у заходніх абласцях пачаўся новы этап сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Было уведзена новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне: вобласці, раёны, сельсаветы. Створаны 5 абласцей - Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская і 101 раён. 24 сакавіка 1940г. адбыліся першыя выбары у Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР.

У першыя месяцы 1940г. былі створаны мясцовыя органы савецкай улады. У канцы года у выніку выбараў утварыліся сельскія, раённыя, гарадскія і абласныя саветы дэпутатаў працоўных. На пачатку 1940г. створаны абласныя, гарадскія і раённыя камітэты КП(б)Б, якія узялі у свае рукі кіраўніцтва сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі пераўтварэннямі. Адначасова ствараліся камсамольскія арганізацыі.

Каранным рэарганізацыі падверглася прафсаюзы. Яны па сутнасці

ствараліся нанава на прынцыпах прафсаюзаў СССР.

Савецкая улада забараніла дзейнасць усіх буржуазных і дробнабуржуазных палітычных партый і арганізацый. Кіраўнікі іх былі арыштаваны, мясцовыя арганізацыі распаліся. Абстаноўка ускладнялася парушэннямі законнасці. У пачатку 1940г. органамі унутраных спраў было ліквідавана ва ўсходніх і заходніх раёнах СССР 9755 асаднікаў і ляснічых. Яшчэ раней арыштавалі паліцэйскіх, якія не паспелі збегчы. Арыштаваны і вывезены былі памешчыкі, капіталісты, частка чыноўнікаў. У большасці выпадкаў гэта былі необгрунтаваныя меры.

У народнай гаспадарцы у канцы 1939-1940гг. галоўнае месца заняла рэканструкцыя прамысловасці. Наладзілася вытворчасць на нацыяналізаваных фабрыках і заводах. Пашыраліся прадпрыемствы, разгортвалася новае будаўніцтва. У канцы 1940 г. у заходніх абласцях дзейнічалі 892 прамысловыя прадпрыемствы з колькасцю рабочых больш 20, на якіх было занята каля 20 тыс. чалавек. Аб'ем прадукцыі павялічыўся амаль у 2 разы у параўнанні з 1928г. і склаў 27,6% вытворчасці рэспублікі. Праводзілася аб'яднанне рамеснікаў на аснове прамысловай кааперацыі. Да чэрвеня 1941г. большасць з іх была кааперавана. Але гэта праходзіла з парушэннем добраахвотнасці. Стварэнне сістэмы дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю рэзка звузіла сферу прыватнага уласніка. Аднак закрыццё дробнага рознічнага гандлю адбілася на абслугоўванні насельніцтва.

Рэканструкцыя і будаўніцтва новых прадпрыемстваў дазволілі значна павялічыць занятасць рабочых. 22 тыс. чалавек былі накіраваны на фабрыкі і заводы Мінска, Магілева, Віцебска, Оршы, Гомеля і іншых гарадоў. У выніку да 1941г. з беспрацоўем практычна было скончана.

Перад сялянствам паўстала пытанне па якому шляху весці гаспадарку. Хоць удзельная вага беднякоў у выніку падзелу памешчыцкай зямлі значна зменшылася, малазямельныя складалі больш палоны гаспадарак. Шлях капіталістычнага развіцця з яго класавай дыферэнцыяцыяй, разарэннем слабейшых і узбагачэннем багатых быў непрымальным для большасці сялян, якія дастаткова адчулі яго на уласным вопыце ва умовах царызму і былой Польшчы. Сялянам прапанавалася калектыўнае вядзенне гаспадаркі. Да чэрвеня 1941 г. было

арганізавана 1115 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 49 тыс. або 6,7% сялянскіх гаспадарак. Іх абсалютагвалі стварэнне за кароткі час 101 машынна-трактарная станцыя з 997 трактарамі і іншымі машынамі. У адносінах да кулацтва праводзілася палітыка абмежавання шляхам павышэння падаткаў, забароны арэнды і найму рабочай сілы.

У 1940г. у заходніх абласцях разгарнулася шырокае культурнае будаўніцтва. Сістэма народнай асветы перабудоўвалася на узор савецкай. У большасці школ навучанне было пераведзена на беларускую мову. Адкрываліся новыя школы, пад якія пристасоўваліся дамы памешчыкаў і капіталістаў. У 1940-1941 навучальным годзе тут дзейнічала 5958 агульнаадукацыйных школ, у тым ліку 20 сярэдніх, у якіх навучаліся 774,5 тыс. дзяцей. У школы пайшлі больш 100 тыс. дзяцей, якія раней не маглі вучыцца. Усяго праз год пасля уз'яднання у заходніх абласцях практычна было ажыццёўлена усеагульнае абавязковае навучанне у аб'ёме пачатковай школы. Хутка пашырылася сямігадовае навучанне. Пачалася работа па ліквідацыі непісьменнасці.

Шырокае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва патрабавала кадраў спецыялістаў, якіх было мала. У канцы 1939-1940гг. з усходніх абласцей сюды была накіравана вялікая колькасць спецыялістаў розных прафесій. Яны адыгралі важную ролю у арганізацыі эканамічнага і культурнага жыцця. Але спецыялістаў не хапала. Да таго ж, патрэбны былі мясцовыя кадры, якія лепш ведалі умовы. Каб паскорыць вырашэнне гэтай праблемы у заходніх абласцях былі адкрыты педагагічны, 4 настаўніцкія інстытуты і 25 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Ажывала культурнае жыццё. У 1940г. пачаў працаваць польскі дзяржаўны тэатр БССР у Беластоку, беларускія абласныя драматычныя тэатры у Баранавічах і Пінску, рускі драматычны тэатр у Брэсце, яўрэйскі драматычны тэатр, тэатр мініяцюр, адзяленне Беларускай дзяржаўнай філармоніі у Беластоку. Адкрываліся новыя бібліятэкі, кінатэатры. Бурлівы уздым перажывала народная творчасць.

З уз'яднаннем з БССР у складзе Савецкага Саюза заходнія вобласці ключыліся у рэспубліканскі і агульнасаюзны працэс сацыяльна-эканамічнага развіцця. Абапіраючыся на эканамічны і навукова-тэхнічны патэнцыял усей краіны, яе кадры спецыялістаў, за адзін год і дзевяць месяцаў, нягледзячы на недахопы, быў зроблены значны крок у пераўтварэнні сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця заходнебеларускага краю.

рэсурсы

1917 г., 18-22 кастрычніка	З'езд беларуска-вайскоўцаў Заходняга фронту ў Мінску, які ўтварыў Выканкам Часовай Цэнтральнай Вайсковай Рады.
1917 г., 26 кастрычніка	Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў узяў уладу ў горадзе ў свае рукі.
1917 г., 26 кастрычніка	Сфарміраваны Камітэт выратавання рэвалюцыі.
1917 г., 26 кастрычніка-4 лістапада	Фарміраванне ВРК Заходняга фронту.
1917 г., 28 кастрычніка	Віцебскі ВРК узяў пад свой кантроль пошту, тэлеграф, чыгуначны вузел, распусціў згодніцкі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і прызначыў выбары яго новага складу.
1917 г., 30 кастрычніка	Аб'яднанае пасяджэнне Гомельскага гарадскога Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Выканкама павятовага Савета сялянскіх дэпутатаў абвясціла ў горадзе і павеце Савецкую уладу.
1917 г., 18 лістапада	Магілёўскі Савет прызнаў Савецкую уладу.
1917 г., 19 лістапада	З'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці.
1917 г., 23 лістапада	Загад Вярхоўнага галоўнакамандуючага аб стварэнні нацыянальных палкоў.
1917 г., 27 лістапада	Аб'яднанне выканаўчых камітэтаў, абраных з'ездамі Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў і з'ездамі армій Заходняга фронту і ўтварэнне Выканаўчага

	Камітэтэ Заходняй вобласці і фронта (Аблвыканкамах).
1917 г., 14-18 снежня	I Усебеларускі з'езд (рэзагнаны па пастанове СНК Заходняй вобласці і фронта).
Снежань 1917 г. - люты 1918 г.	Выданне газэты "Беларуская Рада" - орган Выканкама БНЦР.
1918 г., 15 студзеня	Дэкрэт СНК "Аб арганізацыі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі".
1918 г., 30 студзеня	Дэкрэт СНК Заходняй вобласці і фронта аб роспуску Беларускай вайсковай рады.
1918 г., 18 лютага	Адновіліся ваенныя дзеянні кайзераўскіх войскаў супраць Расіі.
1918 г., 21 лютага	Выканкам Савета з'езда абнародаваў 1-й Статутнай Граматай абвяшчэнне сябе часовай уладай на Беларусі.
1918 г., 9 сакавіка	2-й Статутнай Граматай Беларусь абвяшчалася Народнай Рэспублікай.
1918 г., 25 сакавіка	БНР 3-й Статутнай Граматай абвяшчалася "незалежнай і вольнай дзяржавай".
1919 г., 10 снежня	Вызваленне Мінска ад нямецкіх акупантаў.
1919 г., 1 студзеня	Утварэнне БССР.
1919 г., 2-8 лютага	Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.
1920 г., 4 мая	Пачатак савецка-польскай вайны.
1920 г., 11 ліпеня	Вызваленне Мінска ад польскай акупацыі.
1920 г., лістапад	Слуцкае паўстанне.
1920 г., 14 снежня	Стварэнне на Беларусі Надзвычайнай камісіі па ліквідацыі непісьменнасці.
1921 г., 18 сакавіка	Заканчэнне мірнага дагавора паміж

Савецкай Расіяй і Украінай з аднаго боку і Польшчай з другога, паводле якога Заходняя Беларусь адыйшла да Польшчы.

1921 г., 30 кастрычніка	Адкрыццё ў Мінску Беларускага дзяржаўнага універсітэта.
1922 г., 30 студзеня	Адкрыццё ў Мінску Інстытута беларускай культуры (Інбелькульта,) на яго базе 1 студзеня 1929 г. утворана Беларуская Акадэмія навук.
1922 г., лістапад	Утварэнне Беларускага пасольскага клуба.
1922 г. -снежань 1928 г.	Дзейнасць Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі
1928 г., май	Рашэнне ЦК РКП(б) аб пашырэнні межаў БССР за лік раёнаў з большасцю беларускага насельніцтва, што знаходзіліся ў складзе РСФСР.
1928 г., ліпень	Дэкрэт ЦВК БССР аб амністыі ўдзельнікам нацыянальных арганізацый.
1928 г., 8 кастрычніка	Дэкрэт УЦВК і СНК "Аб арганізацыі тэрытарыяльных вайсковых часцей і правядзенні вайсковай падрыхтоўкі працоўных"
1928 г., кастрычнік	Утварэнне Кампартыі Заходняй Беларусі.
1928 г., 28 лістапада	Стварэнне беларускага літаратурнага аб'яднання "Маладняк".
1924 г., 7 сакавіка	Пастанова Прэзідыума ЦВК СССР "Аб аб'яднанні ў складзе БССР усіх тэрыторый Савецкага Саюза з большасцю беларускага насельніцтва". Першае ўзбуйненне БССР.
1924 г. - канец 20-х гадоў	Акцыяналізацыя палітыкі беларусізацыі ў БССР.

1925 г., 24 чэрвеня	Утварэнне пасольскага клуба Беларускай сялянска-рабочай грамады.
1925 г., кастрычнік	Нарада ў Берліне дзеячоў беларускіх нацыянальных арганізацый, якая аб'явіла аб роспуску замежных палітычных цэнтраў і спыненні барацьбы з савецкай уладай.
1925 г., лістапад	Утварэнне Беларускага сялянскага саюза.
1925 г., 18-31 снежня	XIV з'езд УКП(б), прыняцце курсу на індустрыялізацыю краіны.
1926 г., 7 красавіка	Пастанова ЦВК і СНК БССР аб увядзенні на Беларусі ўсеагульнай абавязковай пачатковай адукацыі дзяцей ва ўзросце ад 8 да 11 гадоў.
1926 г., 8 снежня	Пастанова Прэзідыума ЦВК СССР аб уключэнні ў склад БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. Другое ўзбуйненне БССР.
1926 г.	Стварэнне літаратурна-мастацкага аб'яднання "Узвышша".
1927 г., 27 сакавіка	Забарона дзейнасці Беларускай сялянска-рабочай грамады.
1927 г., 11 красавіка	Прыняцце 2-й Канстытуцыі БССР.
1927 г., снежань - 1932 г., 25 мая	Дзейнасць у Мінску беларускага літаратурнага аб'яднання "Полымя".
1927-1928 гг.	Хлебазагатоўчы крызіс у краіне, у тым ліку ў БССР.
1928 г., 28 лютага - 22 мая	Судовы працэс над 56 кіраўнікамі і актывістамі Грамады.
1928 г., сакавік	Утварэнне Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба "Адзінства".
1928 г., 28 чэрвеня - 25 ліпеня	Першы з'езд Кампартыі Заходняй Беларусі.
1929 г., восень	Пачатак масавай калектывізацыі ў БССР.
1929 г., канец - пачатак	

1930 г.	Масавае забойства і продаж сялянамі хатняй жывёлы ў сувязі з прымусовай калектывізацыяй.
1929 г., канец - 1930 г.	Першая хваля сталінскіх рэпрэсій у БССР ў сувязі са справай так званага "Саюза вызвалення Беларусі".
1930 г., 18 лютага	Пачатак дзейнасці ў Койданаве МТС - першай у БССР.
1930 г., вясна	Масавы выхад сялян з калгасаў.
1932 г., 8 красавіка	Узброенае выступленне сялян у Навагрудскім павеце.
1932 г., 2,4 жніўня	Пастановы СНК БССР аб увядзенні на Беларусі ўсеагульнай сямігадовай адукацыі і "Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання для малапісьменных".
1933 г., май	Адкрыццё беларускага Інстытута народнай гаспадаркі.
1938 г., ліпень	Адкрыццё Беларускага палітэхнічнага інстытута.
1938 г., 8 жніўня	Узброенае выступленне сялян у Кобрынскім павеце.
1934 г., 8-14 чэрвеня	І з'езд пісьменнікаў БССР, які аформіў утварэнне адзінай пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі.
1934 г., 10 ліпеня	Пастанова ЦВК СССР аб утварэнні пазасудовага органа "Асобай нарады" з мэтай ажыццяўлення рэпрэсіўнай палітыкі.
1934 г.	Пераход да абавязковага ўсеагульнага навучання ў аб'ёме сямігадовай школы.
1935 г., 9-18 мая	II з'езд Камуністычнай партыі Беларусі.
1935 г.-1936 г.	Выступленні сялян-рыбакоў на возеры Нарач.
1936 г., студзень	Рада Беларускай хрысціянскай дэмакратыі перайменавала партыю ў Беларускае народнае аб'яднанне.
1937 г., 19 лютага	Прыняцце новай Канстытуцыі БССР.
1937 г., 29 ліпеня	**Ліпеньскі пленум ЦК КП(б)Б з удзелам прыбыўшых з Масквы загадчыкаў аддзелаў**

	ЦК УКП(б) Г.М.Маленкова і Я.А.Якаўлева. Расправа над кіруючымі дзяржаўнымі, партыйнымі, савецкімі, гаспадарчымі кадрамі Беларусі.
1937 г.-1941 г.	Масавыя растрэлы жыхароў Беларусі ва урочышчы Курапаты.
1938 г., 26 чэрвеня	Выбары ў Вярхоўны Савет БССР I склікання.
1938 г., кастрычнік	Неабгрунтаваны роспуск Выканкамам Камінтэрна Кампартыі Польшчы, у тым ліку Кампартыі Заходняй Беларусі.
1938 г., 24 снежня	Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных пасродле новай Канстытуцыі БССР.
1939 г.,23 жніўня	Падпісанне дагавора аб узаемным ненападзе паміж СССР і Германіяй (пакт Рыбентроп-Молатаў).
1939 г., 1 верасня	Напад гітлераўскай Германіі на Польшчу. Пачатак другой сусветнай вайны.
1939 г., 17 верасня	Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую граніцу. Пачатак вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь.
1939 г., 22 кастрычніка	Выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі.
1939 г., 28-30 кастрычніка	Народны сход Заходняй Беларусі.
1939 г., 29 кастрычніка	Прыняцце Народным сходам Заходняй Беларусі Дэкларацыі аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай ССР.
1939 г., 2 лістапада	Прыняцце нечарговай пятай сесіяй Вярхоўнага Савета СССР закона аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні з БССР.
1939 г., 14 лістапада	Прыняцце нечарговай II сесіяй Вярхоўнага Савета БССР закона аб уз'яднанні беларускага народа ў адзінай Беларускай дзяржаве.
1940 г., 24 сакавіка	Першыя выбары ў заходніх абласцях рэспублікі ў Вярхоўны Савет СССР, Вярхоўны Савет БССР.

1940 г., 26 чэрвеня — Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "Аб [illegible]гаходзе на 8-гадзінны рабочы дзень, на 7-дзённы рабочы тыдзень і забароне самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў".

ЗМЕСТ

17. Беларусь напярэдадні і ў час Кастрычніцкай рэвалюцыі (І.М.Ігнаценка) I-20
18. Грамадзянская вайна і замежная інтэрвенцыя на Беларусі (І.М.Ігнаценка) 21-39
19. Ва умовах новай эканамічнай палітыкі (М.П.Касцюк) ..40-57
20. Пад сцягам пабудовы сацыялізму (М.П.Касцюк) ... 58-76
21. Беларускія вайсковыя фарміраванні (1917--1941 гг.) (А.М.Літвін, Я.С.Паўлаў) 77-94
22. Заходняя Беларусь у 1921-1939 гг. Уз'яднанне беларускага народа (У.А.Падуяк).... 95-114
Храналогія (В.В.Банько)

Зак. 69 БЕСПЛАТНО. ТПР

Падпісана да друку 20.09.93г.
БЯСПЛАТНА

Аб'ём 7,75 др.л.
Зак. 25 М

Друкарня МВВКВ